WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 ЛІСТАПАДА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 234
(26842)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НЕ АДМАХВАЦЦА АД ПРАБЛЕМ ВЫБАРШЧЫКАЎ І НЕ ДАВАЦЬ ПУСТЫХ АБЯЦАННЯЎ»

Учора Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з даверанымі асобамі.

«Хацеў бы звярнуць увагу на адну ўласцівасць у нашай перадвыбарнай кампаніі: у прапагандзе, агітацыі, у нашым імкненні абараніць усё, што стварылі, не павінна быць пераборaў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мы лішні раз пачнём хваліцца перад людзьмі і залішне падкрэсліваць тое, што зроблена, для нас гэта будзе негатывам. Перабору быць не павінна ні ў чым». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў спіс яго даверaных асоб у гэтай выбарчай кампаніі ўвайшлі прадстаўнікі розных прафесій, людзі, якія ўмеюць размаўляць з народам і здольныя данесці ідэі. «Галоўнае ў тым, што вы належыце да тых людзей, якія стаяць побач з Прэзідэнтам, ажыццяўляюць курс Прэзідэнта на справе, больш таго, вы прапагандуеце гэты курс, маеце дачыненне да стварэння ўсяго таго, што ў нас сёння ёсць у краіне».

Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтыя людзі павінны гаварыць аб тым, як многа зроблена ў Беларусі за апошні перыяд і што трэба будзе зрабіць у будучым. «Вы проста абавязаны абараняць створанае, вы павінны разам са мной несці ў масы тыя задумы, якія мы будзем рэалізоўваць, прынамсі, у бліжэйшыя 5 гадоў, калі на тое будзе воля беларускага народа». Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што яго перадвыбарная праграма ўжо апублікавана, і ў ёй вызначаны прыярытэты і галоўныя мэты, якіх трэба будзе дасягнуць у будучай пяцігодцы. Пры гэтым ён акцэнтаваў увагу на тым, што дасягнення ўсяго намечанага можна дабіцца толькі неймаверпай працай.

Аляксандр Лукашэнка прапануе стварыць ідэйны партрэт альтэрнатыўных кандыдатаў у прэзідэнты, каб паказаць, што ніякай розніцы паміж імі няма. «Трэба вырысаваць, вобразна намаляваць партрэт альтэрнатыўных кандыдатаў. Людзям трэба растлумачыць, што ніякай розніцы ў іх няма. Усё, што яны гавораць, — гэта хлусня», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Я ведаю ўсю іх паднаготную. Усе яны выраслі з аднаго кораня». «Усе яны — гэта альтэрнатыва дзеючай уладзе, бел-чырвона-белыя, нацэленыя на насільную беларусізацыю, людзі выключна празаходняга вектара. І вось гэтыя ігры на расійскіх клавішах, на расійскім інструменце — гэта ўсё для таго, каб паказаць, што ў іх ёсць нейкая розніца, і максімум у гэтым плане адарваць галасоў у дзеючага Прэзідэнта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Павінен быць на гэтых дзевяць чалавек пэўны ідэйны партрэт».

Аляксандр Лукашэнка ў якасці прыкладу прывёў некалькі тэзісаў апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты. Так, у прыватнасці, адзін з іх прапануе змяніць грашова-крэдытную палітыку дзяржавы такім чынам, каб беларускі рубель адзін к аднаму прыраўнаваць да амерыканскага долара, аднак не гаворыць аб тым, якім чынам ён мае намер гэта ажыццявіць у сучасных умовах. Другі кандыдат абяцае ў выпадку сваёй перамогі бясплатна аддаць Расіі трубаправоды і беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы. «Ушчэрбнасць і слабасць кожнага з іх відавочныя, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але самае галоўнае: мы не павінны даць магчымасць падмануць людзей».

«Яны патрабавалі прамога эфіру — ім яго прадаставілі. І сёння ўжо не яны, дык бліжэйшыя памочнікі і ідэолагі адкрыта заяўляюць аб тым, што лепш бы яны не выкарыстоўвалі гэты прамы эфір. Думалі, што выйдуць вялікія аратары на экран, два словы скажуць і народ забяжыць ледзь не заўтра за іх аддаваць галасы. Аказалася, гэта не так проста», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На думку Прэзідэнта, «народ усё бачыць». «Мы павінны гаварыць пра сябе, больш аб перспектывах».

«У размове з людзьмі будзьце абсалютна чыстыя, сумленныя і шчырыя», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Не павінна быць кругавой парукі. Калі хтосьці на месцах сёння не паважае людзей, не робіць якіх-небудзь дзеянняў па вырашэнні праблем, што ляжаць на паверхні, мы павінны імгненна адмяжоўвацца ад гэтых кіраўнікоў», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Гэтых людзей абараняць нельга, яны нам не спадарожнікі», — дадаў ён, звярнуўшы ўвагу на тое, што ўлада трымаецца на даверы людзей.

«Выпрацоўваючы перадвыбарную праграму, я патрабаваў выходзіць з аднаго: каб яе прачыталі. Такая праграма атрымалася: сціслая, кампактная», — сказаў ён. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у ёй не захоплены ўсе пытанні, аднак напярадзе Усебеларускі народны сход, на якім будзе падрабязна вызначана перспектыва развіцця дзяржавы на пяцігодку, а можа, і на дзесяцігадовы перыяд. Гэта праграма павінна стаць своеасаблівым выходным пунктам для стасункаў даверaных асоб з людзьмі. «Людзі павінны бачыць у вас не толькі прыхільнікаў Прэзідэнта, але і людзей, здольных вырашыць тыя пытанні, якія яны будуць узнімаць на сустрэчах». Ён таксама дадаў, што ўсе гэтыя звароты будуць структураваны.

Прэзідэнт перасцярог даверaных асоб ад залішніх абяцанняў народу. «Мы павінны выходзіць з тых рэалій, якія ёсць. Нічога не трэба абяцаць больш таго, што абяцана ў праграме і будзе сказана на Усебеларускім народным сходзе. Нам жа трэба будзе ўсё гэта выконваць». «Ніякіх папулісцкіх лозунгаў тут быць не можа, але нам, на шчасце, гэта і не патрэбна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

УСЕ ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ ПРАЕКТЫ ПАВІННЫ РЭАЛІЗОЎВАЦЦА

Сёння ў свеце пра мадэрнізацыю, пра неабходнасць укаранення інавацыйных распрацовак вядзецца шмат размоў, шмат чаго ў гэтым напрамку і робіцца. Наша краіна таксама тут не з'яўляецца выключэннем: інавацыйны шлях развіцця для рэспублікі з кожным годам набывае ўсё большае значэнне, а ў наступнай пяцігодцы ён стане адным з важнейшых дзяржаўных прыярытэтаў. Яно і зразумела: не маючы багатых энергетычных і іншых прыродных рэсурсаў, Беларусь, каб пабудаваць моцную краіну, павінна шукаць новыя напрамкі развіцця.

Тым больш, што магчымасці для гэтага ў нас ёсць, у рэспубліцы створаны магутны вытворчы і навуковы патэнцыял. Да таго ж дзяржава, якая зацікаўленая ў тым, каб максімальна эфектыўна выкарыстоўваць гэты патэнцыял, стымулюе паспяховае развіццё інаватарства. Дастаткова згадаць, што ў цэлым у краіне сфарміравана заканадаўчая база для ажыццяўлення ўсіх стадый інавацыйнай дзейнасці, а таксама захадаў яе дзяржаўнай падтрымкі, атрымалі развіццё фінансавыя механізмы падтрымкі суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры, інавацыйнага прадпрымальніцтва. Для таго, каб рэалізоўваліся буйныя навукова-вытворчыя праекты і ўкараняліся ў галінах рэальнага сектара эканомікі, створана сістэма каардынацыі даследаванняў і распрацовак, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту.

Разам з тым, важна і тое, каб усе паспяховыя інавацыйныя ідэі, якія сёння прапануюцца беларускімі навукоўцамі, не «завісалі» ў паветры, а ператвараліся ў паспяховы інавацыйны прадукт. Праўда, нягледзячы на тое, што апошнім часам сувязь паміж навукоўцамі і вытворцамі наладжваецца, эфектыўнасць іх узаемадзеяння пакідае жадаць лепшага. На неабходнасці больш цеснага ўзаемадзеяння беларускай навукі і вытворчасці ў чарговы раз зрабіў акцэнт Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас жывой гутаркі з маладымі вучонымі на выставе навукова-тэхнічных распрацовак, што адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы ў рамках Моладзевага інавацыйнага форума.

Удзельнікамі форума сталі прадстаўнікі краіны, узрост якіх не перавышае 35 гадоў і якія ўжо маюць значныя вынікі ў прафесійнай дзейнасці, лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, стыпендыяты кіраўніка дзяржавы і ўрада краіны. Аляксандру Лукашэнка былі прадстаўлены распрацоўкі ў галіне медыцыны, машынабудавання, новых матэрыялаў і адукацыі, ІТ-тэхналогій, у ваеннай і аграрна-тэхнічнай сферах. Паводле слоў старшыні прэзідыума НАН Беларусі Міхаіла Мясніковіча, з прадстаўленых тут вучонымі Нацыянальнай акадэміі навук распрацовак 7 тэхналогій і матэрыялаў з'яўляюцца новымі ў свеце і 17 — новымі ў рэспубліцы. Наогул жа, на выставе дэманстравалася 136 экспанатаў, якія выставілі 14 устаноў і адна прыватная арганізацыя.

Напачатку Прэзідэнта азнаёмілі з інавацыйнымі праектамі ў галіне медыцыны. Напрыклад, Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі прыбор, які дазваляе дыягнаставаць ракавыя пухліны за 3-5 хвілін. Перавагай гэтай распрацоўкі з'яўляецца тое, што яна дазваляе пазбегнуць паўторнага хірургічнага ўмяшальніцтва і, акрамя высокай хуткасці дыягностыкі, дае высокую дакладнасць звестак. Праўда, пакуль вядуцца клінічныя выпрабаванні прыбора, на якія спатрэбіцца каля года. Іншы прыбор, прадстаўлены маладымі навукоўцамі, разлічаны ў прыватнасці на дапамогу пацыентам, якія прымаюць лекі: унікальная распрацоўка здольная, улічваючы індывідуальныя асаблівасці чалавека, падабраць патрэбную дозу і менавіта тыя лекі, якія больш эфектыўна дапамогуць хвораму.

Сярод мноства прадстаўленых на выставе экспанатаў беларускага лідара таксама зацікавіла оптыка-электронная сістэма бачання, якая дазваляе кіраваць аўтамабілямі, караблямі, самалётамі не толькі ноччу, але і ў тумане ці пры высокім задымленні: гэтая навінка, у прыватнасці, дае магчымасць знайсці лётчыку паласу і бяспечна пасадзіць паветранае судна на зямлю. Надзейнасць і бяспечнасць будынкаў гарантуе беларускі прыбор для кантролю трываласці бетону, які, між іншым, ужо выкарыстоўваецца на будоўлі алімпійскіх аб'ектаў у Расіі.

Пасля агляду ўсіх экспанатаў Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што некаторыя з іх не з'яўляюцца для яго новымі. Пры гэтым ён падкрэсліў, што прадстаўленыя на выставе распрацоўкі — толькі невялікі працэнт таго, што ёсць у рэспубліцы, і дадаў, «што вельмі б хацелася, каб гэта былі праекты менавіта маладых вучоных, а не збіраліся па розных установах». На думку Прэзідэнта, усе перспектыўныя праекты павінны рэалізоўвацца. «Калі гэтыя распрацоўкі эфектыўныя, перспектыўныя, асабліва калі яны накіраваныя на імпартазамяшчэнне ці экспартаарыентаваныя, яны павінны ўкараняцца на практыцы і вытворчасці ў больш сціслыя тэрміны, — сказаў ён. — Сюды трэба прывесці людзей, якія будуць гэта бачыць і запазычваць». Акрамя таго, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што вытворцы павінны больш цесна ўзаемадзейнічаць з маладымі вучонымі, а чыноўнікі — не проста хваліць таленавітую моладзь, а прымаць усе неабходныя захады для сумеснай работы інаватараў з вытворцамі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пад «страхаваныя» АЛЬПІНІСТЫ

Будаўнікі-альпіністы ўцепляюць жылы дом на мінскім праспекце Незалежнасці.

ЛАВІСЯ, РЫБКА. ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

РАНЕЙШАЯ рэдакцыя Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства была прынятая ў 2007 годзе. І фактычна адразу пачалася праца над наступнай. Нейкія пытанні паступалі ад грамадскіх арганізацый, штосьці ўдакладніць актыўна прапаноўвалі самі рыбаловы-аматары. Справа ў тым, што ў той рэдакцыі пэўныя пытанні можна было трактаваць дваяка. З мэтай удакладнення такіх момантаў і была прынятая новая рэдакцыя Правілаў, якая ўступіла ў сілу з 13 лістапада. Можна сказаць, што па сваёй сутнасці ўвогуле яны практычна не змяніліся, але разам з тым у іх найперш быў канкрэтызаваны шэраг істотных момантаў, якія датычацца, у прыватнасці, аматарскага рыбалоўства. Дапамагла нам разабрацца ў асноўных удакладненнях у Правілах начальнік упраўлення аналізу і кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага і раслiннага свету Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Тамара БОРСУК.

Браканьерам — «па руках»

Як вядома, вылаў усіх відаў рыбы забараняецца з 1 красавіка па 30 мая. За выключэннем аматарскага рыбалоўства, што вядзецца рыбаловам адной вудай з адным кручком або адным спінінгам, які мае штучную прынаду, з адным адзінарным, або двайным ці трайным кручком памерам не больш за №10 па міжнароднай класіфікацыі №1, у светлы час сутак з берага.

— Інспектары ў гэты час сутыкаліся з тым, што, калі рыба збіралася на нерасцілішчах, браканьеры стаялі і перыядычна закідвалі ў такія месцы прылады лоўлі, чапляючы пры гэтым рыбу, як пры багрэнні. І адказ быў, маўляў, я ж нічога не парушаю. Таму ў новай рэдакцыі Правілаў дадзена вызначэнне, што такое багрэнне — гэта спосаб лоўлі рыбы з выкарыстаннем кручковых прылад, пры якім лоўля вядзецца не на прынаду, а шляхам захопу ці ўтрымання рыбы кручком за любыя часткі цела, — расказала Тамара Анатольеўна. — У сувязі з гэтым уведзена і тлумачэнне, што такое багорык, які выкарыстоўваецца для падцягвання злоўленай рыбы. Гэта прыстасаванне ў выглядзе металічнага крука, памеры якога ад цаўя да вастрыні джала не павінна быць больш за 9 сантыметраў.

Існуе азначэнне слова «перамёт». Гэта шнур, замацаваны з двух бакоў на дне, і на якім больш за дзесяць кручкоў. Такога раней не было. Перамёты да аматарскага рыбалоўства забароненыя.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

Сяргей РАСОЛЬКА.

2 ТЫС. КАНТРАБАНДНЫХ ДЗВЯРЭЙ

Супрацоўнікі віцебскай мытні затрымалі відэакамеры, для назірання, 1,9 тысячы ламініраваных дзверэй, а таксама аксесуары да іх агульным коштам 100 мільёнаў рублёў. Дакументы адсутнічалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПЕРАДВЫБАРНЫЯ ПРАГРАМЫ кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

СТАР. 3

ЭЛЕКТАРАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ РАСЦЕ

Згодна з вынікамі апытання, у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь збіраюцца ўзяць удзел 92% рэспандэнтаў.

19 снежня 2010 г. адбудуцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ці збіраецеся Вы прыняць у іх удзел?

(у % ад колькасці апытаных)



Калі б заўтра адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за каго б Вы прагаласавалі?

(у % ад колькасці апытаных)



За дзейнага кіраўніка дзяржавы сёння гатовыя прагаласаваць 71,8 % рэспандэнтаў. За тыдзень гэты паказчык павялічыўся на 0,5 пункта. Не хочуць альбо ім цяжка назваць свае электаральныя перавагі 25,1 %.

ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН: УНІКАЛЬНЫ ПОЎДЗЕНЬ КРАІНЫ

Для старшыні Лельчыцкага райвыканкама Аляксандра Капыткова, які нарадзіўся ў Добрушскім раёне, Лельчыцы сталі радзімай зусім нядаўна. Аднак у біяграфіі яго сям'і была старонка, звязаная з гэтым самым паўднёвым і аддаленым раёнам Беларусі. Яго дзеда лёс закінуў у Лельчыцкі раён у 50-я гады, і 7 гадоў ён працаваў тут настаўнікам школы ў вёсцы Рубеж. Выпадковасцяў у жыцці не бывае, лічыць Аляксандр Васільевіч:

Старшыня Лельчыцкага райвыканкама Аляксандр КАПЫТКОЎ.

— У 50-я гады тут была сапраўдная глуш. Што казаць, калі электрычнасць сюды правялі толькі ў сярэдзіне 60-х! А малая радзіма ў мяне тая ж, што і ў Івана Шамякіна — вёска Карма Добрушскага раёна. Мая бабуля памятала Іаана Кармянскага, які цяпер праслаўлены сярод святых і нават звярталася да яго за парадай. Усе мае продкі хадзілі ў царкву, дзе цяпер знаходзяцца яго мошчы — Свята-Пакроўскую. Нас было пяць дзяцей у сям'і. Я — трэці, сярэдні. Спачатку закончыў гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, але ж усё дзяцінства, памятаю, праездзіў разам з бацькам — вучоным-аграномам па палях. Ён 15 гадоў працаваў кіраўніком гаспадаркі імя Калініна — вядучай у раёне. Таму невыпадкова, што я паступіў завочна ў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. У сваім Добрушскім раёне я адпрацаваў 19 гадоў. Спачатку — старшынёй прафкама ў гаспадарцы, потым — інструктарам райкама партыі, сакратаром парткома, а калі партыя развалілася — пайшоў галоўным заатэхнікам у калгас імя Леніна. Праз 7 гадоў стаў кіраўніком суседняй гаспадаркі — калгаса імя Фрунзэ. Потым узначальваў плямзавод «Бярозкі» пад Гомелем. Быў намеснікам старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама. Курыраваў жывёлагадоўлю. І вось паўтары гады таму ўзначаліў Лельчыцкі райвыканкам.

Дададзім, што ёсць у Аляксандра Васільевіча Капыткова яшчэ адзін талент. Калісьці ў маладосці ўзяў у рукі гітару, навучыўся граць на ёй, і голасам Бог не абдзяліў. Таму зусім нядаўна атрымаў ён дыплом першай ступені за ўдзел у абласным конкурсе мастацкай самадзейнасці сярод кіруючых кадраў Гомельшчыны. Тры дачкі выгадаваў, самая малодшая — студэнтка, вучыцца ў Мінску на псіхолага.

ПАСЁЛАК РАСЦЕ, ЯК ГРЫБЫ Ў ДОЖДЖ

Асноўны клопат сёння — падняць дабрабыт жыхароў аднаго з самых вялікіх па плошчы раёнаў Беларусі, які, аднак, традыцыйна лічыўся ледзь не самым далёкім, забытым і забітым. Такую думку адразу ж абвяргае знешні выгляд райцэнтра. Дарэчы, тут жыве цяпер 10,5 тысячы чалавек. Насельніцтва раёна ўвогуле складае 27 тысяч чалавек. Райцэнтр будуецца на вачах — вядзецца і шматпавярховае будаўніцтва, і індывідуальнае:

— У нас магутныя будаўнічыя арганізацыі — ПМК-103 і ЗАТ «Альянс», — адзначае Аляксандр Васільевіч. — У гэтай галіне працуе каля 800 чалавек. Яны будуюць многа жылля, і тыя планы, якія нам ставяць, мы выконваем. За пяцігодку ў раёне ў эксплуатацыю ўведзена 68 тысяч 400 кв.м агульнай плошчы жылых дамоў, у тым ліку на вёсцы — 24,4 тысячы кв. м. Гэта дазволіла палепшыць жыллёвыя ўмовы 818 сем'ям, з іх 270 — на сяле. Распрацаваны генеральны план індывідуальнай жылой забудовы. Толькі цяпер 450 чалавек займаецца індывідуальнай забудовай у саміх Лельчыцах. У Лельчыцкім раёне ажыццяўляецца, як і паўсюдна, праграма будаўніцтва аграгарадкоў. Сёлета 5 аграгарадкоў уводзім, зараз займаемся і рамонтам памяшканняў сацыяльнага прызначэння. На наступны год мы плануем увесці яшчэ 2 аграгарадкі. Хаця ў раёне застаецца актуальнай праблема стварэння працоўных месцаў і працаўладкавання насельніцтва. Менавіта таму зараз мы актыўна шукаем інвестараў, ствараем рабочыя месцы на новых прадпрыемствах. Нядаўна пачалі ажыццяўляць інвестыцыйны праект сумеснага прадпрыемства «Дрэўка» з удзелам швейцарскага капітала. Фірма будзе займацца дрэваапрацоўкай і вытворчасцю пелетаў. Лясы займаюць больш за палову плошчы раёна — 215 тыс. га. Што важна — лес тут спелы, прыгодны для вытворчасці. Па колькасці менавіта такога лесу наш раён у Гомельскай вобласці займае вядучае месца. На тэрыторыі раёна пастаянна ажыццяўляецца работа па ўдасканаленні ландшафтна-рэкрэацыйных тэрыторый, добраўпарадкаванне зон адпачынку.

СТАР. 5, 8

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 31 декабря 2010 года

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже принадлежащего ОАО «Крион» (продавец) здания специализированного животноводства (здание коровника) с инв. номером 620/С-24926, общей площадью 1847,1 кв. м, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Дзержинский р-н, Негорельский п/с, около дер. Павловщина. Площадь земельного участка 0,9550 га, инв. номер 622200000001000887.

Начальная цена – 103 517 500 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 10 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за объект продажи. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта продажи осуществляется в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **31 декабря 2010 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 01.12.2010 по 30.12.2010** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);
(017) 275 22 81 – ОАО «Крион» (ул. Серова, 8, 220024, г. Минск).

З ГРАНАТАЙ У ЛАЗНЮ

27 лістапада ў лазні № 1 па праспекце Пушкіна ў Магілёве 27-гадовы мужчына прадэманстраваў наведвальнікам і персаналу вучэбную гранату Ф-1, чым груба парушыў нармальную дзейнасць лазні. Міліцыя затрымала мужчыну, які не працуе і раней не быў асуджаны. Супраць яго распачалі крымінальную справу за хуліганства.

Алена КАЗЛОВА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.11.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	3 032,00	1 чэшская крона	162,53	USD	31,3061
▼ 1 еўра	4 027,71	1 польскі злоты	999,93	10 UAH	39,2799
1 латвійскі лат	5 665,70	▼ 1 расійскі рубель	96,85	1000 BYR	10,3252
1 літоўскі літ	1 164,38	1 украінская грыўня	380,43	EUR	41,5682

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» сообщает о проведении 12 января 2010 года 2-го тиража выигрышей по срочным банковским вкладам в белорусских рублях «Шанс»

Перечень наименований моделей товаров, разыгрываемых во 2-м тираже выигрышей:
- печь СВЧ «Мидеа» AG 925-EFT, изготовитель СП «Мидеа – Горизонт»;
- стиральная машина СМА 45-У-82, изготовитель ЗАО «Атлант»;
- холодильник МХМ 6024-031, изготовитель ЗАО «Атлант»;
- телевизор 42 LCD 825, изготовитель ОАО «Горизонт».

Проценты, выплаченные по различным видам вкладов, депозитов в течение 2009 г., млн. бел. руб.

январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2009 год
65380,5	84821,5	99934,1	97189,8	74575,8	104240,6	87728,7	89863,7	93977,5	82045,6	103608,1	183630,6	1166996,5

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на информационных стендах в подразделениях банка и на сайте www.belarusbank.by. Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Мінчан на 1 лістапада — 1 млн 858,1 тыс.

На 1 студзеня было 1 млн 843,7 тыс. чалавек. За студзень—кастрычнік гэтага года ў Мінску нарадзілася 17 621 дзіця. Памерла гараджан за гэты перыяд 15 158.

Віктар КУШНАРОЎ, *«Мінск—Навіны».*

дзік напаў на пенсіянера ва ўласным агародзе

28 лістапада ў Чавускую цэнтральную раённую бальніцу брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі дастаўлены з вёскі Сутокі 77-гадовы пенсіянер. Яго шпіталізавалі з рванай ранай грудзіны і паламанымі рэбрамі. Мужчына патлумачыў, што а 12-й гадзіне ўдзень ва ўласным агародзе яго параніў дзік.

Алена КАЗЛОВА.

Мядку захацелася

Пенсіянерка, што жыве ў сваім доме па вуліцы Цаглянай у Брэсце, звярнулася ў міліцыю з заявай пра крадзеж 24 сотаў з вулляў. Злодзеяў знайшлі. Іх двое, абаім за 30 гадоў, яны не працуюць, але, як відаць, не супраць жыццё падсаладзіць — праўда, чужым мядком.

Яна СВЕТАВА.

Камунальныя плацяжы пасля Новага года ў Беларусі істотна не зменяцца

Камунальныя плацяжы для насельніцтва пасля Новага года ў Беларусі істотна не зменяцца. Аб гэтым 26 лістапада, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў працоўнага калектыву ААТ «Івацэвічдрэў», заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, перадае БЕЛТА.

«Пазіцыя кіраўніцтва нашай дзяржавы ў тым, што мы не павінны ісці па шляху шокавай тэрапіі — Прэзідэнт гэты метад не прымае. Што датычыцца камунальных паслуг, якія аплачваюцца насельніцтвам, іх кошт павінен расці суразмерна даходам грамадзян», — адзначыў прэм'ер-міністр.

У сувязі з гэтым Сяргей Сідорскі паведаміў, што ў бюджэце 2011 года, як і ў гэтым годзе, закладзены кампенсацыйны механізм у пытанне, якое датычыцца аплаты камунальных паслуг насельніцтвам. Пры гэтым некаторыя новаўвядзенні прадугледжаны: датычацца яны высокаплатных слаёў насельніцтва. Як раней паведамлялася, уладальнікі элітнага жылля будуць аплачваць камунальныя паслугі па стаўцы, максімальна набліжанай да 100-працэнтнага кошту рэсурсаў. Цяпер схема аплаты камунальных паслуг гэтай катэгорыі грамадзян знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. У той жа час прадугледжаны механізм па падтрымцы маламаёмных слаёў насельніцтва праз дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу. На наступны год выпрацаваны планы сацыяльна-эканамічнага развіцця бюджэту, якімі не прадугледжваецца рэзкага павышэння камунальных паслуг, рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў гімназію-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі з 75-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі з 75-годдзем навучальнай установы.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гімназія-каледж выхавала многіх праслаўленых беларускіх выканаўцаў і кампазітараў. Шматлікія перамогі навучэнцаў і выпускнікоў гімназіі-каледжа ў прэстыжных конкурсах сведчаць аб гэтым і садзейнічаюць павышэнню міжнароднага аўтарытэту дзяржавы.

«Няхай і далей ваша штодзённая творчая работа па пошуку талентаў і раскрыццю іх здольнасцяў выклікае шчырую павагу і ўдзячнасць», — пажадаў Прэзідэнт калектыву навучальнай установы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Да Усебеларускага сходу

«МЫ НЕ СТАЯЛІ НА МЕСЦЫ»

Больш за 300 прапаноў для сацыяльнай сферы вылучылі ў Магілёўскай вобласці пры абмеркаванні праграмы развіцця на наступную пяцігодку

27 лістапада ў Магілёве адбыўся абласны сход дэлегатаў IV Усебеларускага народнага сходу. Ад Магілёўскай вобласці ва Усебеларускім сходзе будуць браць удзел 350 дэлегатаў. Усе яны, у залежнасці ад сферы дзейнасці, падзяліліся ў мінулую суботу на секцыі, і ў кожнай з іх удзельнікі абмеркавалі праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця, падвялі вынікі за мінулыя гады і вылучылі свае прапановы на будучае.

Дэлегаты, якія прадстаўлялі сацыяльную сферу і грамадскія арганізацыі, прыйшлі па высновы, што адбылося павышэнне якасці жыцця людзей. Гэтаму ёсць канкрэтныя доказы: напрыклад, больш чым на год павялічылася ў сярэднім працягласць жыцця людзей, дзіцячая смяротнасць панізілася да ўзроўню еўрапейскай, павялічылася нараджальнасць. На гэта перш за ўсё звярнулі ўвагу медыкі.

Загадчык рэанімацыйна-анестэзіялагічнага аддзялення Магілёўскай абласной бальніцы Аляксей МАРАЧКАЎ адзначыў, што ў беларускай медыцыне цяпер ужываюцца самыя сучасныя тэхналогіі і апараты, дзе патрабуецца значная колькасць якасных расходных матэрыялаў. Звычайна яны каштуюць немалых грошай і закупляюцца ў замежжы за валюту. Таму магілёўскі медык прапанаваў **супрацоўнічаць прадпрыемствам і навуковым установам у сферы вытворчасці расходных матэрыялаў для сферы аховы здароўя**. Такое імпартазамяшчэнне, паводле слоў Аляксея Марачкава, дазволіць паменшыць выдаткі на медыцыну, дасць штуршок для развіцця айчыннай медыцынскай прамысловасці, створыць новыя працоўныя месцы для людзей.

У абмеркаванні выступоўцы адзначылі поспехі ў дзяржаўнай маладзёжнай палітыцы: больш за 8 тысяч маладых жыхароў Магілёўскай вобласці скарысталіся правам на атрыманне льготнага крэдыту для пабудовы жылля, а ўвогуле маладыя сем'і рэгіёна атрымалі ад дзяржавы фінансавую дапамогу на суму больш за 5 мільярдаў рублёў. Адна з праблем, на якую маладыя людзі прапануюць сёння звярнуць увагу, — гэта **арганізацыя працаўладкавання студэнтаў і навучэнцаў у вольны час**. Моладзь хоча зарабіць грошы ды прайсці школу жыцця ў працоўных калектывах.

Загадчык кафедры педагогікі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова і старшыня жаночага савета гэтай навучальнай установы Таццяна Старавойтава першым разам паедзе на Усебеларускі сход.

— Я вельмі хвалююся, гэта вялікая адказнасць, — шчыра сказала Таццяна Аляксееўна. — Таму што на сходзе давядзецца абмяркоўваць важныя пытанні, якія датычацца сістэмы адукацыі, маладзёжнай палітыкі, станаўлення сям'і.

Таццяна Старавойтава сказала з трыбуны абласнога сходу, што яна вельмі хоча, каб яе студэнты не проста атрымлівалі добрую педагагічную адукацыю, але каб яны яшчэ і **мелі матывацыю працаваць, вучыць дзяцей**.

— Настаўнік — гэта ад Бога, а ўсе астатнія прафесіі — ад настаўніка. Так няхай ідуць у школу пісьменныя настаўнікі, якія любяць дзяцей!

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА другім разам будзе браць удзел ва Усебеларускім сходзе.

— Мы ганарымся поспехамі, якіх дасягнулі за гэты час, — сказаў ён. — Мы не стаялі на месцы ні ў адной сферы. Працавала эканоміка, нягледзячы на ўсе цяжкасці на нашым шляху. І жыццё паказала, што праграмныя дакументы, якія былі прыняты на III Усебеларускім народным сходзе, былі вывераны дакладна, і мы дасягнулі пастаўленых паказчыкаў. Гэта дае ўпэўненасць, што новая максімальная планка ў праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, якую мы будзем прымаць на IV сходзе, будзе дасягнутая ў эканоміцы, і на гэтым трывалым базісе будзе пабудавана сацыяльная палітыка дзяржавы.

Валерый Малашка выступіў вядучым у секцыі, якая абмяркоўвала праблемы ў сацыяльнай сферы. Абмеркаванне пачалося ў працоўных калектывах і працягнулася ў канферэнц-зале Магілёўскага аблвыканкама. «Мы сёння акумулюем і сістэматызуем усе прапановы, і цяпер іх у нашым агульным спісе ўжо больш за 300», — паведаміў куратар сацыяльнай сферы вобласці.

— Я хачу пажадаць дэлегатам, каб усю палітру эмоцый і тую масу інфармацыі, якія яны атрымаюць на Усебеларускім сходзе, данесці ў свае рэгіёны і працоўныя калектывы, — сказаў Валерый Малашка. — Для таго, каб заразіць людзей аптымізмам і ўпэўненасцю. У гэтым залог нашых поспехаў, далейшых эканамічных перамог.

У пяцігодцы, якая цяпер завяршаецца, паводле папярэдніх звестак, тэмп росту прамысловасці ў Магілёўскай вобласці складзе больш за 180 %. У наступнай пяцігодцы асаблівую ўвагу абласныя ўлады будуць надаваць развіццю інавацыйных вытворчасцяў, выкарыстанню навукаёмістых тэхналогій. У прыватнасці, падрыхтаваны 32 інавацыйныя праекты з агульным аб'ёмам фінансавання больш за 800 мільярдаў рублёў.

Ілона ІВАНОВА.

Калектыў Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта глыбока смуткуе з прычыны смерці майстра вучэбнай лабараторыі фотажурналістыкі ВЦКТ КАХАЎЦА Сяргея Фёдаравіча і выказвае шчырыя спачуванні яго блізкім і родным.

10 декабря 2010 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Универсам «Северный».

Повестка дня:
1. О перевыборах членов совета директоров Общества.
2. О реорганизации Общества.
3. О материальном вознаграждении членов совета директоров Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3.
Начало регистрации участников собрания: 10.30.

УНП 100356386

ТРОХМЕРНАЯ ВЫЯВА

Мінская дэлегацыя IV Усебеларускага народнага сходу праектуе будучыню сталіцы ў каардынатах — інавацыі, інвестыцыі, экспарт

Выбітным дзеячам сталічнай вытворчасці, навукі, культуры, аховы здароўя ды камерцыі ёсць на чым грунтаваць напалеонаўскія планы. Галоўныя задачы папярэдняй пяцігодкі, пагаджаюцца дэлегаты са стажам, выкананыя. Сталіца задае тон у жыллёвым будаўніцтве, развіцці транспартнай інфраструктуры, папаўненні бюджэту прыбыткамі ад прадпрымальніцтва. Адсюль і сярэднямесячны заробак мінчаніна ў 550 доларaў, і ўведзеныя 5,5 млн квадратных метраў жылля, і забяспечанасць асабістым транспартам у 300 аўто на тысячу гараджан. Карацей, якасць жыцця ў сталіцы за мінулыя паўдзясятка гадоў істотна павысілася. Але хто сказаў, што гэта мяжа? Асноватворная роля ў імкненні да новых вышынь адводзіцца інавацыям, інвестыцыям і экспарту.

Эканоміка Мінска па сваёй структуры, маштабах вытворчасці з'яўляецца экспартаарыентаванай. Таму так востра паўстае нявырашаная праблема адмоўнага сальда ў знешнім гандлі. **Сталічны граданачальнік Мікалай ЛАДУЦЬКА** акцэнтуе негатыўны ўплыў двух фактараў — леташняга падзення беларускага экспарту і росту цэн на энерганосьбіты, якія імпартуюцца.

— Мы не ўвайшлі ў той калідор, які быў абазначаны Мінску ўрадам. Гэта наша сур'ёзная недапрацоўка, якая абвастрылася ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, — прызнае мэр.

Тым большае імкненне выправіць сітуацыю ў перспектыве. Распрацаваная праграма прадугледжвае да 2015 года павелічэнне экспарту тавараў утрая, паслуг — у пяць разоў (да ўзроўню 2010 года).

— Праграма адбылася з двух бакоў — улады і прадпрыемстваў, — падкрэслівае старшыня Мінгарвыканкама. — Яна адкрытая для выканання і закрытая для невыканання. Гэта варта зразумець і выконваць.

Нарошчванню экспарту, на думку мэра, спрыяе выгаднае геаграфічнае становішча горада. Вырашыць праблему знешнегандлёвага сальда дапаможа таксама і павышэнне рэнтабельнасці экспартных паставак, забеспячэнне належнага ўзроўню сэрвісу пасля продажу. Натуральна, варта і скарачаць імпарт. У цэлым рэалізацыя праграмы развіцця знешнеэканамічнай дзейнасці сталічных арганізацый «закліканая забяспечыць станоўчае знешнегандлёвае сальда ў памеры 500 млн доларaў ЗША па выніках будучай пяцігодкі, рэзюмуе М. Ладуцька.

Пераход эканомікі на інавацыйныя рэйкі ўяўляецца магчымым праз фарміраванне новай свядомасці, у аснове якой — тэхналагічны прагрэс, якім, на думку мэра, павінен прасякнуцца кожны жыхар горада. Менавіта тут сканцэнтраваная айчынная навука, і яна павінна мець, як падкрэслівае кіраўнік сталіцы, максімальна прыкладны характар. У горадзе разгортваецца рэалізацыя 196 інавацыйных праектаў, большасць з якіх уяўляюць сабой абсалютна новыя вытворчасці.

Сталічнае кіраўніцтва мае найжывейшую зацікаўленасць у паляпшэнні ўмоў для вядзення бізнэсу. Унёсак прыватнікаў у фарміраванне валавога рэгіянальнага прадукту мае быць павялічаны з 17 адсоткаў сёлета да 30 адсоткаў у канцы наступнай пяцігодкі. Сталіца ўжо цяпер налічвае каля 30 структур падтрымкі прадпрымальніцтва накшталт бізнэс-інкубатараў. А цяпер спецыялісты гарвыканкама занятыя стварэннем рэгіянальнага тэхнапарку, які, натуральна, стане месцам канцэнтрацыі самых высокатэхналагічных, інавацыйных вытворчасцяў. Чакаецца, што ён прыме першых рэзідэнтаў ужо да канца 2012 года. А яго адкрыццё забяспечыць, паводле папярэдніх разлікаў, больш як дзве тысячы новых працоўных месцаў. Кіраўніцтва Мінска надае вялікую ўвагу працы з кіраарганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі — мікракрэдытаванню па спрошчанай схеме. Гэты інструмент перакананы ў гарвыканкаме, павінен павялічваць сваю гібкасць і эфектыўнасць. Выдаткі на такія мэты налета плануецца павялічыць амаль удвая — да 40 млрд рублёў.

Асаблівая ўвага — жыллёваму будаўніцтву. За наступныя пяць гадоў для мінчан плануецца ўвесці больш як 7 млн квадратных метраў жылля. З поўным наборам сацыяльна гарантаваных аб'ектаў, неабходных для камфортнага пражывання, акцэнтуе старшыня Мінгарвыканкама. Істотную лепту ў вырашэнне кватэрнага пытання зробяць гарады-спадарожнікі: Дзяржынск, Заслаўе, Лагойск і Смалявічы. Так што, жыллёвае будаўніцтва зробіць прыкметны крок за МКАД.

Пранікнуцца пяцігадовымі планамі рэспубліканскага маштабу 400 сотням дэлегатаў ад Мінска дапамог **міністр эканомікі Мікалай СНАПКОЎ**. Ён назваў Усебеларускі народны сход адной з найважнейшых формаў народаўладдзя, якая арганічна ўпісалася ў айчынную палітычную сістэму. Форум прадугледжвае прынцыповы ўлік народнага меркавання і мэтанакіраваную работу па рэалізацыі пажаданняў людзей. Вынікі папярэдніх трох, на яго думку, вызначылі асноўныя кірункі і мэты сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. 1996—2000 гады ён ахарактарызаваў як час стабілізацыі і аднаўленчага росту, другі перыяд — пераход да ўстойлівага росту, наступны — інтэграцыі ў сусветную эканамічную прастору, інавацыйнага развіцця і павышэння дабрабыту.

— Сёння Беларусь — стабільная ва ўсіх адносінах маладая дзяржава, якая дынамічна развіваецца, — перакананы міністр эканомікі.

Айчынная палітыка ў галіне забеспячэння асноўных сацыяльна-эканамічных гарантый, паводле яго слоў, адпавядае самым высокім міжнародным стандартам. Удзельная вага сацыяльных выдаткаў у структуры ВУП — на лідзіруючых пазіцыях у свеце. Кіраўнік ведамства адзначыў пастаянную работу дзяржавы над паляпшэннем дзелавога клімату. Нездарма міжнародныя эксперты прылічаюць Беларусь да адных з самых актыўных краін-рэфарматараў у галіне ўмоў для вядзення бізнэсу. Усё больш спрыяльным становіцца інвестыцыйны клімат у Беларусі. Толькі за 10 месяцаў гэтага года ўтворана 518 арганізацый з замежнымі інвестыцыямі.

— У новую пяцігодку мы ўваходзім з дастатковым эканамічным задзелам, — робіць лагічную выснову міністр.

Аднак гэта не дае падстаў меркаваць пра ўласную ідэальнасць. Некаторыя заганы ўсё яшчэ адчувальныя. Сярод іх М.Снапкоў назваў недастатковую эфектыўнасць інвестыцый, нізкую інавацыйнасць, высокую імпарта- і матэрыялаёмістасць, а таксама энергазалежнасць. Ён паспяшаўся супакоіць удзельнікаў Мінскага гарадскога сходу, што ўсе гэтыя нюансы носяць структурны характар, і ёсць не толькі шляхі для іх вырашэння, але і неабходныя рэзервы.

Як адзначыў міністр, у аснову праграмы, што стане прадметам абмеркавання на IV Усебеларускім народным сходзе, леглі прыярытэты, агучаныя кіраўніком дзяржавы ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Зарыентаваныя яны ў першую чаргу на рост дабрабыту і паляпшэнне ўмоў жыццядзейнасці грамадзян. Лагічная пабудова разлікаў (а кожная лічба ў праграме, запэўніў міністр, мае эканамічнае і матэматычнае абгрунтаванне) прадугледжвае ўзаемаўзгадненне трох асноўных прыярытэтаў.

Па-першае, развіццё чалавека і яго патэнцыялу. Як фактар матывацыі — давядзенне заробкаў беларусаў да ўзроўню не менш 80 адсоткаў сярэдняга заробку ў еўрапейскіх дзяржавах. Па-другое, разняволенне прадпрымальніцкай ініцыятывы як асноўнага каталізатара эканомікі. Добрай падмогай стануць Дырэктыва №4 і закон аб прыватна-дзяржаўным партнёрстве. У дзяржсектары, як акцэнтаваў кіраўнік ведамства, варта адмовіцца ад колькасных мэтавых паказчыкаў і засяродзіцца на забеспячэнні якаснага росту. Па-трэцяе, інавацыйнае развіццё і структурная перабудова эканомікі, поруч з эфектыўнай інвестыцыйнай палітыкай. Сярод ключавых кірункаў таксама рост экспарту тавараў і паслуг, устойлівае развіццё рэгіёнаў, якаснае і даступнае жыллё, эфектыўны АПК.

Глабальныя арыенціры могуць быць дасягнутыя толькі пры выкананні лакальнага —павышэння адказнасці кожнага на сваім працоўным месцы. Толькі так мы разам зможам дасягнуць запланаванага эканамічнага росту. А ўдзельнікі ўсенароднага форуму, што непасрэдна ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржавай, адказныя ўдвая. Як складальнікі планаў і як выканаўцы — мандат іх дзейнічае на працягу ўсіх пяці гадоў рэалізацыі пастаўленых задач. І мінскім дэлегатам, несумненна, ёсць што прапанаваць суайчыннікам з іншых рэгіёнаў.

Зоя ВАРАНЦОВА.

ЗА ВЫЙГРЫШ ФУТБАЛІСТ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЗБОРНАЙ ЗАРАБЛЯЕ З ТЫСЯЧЫ ЕЎРА

Генадзь Нявыглас падвёў вынікі сезона і расказаў, чаму звычайна гулец атрымлівае толькі палову гэтай сумы

Сёлетні футбольны сезон амаль завершаны: у чэмпіянаце вызначыліся прызёры і аўтсайдары, нацыянальная зборная пасля нядаўняга таварыскага матча з Аманам знаходзіцца на зімовых канікулах. І толькі ў БАТЭ засталося два матчы ў Лізе Еўропы — з кіеўскім «Дынама» і галандскім АЗ. Старшыня федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас падвёў вынікі сезона на сустрэчы з журналістамі, яму дапамагаў галоўны трэнер нацыянальнай каманды Бернд Штанге.

— У мяне часта пытаюць, як я ацаню самы паспяховы сезон? Але я веру, што гэта не адзінкавы поспех, а станоўчыя тэндэнцыі развіцця нашага футбола. У нас кожны сезон атрымліваецца крыху лепшым, чым папярэдні. Паспяховыя выступленні каманд дазваляюць мне меркаваць, што мы на правільным шляху. Наша зборная па міні-футболе сёлета ўпершыню ўдзельнічала ў чэмпіянаце Еўропы — прыемна, што гэтая вяршыня скарылася. Паспяховым можна лічыць і выступленне нашай жаночай каманды — мы там зрабілі стаўку на спецыяліста, запрошанага з БАТЭ, і не памыліліся. Нельга не адзначыць паспяховае выступленне клубных каманд на еўратурнірах — адразу тры з іх дасягнулі стадыі плэй-оф, чаго раней ніколі не было. Ёсць такое паняцце, «як індэкс развіцця клубнага футбола». Сёлета мы займаем па ім першае месца ў Еўропе. Поспех, які стаіць асобна, — выступленне моладзевай зборнай. Трэці раз наша каманда прабіваецца ў фінальную частку, і нават нядобразычліўцы не змогуць пярэчыць, што гэта тэндэнцыя. І, напрыканцы, выступленне нацыянальнай зборнай. Яна нарэшце набыла баяздольны выгляд, гэтая каманда, якая гуляе. Асобна стаіць перамога над зборнай Францыі. Каманда выканала заданне на сезон упершыню за тыя восем гадоў, якія я ў футболе, у яе актыве 8 ачкоў, — рэзюмаваў Генадзь Нявыглас.

Калі задача выкананая, можна і ўзнагародзіць гульцоў. Кіраўнік федэрацыі агучыў прэміяльныя, якія атрымліваюць футбалісты зборных.

— Сістэма прэміравання на працягу сезона не карэктуецца, яна выконваецца, калі каманда дасягае пастаўленай мэты. Гульцы атрымліваюць прэміяльныя за выклік у каманду, а таксама за выйгрыш і за нічыю. Стаўка ў нас фіксаваная, і такая практыка існуе з 2002 года. Калі ж задача на год не выкананая, гульцы атрымліваюць толькі 50 працэнтаў прэмій. Сёлета ў абедзвюх зборных выплаты былі ў поўным аб'ёме. Гэта па сто тысяч еўра на моладзевую і нацыянальную каманды. За выйгрыш гулец нацыянальнай каманды атрымлівае 3 тысячы еўра. Праўда спачатку мы выплачваем 1,5 тысячы, а пры выкананні задачы камандай — яшчэ столькі ж. Сёлета рашэнне бюро федэрацыі скарэктавала лічбу для моладзевай каманды. Яны атрымалі не 100, а 120 тысяч еўра — асобным бонусам быў заключны матч з Італіяй.

Разам з развіццём футбола развіваюцца і балельшчыцкія рухі. Праўда, сёлетні сезон адзначаны некалькімі інцыдэнтамі з фанатамі. Банер з «фашыстам №3» Рудольфам Гесам быў вывешаны ў дынамаўскім сектары на хатнім матчы з «Віцебскам», за што клуб быў пакараны беспрэцэдэнтным штрафам у 7000 базавых велічынь (82 тысячы долараў) — праўда, пасля сума была зменшаная. Мінская міліцыя пасля гэтага настолькі ўзмацніла ахову стадыёнаў падчас спаборніцтваў (ахова фактычна ператварылася ў барацьбу з фанатамі), што балельшчыкі заклікалі байкатаваць матчы. Пасля гэтага федэрацыя правяла нараду з міліцыяй і лідарамі фан-рухаў, і працэдура праходу на стадыён стала больш простай. Якой яна будзе ў наступным сезоне, расказаў Генадзь Нявыглас:

— Найбольш нараканняў ад балельшчыкаў мы атрымалі пасля матча зборнай з Румыніяй. Пасля гэтага мы правялі нараду з міліцыяй грамадскай бяспекі, дзе прынялі шэраг рашэнняў, у прыватнасці, каб на сектарах не было АМАПа. Праваахоўнікі свае абяцанні выканалі, і пасля наступнага матча з Албаніяй ніякіх нараканняў мы не атрымалі. Прыменены нестандартныя падыходы, агляд ажыццяўляла шмат дзяўчат у форме. Але самае галоўнае, пра што мы дамовіліся з міліцыяй, — не бачыць у кожным балельшчыку патэнцыяльнага правапарушальніка. Шчыра прызнаюся, што нам не ўдалося дасягнуць мэты, каб клубы максімальна працавалі са сваімі балельшчыкамі. Але казаць, што стадыёны пусцеюць толькі з-за дзеянняў міліцыі, — не зусім правільна. Наступная пяцігодка будзе скіравана на працу па паляпшэнні ўмоў для балельшчыкаў. У куткім часе мы прапануем ураду пакет дакументаў для паляпшэння ўмоў на стадыёнах.

Старшыня Федэрацыі футбола паведаміў таксама, што для матчаў нацыянальнай каманды плануецца пабудаваць новы стадыён у сталічным мікраёне Шчомысліца. Праўда, пакуль гэты праект не зацверджаны. Але там удасца ўвасобіць усе сучасныя патрабаванні да матчаў самага высокага ўзроўню. Прынята рашэнне і аб рэканструкцыі стадыёна «Дынама», і падчас яе, калі новы стадыён у Мінску яшчэ не пабудуюць, цалкам верагодна, што матчы зборнай будуць праходзіць на новым стадыёне ў Барысаве. Наступны ж сезон зборнай пройдзе на «Дынама». І пачнецца ён для сталічнай арэны яшчэ ў лютым — БАТЭ распачне там вясновую стадыю Лігі Еўропы. Генадзь Нявыглас паабяцаў, што стадыён будзе гатовы:

— Да лютага яшчэ ёсць час. Больш турбуе матч, які мы павінны правесці ў чацвер з кіеўскім «Дынама». І павінен сказаць, што па стане на нядзелю на «Дынама» добры газон, там працуе падагрэў, тэмпература глебы — плюс 18 градусаў. Спадзяюся, не падвядзе і надвор'е. Матчы не рэкамендуецца праводзіць пры тэмпературы паветра ніжэй за -15 градусаў. Праўда, сіноптыкі абяцаюць менавіта мінус 15... У лютым мы таксама ў баку не застанёмся. У гісторыі быў выпадак, калі газон на «Дынама» сушылі верталётам. Але зараз ёсць шмат сучасных спосабаў падрыхтоўкі. Калі будзе патрэбна, параіліся з УЕФА.

Бернд Штанге расказаў пра перспектывы нашых лідараў у галоўнай камандзе:

— У мяне няма настрою абмяркоўваць Аляксандра Глеба. Нацыянальная зборная ў парадку, і, калі Глеб выйдзе на свой узровень, мы будзем рады яго бачыць. Сяргей Карніленка — адзін з нешматлікіх нашых нападаючых, грэбаваць якім я не магу. Аднак я не выключаю яго ў апошніх матчах у выхаваўчых мэтах. Ён не забівае за зборную, але атрымлівае карткі. У Люксембургу яго чырвоная картка мне ўвогуле незразумелая. Аляксандр Кульчы — вельмі важны для нас гулец. Летась ён стаў лепшым футбалістам года. Але яму 37, і з ім у нас існуе дамова, што ўсё будзе залежаць ад яго гульні. Колькі ён будзе ў форме, столькі і будзе гуляць. Мы шукаем яму альтэрнатыву, але пакуль безвынікова.

Самым важным для нацыянальнай каманды ў гэтым сезоне Бернд Штанге назваў, безумоўна, матч з Францыяй, у якім беларусы перамаглі трохкаляровых на іх полі:

— Гэта іх першы матч пасля няўдалага чэмпіянату свету. Яны вельмі хацелі рэабілітавацца, і, на мой погляд, гэты матч яны яшчэ доўга будуць памятаць. А самае вялікае маё расчараванне, большае нават, чым пасля паражэння ад Люксембурга, — нічыя з Румыніяй. Гэта быў наш хатні матч, мы павінны былі перамагаць.

Генадзь Нявыглас паведаміў, што да 2013 года наша нацыянальнае першынство пяройдзе на сістэму «восень—вясна» — менавіта да гэтага часу ўсе абласныя цэнтры будуць мець футбольныя манежы. Бернд Штанге сістэму з 12 камандамі назваў удалай:

— Гэта добрая сістэма, і з ёй беларускія клубы дасягаюць поспехаў на міжнароднай арэне. Ёсць, безумоўна, праблемы, бо БАТЭ праводзіць каля 60 матчаў за сезон, што параўнальна з чэмпіянатам Германіі, Англіі. Але там гэтыя гульні расцягнутыя на 10 месяцаў, а ў нас праходзяць за восем. Але мы павінны ўлічваць інтарэсы не толькі БАТЭ, але і астатніх клубаў.

Генадзь Нявыглас паведаміў, што ў Кубку Садружнасці сёлета хутчэй за ўсё выступіць салігорскі «Шахцёр», нягледзячы на тое, што статус турніру з году ў год падае. А Суперкубак кіраўнік федэрацыі аддаў бы БАТЭ, які з'яўляецца ўладальнікам і Кубка Беларусі, і чэмпіёнам — праўда, пакуль канчатковае рашэнне не прынята. Што датычыцца бліжэйшых планаў нацыянальнай зборнай, то таварыскі матч 9 лютага яна правядзе ў турэцкай Анталі супраць каманды Казахстана. За дзень да гэтага наша моладзевая дружына сустрэнецца са зборнай Расіі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Калі ў маладзіц сілы шмат...

У Століне двое ліцэістаў пашкодзілі па вул. Савецкай 5 секцый жалезабетоннага плота.

І ў в. Нача Ляхавіцкага раёна ноччу былі пашкоджаны 23 секцыі такога жа плота. Тут вылучыліся: 23-гадовая маладзіца, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, і 15-гадовая вучаніца сярэдняй школы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БАТЭ выбыў з Кубка

У суботу БАТЭ ў 1/8 Кубка Беларусі нечакана прайграў брэсцкаму «Дынама» — 0:1. Пасля матчу Віктар Ганчарэнка раскрытыкаваў і сябе, і каманду: «Мы напэўна, яшчэ едзем з Бабруйска, ці, дакладней, яшчэ знаходзімся ў той кавярні, дзе адзначалі чэмпіёнства. Ніякай канцэнтрацыі, абыякавыя адносіны да трэніровак і гульні. Ад вялікага да смешнага — адзін крок, і мы яго сёння зрабілі. Але заўсёды трэба верыць ў лепшае, у тое, што такі халодны душ дапаможа нам у гульні з кіеўскім «Дынама». Сёння я і сам шмат памыляўся: і склад, і замены — усё абсалютна недарэчы. І абраная мадэль гульні бязладная. Таму і вынік сумны», — цытуе Віктара Ганчарэнку афіцыйны сайт ФК БАТЭ. У папярэднім розыгрышы ўладальнікам Кубка быў менавіта барысаўскі клуб.

«Тарпеда» застаецца

Футбалісты жодзінскага клуба захавалі за сабой права выступаць у вышэйшай лізе ў наступным сезоне. У хатнім матчы яны ўнічыю згулялі са сталічным СКВІЧам (0:0). У першым матчы падапечныя Сяргея Гурэнкі перамаглі з лікам 3:1.

Абзац

Споўнілася130 гадоў з дня нараджэння выдатнага рускага паэта Аляксандра Блока. Яго жыццёвы і творчы шлях быў звязаны і з Беларуссю. У гады Першай сусветнай вайны ён быў прызваны ў армію і служыў на Палессі, у пасёлку Парахонск каля Пінска. 200 дзён правёў паэт на Брэстчыне. Каля 60 пісьмаў паслаў ён з Беларусі маці, жонцы і сябрам. Імем Блока названыя ў Беларусі 2 вуліцы — у Магілёве і Луніцы.

За суботу-нядзелю ў Мінску затрымалі 50 кіроўцаў у стане алкагольнага ап'янення, а 20 чалавек не мелі права кіраваць транспартным сродкам. За перавышэнне хуткасных рэжымаў руху прыцягнуты да адказнасці 277 кіроўцаў, за парушэнне правілаў праезду пешаходных пераходаў — 117.

У Мінску зарэгістраваныя першыя выпадкі холадавых траўмаў. За тры дні (выхадныя і пятніца) зафіксавана 4 выпадкі пераахаладжання. Усе пацярпелыя былі ў стане алкагольнага ап'янення.

У Гомелі скончыў жыццё самагубствам 11-гадовы школьнік. Хлопчык павесіўся ў сваім пакоі на дзвярной ручцы вечарам 25 лістапада пасля таго, як прыйшоў са школы і зрабіў урокі. Дзіця пакінула прадсмяротную запіску, змест якой не абвяшчаецца. Следства пакуль не прыйшло да канкрэтнай высновы аб тым, што прывяло школьніка да рашэння скончыць жыццё самагубствам. Хлопчык выхоўваўся ў паспяховай сям'і, добра вучыўся, карыстаўся аўтарытэтам у аднакласнікаў. У момант суіцыду ў кватэры знаходзіліся сястра і бабуля дзіцяці. Свякі, калі знайшлі яго павешаным, не паспелі выратаваць хлопчыку жыццё, і «хуткая дапамога», якая прыехала на выклік, канстатавала смерць.

Поўны абзац

Жыхар Баранавічаў спрабаваў незаконна ўвезці ў Беларусь з Украіны жывых галубоў. Незвычайны тавар выявілі гомельскія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні ў пункце пропуску «Новая Рудня». У аўтамабілі Volkswagen мужчына спрабаваў правезці праз мяжу 18 галубоў. Птушак папярэдне ўсыпілі, кожнага загарнулі ў газету, заматалі скотчам і схавалі за сядзенне кіроўцы. Апошні сцвярджае, што не можа зразумець, якім чынам галубы трапілі ў аўто. Па яго словах, птушкі паспелі пасяліцца і звіць гняздо ў іншамарцы падчас яго адсутнасці. Птушкі, ацэненыя ў суму больш за мільён рублёў, будуць перададзены супрацоўнікам мытні.

У Сіднэі ўстанавілі незвычайную калядную ёлку: дрэва створанае з веласіпедаў, якія здадзены гаспадарамі на перапрацоўку. На тое, каб сабраць такую ёлку, у аўтараў ідэі пайшло 8 тыдняў і 100 веласіпедаў. Каб ёлка атрымалася больш натуральнай, усе веласіпеды пафарбавалі ў зялёны колер, а колы атрымаліся рознакаляровымі і сталі падобнымі на шары. На вярхушцы — традыцыйная зорка, якая створана таксама з веласіпедаў. Незвычайная ёлка прастаіць у Сіднэі да 28 снежня, потым яе дэмантуюць.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

FOKKER ЗРАБІЎ АВАРЫЙНУЮ ПАСАДКУ Ў АЭРАПОРЦЕ МІНСК

Самалёт Fokker-100, які зрабіў аварыйную пасадку ў Нацыянальным аэрапорце Мінск мінулай ноччу, у бліжэйшы час вылеціць у Вену, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў дэпартаменце па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі.

Прычынай інцыдэнту стала сігналізацыя выпуску левай стойкі шасі, якая не спрацавала перад пасадкай самалёта. На борце паветранага судна знаходзіўся 81 пасажыр і 4 члены экіпажа. «Ніхто з іх не пацярпеў, самалёт паспяхова прызямліўся ў аэрапорце».

Считать недействительными страховые сертификаты по «Зеленой карте» серии BY/12/Д под номерами: 4284786, 4284787, 4284874—4284876, 4283853, 4283854, 4284924, 4284926, 4284927, 4284930, 4284991, 4284992, 4284803—4284810, 4284844, 4284915, 4284917—4284920, 4284981—4284983, 4284985—4284987, 4284946, 4284947, 4284949 и сертификат серии BY/12 № 4092722, а также страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 1870083, квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) 1-СУ серии КС № 586269, 604456 и страховой полис по договорам страхования, заключаемым с физическим лицом (Форма 2РН) юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК № 46018.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Минский городской территориальный фонд государственного имущества извещает о проведении аукциона с применением метода понижения начальной цены по продаже имущества республиканской собственности – транспортных средств в количестве 23 единиц.

Аукцион состоится 30 декабря 2010 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35 (актовый зал).

Продавец: Автотранспортное государственное учреждение «Белтрансспецавто» Управления делами Президента Республики Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35, конт. тел.: 200 28 23, 226 46 78.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. 200 20 89.

**НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯ

ПЕРАДВЫБАРЧАЯ ПРАГРАМА кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Рыгора КАСТУСЁВА

«СВАБОДА І АДКАЗНАСЦЬ. ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ. НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І ЕЎРААТЛАНТЫЧНЫ ВЫБАР»

Рыгор Кастусёў і Партыя БНФ ідуць на прэзідэнцкія выбары, каб абараніць карэнныя інтарэсы беларускага народу. Партыя БНФ — старэйшая палітычная сіла Беларусі, якая заўсёды кіравалася нацыянальнымі інтарэсамі.

Нацыянальныя інтарэсы вышэй за ўсё — вось наш прынцып.

На пасадзе прэзідэнта кандыдат ад Партыі БНФ Рыгор Кастусёў зробіць усё для рэалізацыі гэтага прынцыпу, згодна з палажэннямі дадзенай праграмы.

СВАБОДА І АДКАЗНАСЦЬ

● Вяртанне да прынцыпу законнасці і раздзялення ўладаў — першачарговая задача. Беларусь павінна стаць прававой дзяржавай.

● Партыя БНФ выступае за пераход ад аўтарытарнай сістэмы прэзідэнцкага кіравання да парламенцкай рэспублікі. Канстытуцыйны сход павінны вырашыць пытанні пабудовы грамадска-палітычнага ладу вольнай і незалежнай Беларусі, распрацаваць часовыя палажэнні і механізм прыняцця новай Канстытуцыі, а таксама прызначыць Камісію па прававой рэформе і Камісію па люстрацыі. На пераходны перыяд дэмакратычны кааліцыйны Урад народнага даверу будзе сфармаваны па пазапартыйным прынцыпе на тэрмін да правядзення свабодных выбараў Парламенту.

● Скарачэнне дзяржапарату будзе наступнай задачай. Карупцыя, што апанавала кіруючы рэжым, — гэта ракавая пухліна, якая паразітуе на беларускай нацыі. Скіданне ярма бюракратыі і карупцыі будзе адбывацца адначасова са скасаваннем органаў палітычнага пераследу і спецслужбаў, што абслугоўваюць інтарэсы існай уладнай групоўкі.

● Сістэма мясцовай улады будзе рэфармаваная ў адпаведнасці з прынцыпамі Еўрапейскай Хартыі мясцовага самакіравання.

● Свабода прэсы будзе абароненая дзяржавай. Незалежныя СМІ будуць сапраўднай «чацвёртай уладай», якая дапаможа знішчыць усе праявы карупцыі. Будзе скасаваная дзяржаўная манаполія на тэлебачанне і радыё.

● Перагляд недэмакратычна прынятага заканадаўства будзе здзейснены неадкладна. Камісія па прававой рэформе вызначыць прыярытэтныя кірункі рэфармавання. Мы бачым першачарговымі задачамі стварэнне заканадаўчых гарантыяў для справядлівасці незалежнай судовай сістэмы і свабоды слова.

● Гвалт над Законам з боку аўтарытарнага рэжыму не павінны застацца без пакарання. Мы не можам дазволіць забыцца на палітычна матываваныя знікненні, збіццё дэпутатаў Парламенту і шматлікія факты рэпрэсій. Усе факты парушэння законнасці мусяць быць расследаваныя аб'ектыўна. Дзеля гэтага будзе створаная камісія па люстрацыі з шырокімі паўнамоцтвамі і ясным механізмам перадачы вынікаў следства ў органы пракуратуры і суд.

● Рыгор Кастусёў створыць нацыянальную сістэму абароны правоў чалавека і справядлівасці, якая цяпер адсутнічае ў Беларусі. Яна будзе ўключаць у сябе незалежны і справядлівы суд, упаўнаважанага па правах чалавека. Будзе ўведзены мараторый на смяротнае пакаранне. Старыя спецслужбы будуць скасаваныя, КДБ будзе распушчаны, а ягоная дзейнасць, таксама як і дзейнасць ягоных папярэднікаў, расследаваная Камісіяй па люстрацыі. Новыя спецслужбы будуць створаныя з прафесіяналаў, не заплямленых палітычнымі рэпрэсіямі, карупцыяй і злачынствамі.

ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ

● Рыгор Кастусёў зробіць усё, каб у выніку справядлівай зямельнай рэформы была гарантаваная прыватная ўласнасць на зямлю, што створыць гаспадарчы падмурак новай дэмакратычнай Беларусі.

● Будуць створаныя вольныя ўмовы для развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, спрыяльныя ўмовы для крэдытавання бізнэсу праз развіццё мікрафінансавання, стварэнне канкурэнцыі на рынку банкаўскіх паслуг, у тым ліку праз прыцягванне замежнага банкаўскага капіталу. Галоўнае для бізнэсу — стабільнасць правілаў гульні: частыя і беспадстаўныя змены заканадаўства будуць спыненыя.

● Мытныя пошліны на ўсе віды тавараў, якія не вырабляюцца на тэрыторыі Беларусі, павінныя быць скасаваныя.

● Эканамічная інтэграцыя з Еўрасаюзам азначае доступ нашай прадукцыі на еўрапейскія рынкі. Але пры гэтым для нашай краіны для захавання канкурэнтаздольнасці ў глабальным асяроддзі жыццёва неабходная мадэрнізацыя эканомікі. Рэжым аднаасобнай улады як састарэлая форма кіравання ёсць вынікам захавання састарэлых формаў вытворчасці. Прыярытэтам у інвестыцыйнай палітыцы будзе прыцягненне еўрапейскіх сродкаў дзеля стварэння сучаснай прамысловасці і новых працоўных месцаў.

● Па ініцыятыве новага прэзідэнта будзе створаны празрысты і некарумпаваны парадак заахвочвання замежных інвестыцыяў.

● Увядзенне моцнай нацыянальнай валюты — талера — арыентыр для грашова-фінансавай палітыкі. На бліжэйшы перыяд мэтай будзе правядзенне пісьменнай і разважлівай грашова-фінансавай палітыкі з мэтай пераадолення наступстваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Падаткавыя стаўкі будуць істотна паменшаныя, а дзейнасць правяраючых органаў упарадкаваная.

● Канкурэнтаздольная эканоміка немагчымая без сучаснай сістэмы адукацыі і навукі. Мы скасуем усе абмежаванні на міжнародныя кантакты беларускіх навучальных установаў, будзем заахвочваць стажыроўкі, абмены, сумесныя праекты для прыцягвання ў краіну сучасных ведаў і тэхналогіяў. Прымусовае размеркаванне студэнтаў будзе заменена на права выбару першага месца працы. Беларусь павінная далучыцца да Балонскага працэсу і ўвесці еўрапейскія адукацыйныя стандарты, мусіць быць забяспечанае прызнанне айчынных дыпломаў у Еўропе. Павінныя быць створаныя ўмовы для вяртання ў Беларусь Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, які цяпер вымушаны працаваць па-за межамі краіны, а таксама для адкрыцця ў Беларусі філіялаў вядучых замежных універсітэтаў.

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І ЕЎРААТЛАНТЫЧНЫ ВЫБАР

● Нацыянальныя інтарэсы, а не зацікаўленасці асобных груповак, павінны быць асновай знешняй палітыкі дзяржавы. Беларусь ёсць неад'емнай часткай еўрапейскай цывілізацыі. Таму еўрапейскі шлях нашай краіны — гэта не пытанне геапалітычнага хістання паміж Масквой і Бруселем, а свядомы і асэнсаваны ўдзел у еўрапейскіх структурах у якасці паўнапраўнага суб'екта.

● Перагляд усіх міжнародных дамоваў, якія не адпавядаюць нацыянальным інтарэсам, стане гарантыяй незалежнасці нашай дзяржавы. Выхад з Мытнага саюзу, Саюзнай дзяржавы і падобных утварэнняў парве ланцугі, што прывязваюць Беларусь да Крамля.

● Незалежнасць краіны ня будзе трывалай, калі яна не забяспечваецца культурнымі чыннікамі. Новаабраны прэзідэнт вярне спрадвечную нацыянальную сімволіку — Пагоню і Бел-Чырвона-Белы сцяг. Будуць створаныя дзейсныя механізмы падтрымкі і пашырэння ўжывання беларускай мовы. Органы дзяржаўнай улады і іншыя дзяржаўныя арганізацыі павінны функцыянаваць па-беларуску, а законы і іншыя нарматыўна-прававыя акты мусяць стварацца на беларускай мове. Галоўнаму аэрапорту краіны будзе нададзенае імя народнага пісьменніка Васіля Быкава.

● Энергетычная незалежнасць ёсць неабходнай умовай палітычнай незалежнасці. Мы выступаем за развіццё як альтэрнатыўнай энергетыкі і энергазберагальных тэхналогій, так і даказаўшых сваю эфектыўнасць еўрапейскіх падыходаў да развіцця атамнай энергетыкі. Энергетычнае супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі мусіць стаць альтэрнатывай расійскаму імперыялізму.

● Цяперашняя дэмаграфічная сітуацыя пагражае незалежнасці і самому існаванню беларускай нацыі. Кожная сям'я пры ўзяцці шлюбу павінна атрымліваць грант у памеры сярэдняга гадавога заробку, якім зможа скарыстацца пры нараджэнні другога дзіцяці. Вырашэнне дэмаграфічнай праблемы немагчымае без умацавання сям'і. Дзеля гэтых мэтаў будзе заснаваны Фонд будучых пакаленняў, у які будуць пераведзеныя сродкі з усіх прэзідэнцкіх фондаў і грошы, атрыманыя праз скасаванне органаў палітычнага пераследу.

● Дзеля ратавання беларускай нацыі ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы будзе рассакрэчаная поўная інфармацыя аб уплыве яе наступстваў на здароўе нацыі; санітарныя нарматывы, датычныя радыяцыйнага забруджвання, будуць прыведзеныя да стандартаў Еўрасаюза; будзе палегчаная працэдура імпарту лекаў, неабходных для лячэння анкалагічных захворванняў; уведзеныя льготы, якія б стымулявалі дабрачынную дзейнасць па арганізацыі лячэння за мяжой і ўвоз лекаў і медтэхнікі; забяспечаная магчымасць рэгулярных бясплатных абследаванняў для выяўлення ракавых захворванняў сярод дзяцей і падлеткаў; павялічанае фінансаванне адпаведных медычных установаў з перанакіраваннем на гэтыя мэты сродкаў, што сёння выдаткоўваюцца на фінансаванне ідэалагічнай вертыкалі.

● Будзе пастаўленая заслона нелегальнай іміграцыі. Мяжа з Расіяй будзе ўсталяваная і надзейна ўмацаваная, каб забяспечваць бесперашкодныя стасункі паміж добрасумленнымі грамадзянамі, але абараняць Беларусь ад крыміналу.

● Новы прэзідэнт прыкладзе ўсе намаганні для няўхільнага далучэння Беларусі да Шэнгенскай прасторы. Пры гэтым грамадзяне Расіі змогуць атрымліваць беларускія нацыянальныя візы бясплатна.

● Арганізацыя Паўночнаатлантычнай Дамовы павінна стаць гарантам незалежнасці нашай краіны, што патрабуе далучэння Беларусі да палітычных, а ў перспектыве — і да вайсковых элементаў еўраатлантычнай сістэмы бяспекі. Перагляд вайскова-палітычнай дактрыны будзе ініцыяваны пасля кансультацыяў з асноўнымі палітычнымі суб'ектамі, кіраўніцтвам Міністэрства абароны і Генеральнага штабу, з улікам меркавання маючага адбыцца Канстытуцыйнага сходу. Мы выступаем за прафесійнае войска.

● Далучэнне Рэспублікі Беларусь да Еўрапейскага Саюзу мусіць быць арыентырам беларускай знешняй палітыкі. Але гэтае далучэнне магчыма толькі на ўмовах, якія будуць выгодныя беларускаму народу і адпавядаюць інтарэсам беларускай дзяржавы. Мы не згодныя пазбавіцца культурнай адметнасці дзеля кароткачасовых гаспадарчых перавагаў.

Шаноўныя сябры і аднадумцы!

Для ўсіх нас Беларусь ёсць адзінай і непаўторнай Бацькаўшчынай. Нашая агульная будучыня непарыўна звязаная з лёсам беларускай нацыі. Разам мы здольныя дамагчыся годнага, свабоднага і незалежнага жыцця на беларускай зямлі. Новы прэзідэнт Беларусі ад Партыі БНФ скарыстае ўсе прэзідэнцкія паўнамоцтвы для дасягнення гэтай мэты.

Калі Вы падтрымліваеце гэтую праграму — галасуйце за Рыгора Кастусёва і ахвяруйце сродкі для агітацыі на рахунак 3014000000379 у ААТ «АСБ Беларусбанк» код 795.

ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА кандыдыта ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксея МІХАЛЕВІЧА

«СТРАТЭГІЯ ЭВАЛЮЦЫЙНАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ»

Эканамічная мадэль, якую выпрацавала сённяшняя ўлада, была прыдатная для сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя і першых гадоў новага тысячагоддзя, але яна не адпавядае сучасным патрэбам краіны. Каб выправіць гэтае становішча, я і мая каманда распрацавалі праграму эвалюцыйнай **Мадэрнізацыі** Беларусі. Аснову гэтай праграмы складаюць эканамічны рост, эфектыўная дзяржава і актыўнае грамадства.

I. ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ

Падмуркам развітой і багатай краіны заўсёды была і будзе канкурэнтаздольная гаспадарка. Аднак сёння мы становімся сведкамі таго, што наша эканоміка не дае рады з сусветнымі і рэгіянальнымі зменамі, а шматлікая бюракратыя, недасканалыя законы, заблытаная сістэма падаткаў і цэнтралізаваная ўлада замінаюць развіццю Беларусі. Паколькі самым надзейным паказчыкам паляпшэння жыцця грамадзян з'яўляецца павышэнне іх даходаў, то першая мэта маёй праграмы — гэта забеспячэнне эканамічнага росту.

Я выступаю ЗА:

● стварэнне празрыстых і зразумелых законаў, якія дапамогуць прыцягнуць у нашу краіну замежныя інвестыцыі і тэхналогіі;

● ахову прыватнай уласнасці і павышэнне ўзроўню эканамічных свабод;

● аптымізацыю падаткаў і шырокую падтрымку малога і сярэдняга бізнесу;

● адмену цэнавай рэгуляцыі на камерцыйныя тавары і паслугі;

● адлучэнне бізнесу ад структур улады і спецслужбаў;

● мадэрнізацыю горадаўтваральных прадпрымстваў беларускай прамысловасці;

● развіццё інфраструктуры і высокатэхналагічнай вытворчасці;

● укараненне новых метадаў кіравання і збыту;

● аптымізацыю працэдур адкрыцця і закрыцця бізнесу, ліцэнзавання, сертыфікацыі і фінансавай справаздачнасці;

● развіццё камерцыйных банкаў і даступных формаў крэдытавання;

● амністыю максімальна магчымай колькасці беларусаў, якія апынуліся ў турмах з прычыны іх уцягнутасці ў эканамічную дзейнасць;

● правядзенне зямельнай рэформы і дзяржаўную падтрымку фермерскіх гаспадарак;

● дыверсіфікацыю пастаўшчыкоў электраэнергіі і прыродных рэсурсаў;

● большую незалежнасць Нацыянальнага банка і ўзмацненне беларускай валюты;

● актывізацыю іпатэчнага крэдытавання;

● развіццё электроннай камерцыі, страхавых паслуг і інтэрнет-плацяжоў;

● усебеларускую інфарматызацыю і праграму аздараўлення публічных фінансаў;

● стварэнне Агенцтва фінансавага развіцця, якое будзе займацца ўскосным датаваннем беларускіх дзяржпрадпрыемстваў;

● стварэнне ўмоў для ўключэння шырокіх слаёў насельніцтва ў працэс акцыянавання беларускай эканомікі пасродкам пенсійных і страхавых фондаў;

● рэалізацыю нацыянальнай праграмы «Старт», накіраванай на падтрымку пачынаючых прадпрымальнікаў і канвеерны запуск новых бізнесаў;

● стварэнне інфармацыйна-кансультацыйных цэнтраў экспертных ведаў для малога і сярэдняга бізнесу і «інкубатараў прадпрымальніцтва»;

● стварэнне нафтагазавага Канцорцыўма ў складзе Беларусі, Украіны, Еўрасаюза і Расіі, які будзе займацца пытаннямі транзіту энерганосьбітаў у Еўропу.

Каб паспяхова абараняць беларускія пазіцыі на міжнародных рынках, беларускім суб'ектам гаспадарання трэба дапамагчы ў справе засваення «законаў» эфектыўнага прасоўвання тавараў і паслуг. Маркетынг, PR і рэклама могуць стаць ключом да стварэння прывабнага іміджу нашай рэспублікі далёка за яе межамі.

Узаемадзеянне дзяржавы, навукі і бізнесу мусіць стаць крыніцай тэхналагічнага прарыву Беларусі. Я веру ў будучыню навуковых паркаў, актыўнае супрацоўніцтва навуковых устаноў з бізнесам і рэалізацыю пры фінансавай падтрымцы дзяржавы новых перспектыўных патэнтаў.

II. ЭФЕКТЫЎНАЯ ДЗЯРЖАВА

Дзяржава — гэта механізм, які павінен спраўна выконваць задачы, для якіх ён быў створаны, не абмяжоўваючы без пільнай патрэбы свабоды сваіх грамадзян. Прычым забеспячэнне гаспадарчага і тэхналагічнага лідэрства ў нашым рэгіёне палягае не столькі ў вынаходстве рэформаў, колькі ў якасці дзяржаўных інстытутаў, якія будуць ажыццяўляць гэтыя рэформы.

Я выступаю ЗА:

● незалежнасць судоў і ўвядзенне прынцыпу выбарнасці беларускіх суддзяў;

● узмацненне ролі парламента і Канстытуцыйнага суда, падпарадкаванне Генеральнай пракуратуры Нацыянальнаму сходу;

● рэформу выбарчага заканадаўства;

● вяртанне да канстытуцыйнай нормы, паводле якой адна асоба не можа быць прэзідэнтам больш за два тэрміны;

● абранне кіраўнікоў абласцей і мэраў гарадоў жыхарамі гэтых рэгіёнаў;

● свабоду слова і развіццё камерцыйных тэлеканалаў, радыёстанцый і газет;

● ліквідацыю ўсіх упраўленняў і аддзелаў па ідэалогіі і паступовую прыватызацыю дзяржаўных СМІ;

● павышэнне статусу ваеннаслужачых;

● захаванне дактрыны, якая грунтуецца на ваенным нейтралітэце Беларусі (пры гэтым беларускае войска дзеля падтрымання сваёй бяздольнасці павінна праводзіць сумесныя вучэнні як з Расіяй, так і з НАТО);

● пенсійную рэформу і стварэнне накапляльнай сістэмы з персанальнымі пенсійнымі рахункамі;

● канкурэнцыю прыватных пенсійных фондаў пры захаванні дзяржаўных сацыяльных пенсій;

● устанаўленне грамадскага кантролю над працай праваахоўных органаў;

● укараненне прынцыпу конкурснага прыёму на дзяржаўную службу і спрашчэнне вертыкалі на карысць мясцовых органаў самакіравання;

● актывізацыя палітычных адносін, якія маюць на мэце доступ да заходніх рынкаў, тэхналогій, інвестыцый і абарону інтарэсаў беларускіх фірмаў за мяжой;

● узаемавыгадныя сяброўскія дачыненні з Расіяй і краінамі СНД, стратэгічнае партнёрства з Еўрапейскім Саюзам і Украінай;

● уключэнне краіны ў міжнародную гандлёва-эканамічную сістэму і ўступленне ў Сусветную Гандлёвую Арганізацыю ў 2012 годзе;

● паніжэнне кошту шэнгенскіх віз для беларускіх грамадзян і ў перспектыве ўвядзенне бязвізавага рэжыму з Еўрасаюзам;

● прыцягненне прыватных фундатараў для мадэрнізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, павышэнне якасці і расшырэнне асартыменту камунальных паслуг;

● забеспячэнне празрыстасці і справядлівасці ў сістэме камунальных тарыфаў.

Ахова навакольнага асяроддзя мусіць стаць іміджаўтваральным элементам беларускай палітыкі. Я перакананы, што будаўніцтва ўласнай АЭС ніякім чынам не ўпісваецца ў канцэпцыю стварэння іміджу «Краіны блакітных азёр пад белымі крыламі». Больш таго, патэнцыйная эканамічная эфектыўнасць станцыі падаецца вельмі сумніўнай. Беларусі па сілах стаць адным з цэнтраў зялёнага руху ў Еўропе і свеце, краінай, якая выступае ініцыятарам абароны прыроды, экалагічна чыстых прадуктаў харчавання і развітой медыцыны, прыродаахоўных тэхналогій і рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў. Гуманнасць беларускай дзяржавы павінна выказвацца ў стаўленні да жывёл. Неабходна адмовіцца ад знішчэння беспрытульных жывёл і стварыць для іх сістэму прытулкаў.

III. АКТЫЎНАЕ ГРАМАДСТВА

Аснова дабрабыту Беларусі — гэта Мы, наш інтэлект, воля, ініцыятыва, наша самастойнасць і актыўная пазіцыя. Назапашванне сацыяльнага капіталу, якім з'яўляецца актыўнае і самадзейнае грамадства, стане залогам выхаду нашай краіны на новыя цывілізацыйныя далягляды.

Я выступаю ЗА:

● дэцэнтралізацыю палітычнай і эканамічнай улады на карысць рэгіёнаў;

● падзел шасці існуючых цяпер абласцей на 17 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак — паветаў — з наступнымі адміністрацыйнымі цэнтрамі: Брэст, Пінск, Мазыр, Гомель, Гродна, Баранавічы, Слуцк, Бабруйск, Ліда, Маладзечна, Барысаў, Магілёў, Крычаў, Глыбокае, Полацк, Віцебск, Орша; а таксама асобную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку — г. Мінск разам з Мінскім раёнам;

● адмену кантрактнай сістэмы і ўдасканаленне заканадаўчай базы, прызванай абараніць правы працаўнікоў прыватнага і дзяржаўнага сектара, свабоду дзейнасці прафсаюзаў;

● адаптацыю сістэмы вышэйшай адукацыі да патрэб рынка, павышэнне сацыяльнага статусу настаўніка і пабудова эканомікі, заснаванай на ведах і інавацыях;

● скасаванне прымусовага размеркавання выпускнікоў ВНУ;

● інтэграцыю Беларусі ў еўрапейскую сістэму адукацыі і ўзаемнае прызнанне дыпломаў і адукацыйных стандартаў;

● увядзенне падатковых ільгот для фірмаў, якія інвестуюць у павышэнне ведаў і кваліфікацыі сваіх супрацоўнікаў;

● дынамічнае развіццё камерцыйных ВНУ і даступных формаў студэнцкага крэдытавання;

● сацыяльную інтэграцыю прадстаўнікоў уразлівых груп насельніцтва, пабудова грамадства роўных магчымасцяў;

● развіццё розных формаў медыцынскага страхавання;

● роўныя правы для рэлігійных канфесій, якія традыцыйна былі прадстаўленыя ў Беларусі (сюды мэтазгодна аднесці і пратэстантаў), і партнёрства дзяржавы і рэлігійных арганізацый у сферах, дзе такое супрацоўніцтва не супярэчыць пастулатам свецкай дзяржавы;

● аднаўленне і развіццё беларускай культурнай спадчыны;

● пашырэнне ўжывання беларускай мовы праз забеспячэнне грамадзян інфармацыяй аб дзейнасці дзяржаўных органаў на беларускай мове.

Надзвычай важнай умовай для захавання беларускай ідэнтычнасці з'яўляецца супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай, першым чынам у Расіі, ЗША і краінах ЕС. Увядзенне «карты Беларуса» можа стаць сур'ёзным крокам да абароны права спадчынных беларусаў вярнуцца на гістарычную радзіму. Нам таксама трэба распрацаваць праграмы адаптацыі мігрантаў, якія пераехалі ў Беларусь з краін былога СССР.

Што тычыцца нацыянальных меншасцяў, то яны павінны мець у Беларусі шырокую аўтаномію і права захоўваць і развіваць свае традыцыі, культуру і мову.

Я перакананы, што эканамічны рост, эфектыўная дзяржава і актыўнае грамадства ў стане сфармаваць эканамічны, істытуцыянальны і сацыяльны капітал нашай краіны, які дазволіць Беларусі прэтэндаваць на ролю цывілізацыйнага лідара Усходняй Еўропы і забяспечыць яе грамадзянам годны ўзровень дабрабыту.

Я веру ў нашу Беларусь і веру ў яе патэнцыял, і сапраўды ведаю: У НАС УСЁ АТРЫМАЕЦЦА!

Аляксей МІХАЛЕВІЧ.

Погляд

НОВАЯ СЛАВЯНСКАЯ ЕЎРОПА З ЦЭНТРАМ У МІНСКУ. ЧАМУ Б І НЕ?

У Мінску ў прэс-цэнтры «Дома прэсы» адбылася сустрэча з журналістамі вядомага расійскага аналітыка і палітолага, старшыні назіральнай рады Інстытута дэмаграфіі, міграцыі і рэгіянальнага развіцця, старшыні Руху развіцця Расіі Юрыя Крупнова. Хоць ён жорстка адстойвае геапалітычныя інтарэсы сваёй краіны, разам з тым яго падыходы і погляды на перспектывы будаўніцтва Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі істотна адрозніваюцца ад пазіцыі многіх пракрамлёўскіх экспертаў. У прыватнасці, выклікаюць цікавасць прапановы і ідэі наконт спалучэння патэнцыялаў абедзьвюх дзяржаў у імя будучыні іх народаў.

ЧАС СТВАРАЦЬ НОВУЮ ВЯЛІКУЮ КРАІНУ

Зразумела, гэтая ідэя палітолага гучыць фантастычна, асабліва на фоне стану сучасных няпростых адносін палітычнага кіраўніцтва Расіі і Беларусі. Але на думку Юрыя Крупнова, у нас няма іншай альтэрнатывы. Яго непакоіць, што сёння далейшае існаванне Саюзнай дзяржавы ў Маскве разглядаецца пэўнымі назіральнікамі і ўплывовымі чыноўнікамі як даволі праблематычнае і пазбаўленае глыбокай перспектывы. Часта можна чуць меркаванні аб тым, што развіццё Саюзнай дзяржавы зайшло ў тупік, што яна хутка знікне, бо ўжо пройдзены так званы «пункт невяртання» да былых адносін і г. д. Такія высновы Юрый Крупноў мякка назваў неадэкватнымі. Бо, па яго словах, разваліць СССР удалося вельмі хутка — дурная справа няхітрая. А каб стварыць хоць бы паміж дзвюма новымі краінамі паўнавартасны саюз, рэальную Саюзную дзяржаву, спатрэбіцца не адно дзесяцігоддзе. І нягледзячы на часовыя цяжкасці, яна будзе створана. Гэта важная ўмова для выжывання постсавецкіх краін, упэўнены палітолаг.

На яго думку, сёння геапалітычная сітуацыя вельмі жорсткая, яна ў пэўным сэнсе нагадвае сітуацыю 1941-45 гг. Бо гаворка ідзе пра тое, ці здолеем мы — Расія і Беларусь, захаваць сябе як унікальныя цывілізацыі. Таму выбар невялікі: ці мы ствараем Саюзную дзяржаву, ці будзем уцягнуты ў іншыя цывілізацыі, іншыя геапалітычныя суб'екты і паступова там растворымся, асімілюемся. І так можа здарыцца, што неўзабаве велізарная Расія апынецца маленькай у параўнанні з іншымі гіганцкімі саюзамі, сказаў Юрый Крупноў.

З гэтай нагоды ён падзяліўся змрочным прагнозам: у бліжэйшыя год-два нас чакае некалькі сур'ёзных узрушэнняў. Адсюль яго выснова: Расія і Беларусь павінны забыць часовыя спрэчкі, крыўды, непаразуменні і разам супрацьстаяць верагодным глабальным непрыемнасцям. У прыватнасці, разбуральным фінансавым і эканамічным выклікам. Бо вялікая верагоднасць другой хвалі сусветнага крызісу. А таму цяпер асноўная мэта Саюзнай дзяржавы — стварэнне новай мадэлі эканомікі, якая не будзе падобная ні на беларускі сацыялізм, ні на расійскі капіталізм. Абедзве гэтыя мадэлі маюць свае плюсы і мінусы, але яны па аб'ёму вытворчасці новай вартасці неадэкватныя нават задачам забеспячэння і павышэння якасці і ўзроўню жыцця насельніцтва. Бо страшна ўявіць, што будзе ў Расіі, калі раптам абваляцца цэны на нафту і газ, кажа палітолаг.

Важным адрозненнем новай саюзнай эканомікі павінны стаць вялікія праекты, якія адначасова стануць і новымі нацыянальнымі эканамічнымі сістэмамі. Яны дазволяць істотна павысіць нацыянальнае багацце кожнай краіны. Ім трэба будзе засяродзіцца на вытворчасці звышвартасці. Напрыклад, у савецкія часы такім праектам стала засваенне надзвычай багатых вуглевадародамі нетраў Цюменскай вобласці. Увогуле, звышзадача новай вялікай краіны — выхад у сусветныя эканамічныя лідары. І гэта рэальна, лічыць расійскі госць, бо сёння ў свеце ніхто не стварае новую эканоміку, нават Кітай.

На погляд Юрыя Крупнова, на жаль, мы ўсе не да канца разумеем гістарычнае значэнне і ролю Саюзнай дзяржавы. А між іншым, сам факт яе існавання гаворыць шмат пра што. У прыватнасці, ён дае ўнікальныя магчымасці для постсавецкай рэінтэграцыі. Хаця, з іншага боку, ён назваў фантастычна неабгрунтаванымі прэтэнзіі абодвух бакоў да Саюзнай дзяржавы. Трэба адзначыць, што Юрыя Крупнова як аналітыка вылучае імкненне зазірнуць далёка за сучасныя палітычна-эканамічныя далягляды. Ён не выключае ўзнікнення новай славянскай цэнтральнай Еўропы з цэнтрам у Мінску. Чаму б і не? Гэта будзе супастаўнае з Еўрасаюзам новае магутнае эканамічнае ўтварэнне, да якога далучыцца і Украіна.

Трэба адзначыць, што пытанне аб рэінтэграцыі постсавецкай прасторы даволі часта задаюць Юрыю Крупнову. У Мінску ён таксама даў разгорнутае тлумачэнне сваіх падыходаў. Нам рэінтэграцыя неабходна ў першую чаргу для таго, каб у бліжэйшыя 10 гадоў стварыць новую вялікую краіну, назву якой яшчэ ніхто пакуль не ведае. Як і тое, якой будзе яе структура, формы ўзаемадзеяння. Ды і не ў назве сутнасць, лічыць Юрый Крупноў. Важнай рысай новай вялікай краіны стане захаванне нацыянальных суверэнітэтаў. Але «збіраць» такую краіну неабходна — гэта патрабаванне часу. У якасці платформы для яе стварэння на постсавецкай прасторы можа і павінна стаць Саюзная дзяржава Расіі і Беларусі, яе практычны, у тым ліку і негатыўны, досвед. Адмова ад гэтага стане ў пэўным сэнсе бядой для іх народаў.

«ТРУБА» АТРУЧВАЕ СВЯДОМАСЦЬ РАСІЯН

Юрый Крупноў спыніўся на тым, што замінае гэтай справе. Самы вялікі праціўнік рэінтэграцыі, як гэта ні дзіўна, само насельніцтва Расійскай Федэрацыі. Не ўлада, а менавіта насельніцтва. Такой вось цікавай думкай падзяліўся з намі маскоўскі палітолаг. На яго погляд, у свой час галасаванне за Ельцына гэтаму яркае пацвярджэнне. Народ тады думаў, што захавае сваю самабытнасць, але рэальна ўсім хацелася займець «трубу» і жыць нябедна каля яе. Прычым жыць лепш, чым іншыя і без асаблівых намаганняў. Таму насельніцтва Расіі было наўмысна ці міжволі зацікаўленае ў развале СССР. Расіянам захацелася шляхам абвяшчэння незалежнасці скінуць з сябе ўкраіны. Украіны разглядаліся мінімум як няпрофільныя актывы. А самыя актыўныя прыхільнікі гэтай ідэі называлі былыя савецкія рэспублікі ўтрыманцамі, якія дзесяцігоддзямі аб'ядалі бедных расіян. І сёння ў Расіі такія настроі і выказванні даволі жывучыя і распаўсюджаныя. Падобныя разважанні, прызнаўся Юрый Крупноў, ён чуе ўжо на працягу 20 гадоў ад самых розных людзей, у тым ліку і чыноўнікаў высокага рангу.

«Труба», а дакладней, яе валютны вуглевадародны змест, пакуль перамагае ў свядомасці значнай часткі насельніцтва Расіі. З пункту гледжання геапалітычных рэалій такая, па словах палітолага, «шкурная» пазіцыя загадзя пройгрышная. У гэтым сэнсе дагэтуль моцнае імкненне сядзець каля «трубы» і нікога не дапускаць да яе, працуе супраць Расіі, яе саюза з Беларуссю. З пункту гледжання такой эканомікі зразумелымі становяцца велізарныя дэмаграфічныя страты Расійскай Федэрацыі — за апошнія 20 гадоў зніклі 23 тысячы населеных пунктаў. Працягваецца гіганцкае матэрыяльнае расслаенне насельніцтва, заняпад асобных рэгіёнаў, узніклі канфлікты з Беларуссю. А тэхналагічна-прамысловага прарыву няма. У прыватнасці, станкабудаўнічая галіна моцна адстала ад замежных канкурэнтаў. Вельмі марудна ідзе работа па ператварэнні расійскага рубля ў адну з рэзервовых сусветных валют, адзначае палітолаг.

Таму 2011 год можа стаць ці працягам сямейных «разборак» Расіі і Беларусі на палітычнай кухні, ці момантам ісціны для Саюзнай дзяржавы, пачаткам іх цывілізацыйнага геапалітычнага наступлення. Дзеля агітацыі за апошняе Юрый Крупноў і прыехаў у Мінск.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ЯКАБСОН:

«НА ЗАБРУДЖАНЫХ ТЭРЫТОРЫЯХ БУДУЦЬ РЭАЛІЗОЎВАЦЦА СПЕЦПРАЕКТЫ»

ДЗЯКУЮЧЫ рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі, у Беларусі адбыліся значныя змены ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. У належны выгляд прыведзены цэнтральныя сядзібы гаспадарак. Але ж ці ёсць перспектыва ў малых вёсак? Гэта толькі адно з пытанняў, якое задалі журналісты старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандру Якабсону.

— У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы ўмацавання аграрнай эканомікі і развіцця сельскіх тэрыторый на 2011—2015 гг. за апошнюю пяцігодку на вуліцах вёсак і пасёлкаў з'явіліся новыя жылыя дамы, пабудаваныя і рэканструяваныя сотні кіламетраў ліній электраперадач і электрасувязі, сетак цепла- і водазабеспячэння. Адкрыты аб'екты бытавога абслугоўвання, пабудаваны новыя і адрамантаваны многія дзеючыя крамы, перааснашчаны ўрачэбныя амбулаторыі, дамы культуры. Развіццё сацыяльнай інфраструктуры вялося з такім разлікам, каб не апынуліся забытымі дробныя населеныя пункты. Трэба прызнаць, што аграгарадкі ў першыя гады лепш фінансаваліся, зараз больш сціплыя нашы бюджэтныя магчымасці, таму нават тое, што мы не зможам у поўным аб'ёме сёлета зрабіць у аграгарадках, не азначае, што мы гэтую тэму закрылі. Сёння распрацоўваецца праграма развіцця сельскіх тэрыторый. Яны будуць развівацца ў любым выпадку: і агарагарадкі, і вёскі, якія маюць перспектыву. А там, дзе засталося па 2-3 дамы, у кожным індывідуальным выпадку трэба разглядаць сітуацыю — тут аднолькавы падыход немагчымы. Увогуле я перакананы, і да гэтага ўсё ідзе, што Беларусь надалей будзе развівацца ў асноўным у сельскай мясцовасці — нездарма ж ствараюцца ўмовы для нармальнага жыцця людзей. Каб не атрымлівалася, як сёння: кожны пяты беларус жыве ў Мінску, а кожны трэці з вобласці — у Гомелі. У нас маленькая рэспубліка, у цэлым нядрэнныя дарогі, самае вялікае — 2 гадзіны да абласнога цэнтра або да сталіцы. Таму трэба стварыць належныя ўмовы на вёсцы, каб людзі ў любы час маглі прыехаць, калі спатрэбіцца, у вялікі горад. Сёння ўвесь свет імкнецца ад'ехаць з горада ў больш спакойныя месцы. Таму перспектыва ў вёскі ёсць.

— Спякотнае лета гэтага года дадало праблем раслінаводам і жывёлаводам. Якія меры прымаюцца для таго, каб уздзеянне неспрыяльных кліматычных умоў на новы ўраджай звесці да мінімуму?

— Тое, што адбылося гэтым летам, можна расцэньваць як надзвычайную сітуацыю. Такія анамальна высокія тэмпературы паветра і дэфіцыт ападкаў за ўсю гісторыю метэаназіранняў зафіксаваныя ўпершыню. Такое надвор'е плюс лёгкія па механічным саставе глебы (80 %) робяць наш рэгіён уразлівым пры вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і раслінаводства. Для мінімізацыі наступстваў падобных з'яў у аграрным сектары праводзіцца сістэмная работа па пашырэнні пасеваў засухаўстойлівых культур — кукурузы, проса, люцэрны, сланечніка і іншых — тых, што здольныя выжыць у засушлівых умовах. У гэты год хоць і пацярпела кукуруза, але ж менавіта яна нас выратавала. Мы недабралі зерня кукурузы, але ж перавялі зерневую групу ў сіласную і сёння смела з кармамі можам пражыць зіму. Трэба ўводзіць у севазварот новыя высокаўраджайныя гатункі сельгаскультур, у тым ліку збожжавыя і зернебабовыя. Сёлета ранняспелы азімы ячмень выспеў да перыяду засухі — сабралі, напрыклад, у Акцябрскім раёне па 45-50 ц з га. Што тычыцца гароднінай групы, то займаемся машынамі для паліўкі плошчаў. Акрамя тых, якія мы асвоілі і вырабляем на Гомельскім радыёзаводзе, зараз там думаюць стварыць машыну, аналагічную амерыканскай, якая з адной кропкі палівае да 30 га. Для нас гэта вельмі важна, бо ў нас кожнае другое лета — засушлівае. Не менш актуальна жорстка выконваць тэхналагічныя рэгламенты вырошчвання раслін і займацца падтрыманнем урадлівасці земляў — павелічэнню аб'ёмаў прымянення арганікі і мінеральных угнаенняў, а таксама рэканструкцыяй, аднаўленнем працаздольнасці меліярацыйных сістэм.

— Якія планы па рэалізацыі інвестыцыйнай палітыкі, у прыватнасці, на тэрыторыі раёнаў, пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС?

— Нельга чакаць, што на забруджаныя тэрыторыі хутка пойдуць замежныя інвестары, там павінна ўкладаць грошы дзяржава. Гомельскі аблвыканкам накіраваў у Дзяржкамітэт па навуцы і тэхналогіях «Пералік спецыяльных праектаў, накіраваных на сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых рэгіёнаў». З 69 праектаў па вобласці 51 праект быў прызнаны эканамічна эфектыўным і значным для пацярпелых раёнаў і рэкамендаваны для ўключэння ў Дзяржпраграму па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС на 2011—2015 гг. і на перыяд да 2020 г. Гэты дакумент зараз знаходзіцца на ўзгадненні ва ўрадзе. Мы дамовіліся, што на будучую пяцігодку 375 млрд рублёў пойдзе на рэалізацыю спецпраектаў на забруджаных тэрыторыях. Будуць выдзяляцца грошы на будаўніцтва аб'ектаў з рэспубліканскага бюджэту. Напрыклад, у Чачэрскім раёне плануецца рэалізаваць 5 такіх праектаў, у т.л. працяг работ па рэканструкцыі свінагадоўчай фермы «Роўкавічы» па вырошчванні племяннога пагалоўя. Увогуле ж інвестыцыйны інтарэс да Беларусі вельмі вялікі. Гэта паказаў апошні форум, які прайшоў у Германіі. Напрыклад, прадстаўнікі нашай вобласці там падпісалі кантракт аб перапрацоўцы гумавых шын у Гомельскім раёне.

— Якое месца займае малы бізнэс у эканоміцы Гомельскай вобласці, і якім вы бачыце бліжэйшую яго будучыню?

— Мы пакуль не задаволеныя тым, як развіваецца гэтая тэма. Заканадаўчая база створана, льготы, прэферэнцыі для развіцця прадпрымальніцтва ў малых населеных пунктах неабмежаваныя. Умовы лепшыя, чым у СЭЗ, але ж пакуль гэта не спрацоўвае так, як нам хацелася б. На жаль, перашкаджае інертнасць нашых кадраў, чыноўнікаў на месцах — любому працэсу трэба надаваць нейкі штуршок.

— Як ідзе фарміраванне жыллёвых кааператываў у сярэдніх і малых гарадах? Ці не складана сёння бударганізацыям выконваць тыя аб'ёмы, якія даведзены?

— У райцэнтрах сапраўды існуе праблема фарміравання жыллёвых кааператываў таму, што розны працэнт стаўкі рэфінансавання для выдачы крэдытаў для будаўніцтва. У Гомелі — адна лічба, у малых гарадах — іншая. Стаўка рэфінансавання ў 3 % дастаткова высокая для жыхароў сельскіх населеных пунктаў — каб выплаціць узяты крэдыт. Ідзе размова, каб знізіць гэтую стаўку да 1 %. І сёння людзі чакаюць канчатковага вырашэння пытання, а пакуль стрымліваюць свой удзел у ЖБК. Што тычыцца магутнасцяў бударганізацый для ўзвядзення жылля, то напружанасць адчуваецца ў некаторых рэгіёнах. Справа ў тым, што ў нас ідзе рэканструкцыя на домабудаўнічых камбінатах: гомельскім, светлагорскім, мазырскім — згодна з рэспубліканскай праграмай па рэканструкцыі магутнасцяў домабудаўнічых камбінатаў у рэспубліцы. Напружанасць адчуваецца яшчэ і таму, што сілы будаўнічых арганізацый Гомельшчыны ў вельмі вялікіх аб'ёмах адцягнутыя ў іншыя рэгіёны. У прыватнасці, каля 1000 чалавек працуюць у Магілёўскай вобласці на будаўніцтве Касцюковіцкага цэментнага завода. Сёння ў Гомельскай вобласці самы магутны будаўнічы комплекс. Мы асвойваем самы вялікі аб'ём капітальных укладанняў, але ж у нас напарадзе найбуйнейшыя праекты, якія трэба будзе рэалізоўваць — будаўніцтва новага завода кальцыніраванай соды ў Мазырскім раёне, новай вытворчасці па ліставым пракаце на БМЗ, рэканструкцыя на шклозаводзе. Нягледзячы на тое, што мы працягваем нарошчваць свае магутнасці, я думаю пра тое, каб выйсці з прапановай перадаць у абласную камунальную ўласнасць усе нашы будаўнічыя арганізацыі, якія пакуль у рэспубліканскай уласнасці. Тады, магчыма, не будзе такіх складанасцяў.

— Дарогі на вёсцы перадалі з балансу сельскіх Саветаў на баланс мясцовых ЖКГ. Сітуацыя не палепшылася, бо ў апошніх няма ні сродкаў, ні спецыялістаў, ні належнай тэхнікі. Як увогуле ідзе развіццё транспартных артэрый?

— Сёння ёсць такая праблема, але ў абласным бюджэце пакуль не хапае фінансаў, каб з ёй справіцца. Раней існаваў дарожны фонд. 20 % яго сродкаў дазвалялася выкарыстоўваць на рамонт дарог мясцовага прызначэння. Потым, калі не стала дарожнага фонду, не стала і гэтай нормы. Цяпер ідзе размова пра тое, каб зноў вярнуцца да гэтай нормы. Ёсць даручэнне прэм'ер-міністра адпаведным службам Міністэрства транспарту. Гэта дастаткова вялікія грошы для вобласці і за некалькі гадоў мы б змаглі гэтую сітуацыю выправіць. Між тым, за кошт кітайскага крэдыту будзе будавацца чатырохпалосная дарога Жлобін—Гомель. Пачнецца будаўніцтва налета і ў 2013 годзе завершыцца. Да таго ж у стадыі распрацоўкі знаходзіцца праект рэспубліканскага ўзроўню па будаўніцтве хуткаснай чыгункі «Мінск—Гомель». Тут вялікі комплекс работ: і станцыйныя збудаванні, і пуцявое ўтрыманне, і набыццё лакаматываў, будаўніцтва пуцеправодаў пры перасячэннях з аўтамабільнымі дарогамі, ліквідацыя пераездаў і г.д. Чыгунка дазволіць скараціць час шляху да Мінска да 2-х гадзін. Па планах, у 2014 годзе ён павінен быць завершаны. Вартасць гэтага праекта каля $440 мільёнаў. Будуць выкарыстоўвацца крэдытныя рэсурсы, у тым ліку кітайскія. Напэўна, і звязаныя — кітайцы будуць пастаўляць сюды сваю тэхніку.

— Праблема чыстай вады застаецца актуальнай. У многіх населеных пунктах яна іржавая. Як праблема будзе вырашацца?

— Гэтая тэма актуальная як для Гомельшчыны, у прыватнасці, так і ўвогуле для ўсёй Беларусі. Сёння людзі не хочуць піць ваду з жалезам. Мы актыўна будуем станцыі абезжалезвання. Дзяржаўная праграма па водазабеспячэнні і водаадвядзенні «Чыстая вада» распрацавана на 2011—2015 гг. Важныя яе напрамкі — павышэнне забяспечанасці сельскага насельніцтва цэнтралізаваным водазабеспячэннем (да 57,7%), стапрацэнтнае водазабеспячэнне насельніцтва ўсіх аграгарадкоў, павышэнне надзейнасці работы сістэм водазабеспячэння, зніжэнне страт вады. Для гэтага ў сельскай мясцовасці плануецца пабудаваць больш за 130 станцый абезжалезвання, больш як 70 артэзіянскіх свідравін, правесці 500 км сетак водазабеспячэння, рэканструяваць і пабудаваць 60 км сетак водаадвода — так званай ліўнёўкі. Для жыхароў Гомеля толькі што мы ўрачыста адкрылі новы водазабор, які поўнасцю здыме праблему чыстай вады для абласнога цэнтра — некалькі дзесяцігоддзяў не атрымлівалася справіцца з гэтай задачай. Цяпер ва ўсіх раёнах абласнога цэнтра будзе выкарыстоўвацца толькі артэзіянская вада, якая праходзіць праз станцыі абезжалезвання. Такім чынам паслядоўна і настойліва дзяржава вырашае адну з асноўных праблем, якая ўплывае на здароўе насельніцтва.

— Наколькі крызісныя з'явы паўплывалі на дзейнасць лакаматываў эканомікі — МНПЗ, БМЗ, а таксама на папаўненне бюджэтнага кошыка вобласці?

— Безумоўна, паўплывалі. Асабліва на МНПЗ — яны да гэтага часу не выйшлі на аб'ёмы мінулага года. Улічваючы іх вялікую ўдзельную вагу ў эканоміцы Гомельшчыны, мы гэта адчуваем. Але ж калі ўявіць, што мы эканамічныя паказчыкі разглядаем без уліку МНПЗ, то ўсе нашы прагнозныя паказчыкі выконваюцца ў тым аб'ёме, у якім даведзены. Гэта гаворыць пра тое, што сітуацыя, якая склалася з нафтай, стала выпраўляцца, але ў цэлым па годзе мы не дасягнем леташніх паказчыкаў. Але ж ёсць упэўненасць, што снежань МНПЗ будзе працаваць на поўную магутнасць. Гэта задача вырашана праз пастаўкі венесуэльскай нафты. Калі запрацуе на поўную магутнасць нафтаправод Адэса—Броды, на наступны год мы будзем упэўненыя, што МНПЗ будзе працаваць устойліва. Бюджэт вобласці мы выконваем за кошт таго, што цэлы шэраг іншых прадпрыемстваў спрацаваў куды лепш — «Гомсельмаш», БМЗ, новыя магутнасці і іншыя. Нядрэнна працуе камунальная ўласнасць. Таму бюджэт не пацярпеў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

НАПАД НА МІЛІЦЫЯНЕРАЎ

У ноч з 27 на 28 лістапада ў пасёлку Багданаўка Салігорскага раёна супрацоўнікі міліцыі мясцовага РАУС падверглі нападу.

Як паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, у рамках правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па папярэджанні крадзяжоў з магазінаў капітан і прапаршчык міліцыі неслі службу ў грамадзянскім адзенні. У нядзелю каля 1.30 да іх падышлі шасцёра агрэсіўна настроеных п'яных хлопцаў, узброеных драўлянымі палкамі і металічнымі прутамі. Супрацоўнікі міліцыі прадставіліся, прад'явілі службовыя пасведчанні і запатрабавалі кінуць прадметы на зямлю. Чацвёра невядомых ніяк не адрэагавалі на неаднаразовыя патрабаванні спыніцца і працягвалі рух у бок праваахоўнікаў. Адзін са зламыснікаў ударыў металічным прутом прапаршчыка міліцыі. Апошні зрабіў восем папярэджвальных стрэлаў з табельнага пісталета Макарава. Хлопцы павалілі прапаршчыка на зямлю, пачалі збіваць і выхапілі зброю, з якой адзін з іх накіраваўся да капітана міліцыі. Той зрабіў шэсць папярэджвальных стрэлаў, а затым двума прыцэльнымі стрэламі параніў невядомага ў брушную поласць, прыціснуў да зямлі і забраў пісталет. У гэты час да афіцэра падбег яшчэ адзін нападнік і ўдарыў палкай па спіне. Міліцыянеру давялося зрабіць адзін папярэджвальны і чатыры прыцэльныя стрэлы ў ногі нападніка. Толькі тады п'яная кампанія паспрабавала знікнуць.

Праваахоўнікі затрымалі на месцы здарэння двух хлопцаў, астатніх затрымала па гарачых слядах следча-аператыўная група РАУС. Як высветлілася, двое агрэсараў аказаліся жыхарамі Салігорска, чацвёра — вёскі Чэпелі Салігорскага раёна. Двое параненых злачынцаў і прапаршчык міліцыі змешчаныя ў бальніцу. Капітан міліцыі атрымаў меддапамогу без шпіталізацыі.

Паводле папярэдняй ацэнкі пракуратуры Салігорскага раёна, дзеянні супрацоўнікаў міліцыі прызнаныя правамернымі. Зараз рыхтуюцца дакументы аб іх заахвочванні. У дачыненні да нападнікаў, малодшы з якіх 1995 г.н, а старэйшы — 1986-га, заведзены крымінальныя справы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Лірычная замалёўка

ПАКУЛЬ ЯШЧЭ Ў ПРАДЧУВАННІ

Як ні стараюцца лістападаўскія цыклоны зацягваць неба хмарамі і ствараць чарговыя тэмпературныя рэкорды, надвор'ем душы ўжо кіруе прадчуванне. І як ні імкнуцца абмежаваць творчую прастору душы бясконцыя клопаты незавершаных спраў і дзень згасае, не паспеўшы нацешыцца святлом, прадчуванне не дае нам падпарадкоўвацца настрою адыходзячай назаўсёды восені.

Прадчуванне свята, насустрач якому штодня робім яшчэ адзін крок, не проста вітае ў паветры. Ягоныя праявы, пакуль нясмелыя і выпадковыя, ужо даюць аб сабе знаць і мяняюць наш звычайны і запаволены лад жыцця. Яны — як парасткі маладых дрэўцаў: спачатку спакваля адваёўваюць невялікую прастору, а потым займаюць усю тэрыторыю.

Учора на сталічным праспекце Пераможцаў расцягнулі першае палотнішча з самым любімым віншаваннем — навагоднім. На плошчы з'явілася першая ўбраная ёлка. На вітрынах пераліваецца рознымі колерамі ілюмінацыя, а на прылаўках нас чакаюць цацкі, маскі, падарункі. У храмах вось-вось запаляцца першыя свечкі перадкаляднага посту...

Здаецца, дні два-тры — і прадчуванне знікне. Яно стане явай, і мы, як адзін, пачнём жыць клопатамі, напоўненымі іншым сэнсам, і спяшацца насустрач (нават не верыцца!) 2011-му. Нягледзячы, што да свята яшчэ больш за месяц.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ЯК КАРТА ЛЯЖА

Погляд

ПРАЙШЛІ агледзіны кандыдатаў у прэзідэнты Беларусі. Выбаршчыкі мелі магчымасць убачыць прэтэндэнтаў на тэлеэкране і паслухаць іх.

Пасля выступлення апошняга кандыдата я патэлефанаваў знаёмым, каб даведацца, што яны думаюць і колькі іх думка супадае з маёй. Адзначу, што апытаныя ўжо ў салідным узросце — ад 50 гадоў і старэй. Двое з іх не глядзелі выступленні, адзін — паслухаў не ўсіх, а трое, як кажуць, ад А і да Я адсядзелі перад тэлеэкранам. «Усё перамяшалася і мне цяжка ўжо сказаць — хто з кандыдатаў і пра што гаварыў. Можа таму, што казалі яны адно і тое ж», — быў адказ знаёмага. «А я нічога новага не пачуў. Ніякіх адкрыццяў у тых выступленнях не было», — заўважыў другі, а трэці доўга не разважаў: «Ніхто мяне не накорміць».

Я не стаўлю перад сабой мэту каментаваць выступленні ўсіх кандыдатаў у прэзідэнты, а спынюся на некалькіх момантах, якія мне падаліся важнымі.

Рыгора Кастусёва, які ідзе на выбары ад партыі БНФ, можна было б успрымаць «шчырым беларусам», напэўна, ён быў бы і добрым гаспадаром на сваіх гектарах, але чалавек падаўся ў палітыку. Свой выступ на тэлебачанні кандыдат пачаў з рэлігійнага наскоку — выкрыцця атэіста. У маёй абароне Аляксандр Лукашэнка не мае патрэбы, але я сам стаю на матэрыялістычных пазіцыях і лічу такую заяву абсурднай і абразлівай.

Кастусёў сабраўся весці нас у Еўропу, дакладней, у Еўрасаюз. А хіба свабода сумлення не з'яўляецца важнейшым фактарам тамтэйшага грамадства? Яскравы прыклад: учора Польшча, здавалася, была каталіцкай краінай, а сёння — грамадства раскалолася на два лагеры. З аднаго боку касцёл са сваімі прыхільнікамі, а з другога — грамадзяне, якія хочуць быць свабоднымі ад рэлігійных догмаў. І прэзідэнтам палякі выбралі чалавека, не завязанага на рэлігіі, хоць выбар быў.

А тое, што на постсавецкай прасторы ў некаторых краінах прэзідэнты хрысцяцца, то гэта іх права. Але калі я бачыў былога расійскага прэзідэнта, які пазіраваў перад тэлекамерамі з нацельным крыжам (а як дробненька хрысціўся, быццам у мінулым быў не палкоўнікам КДБ, а служыў у глыбінцы бацюшкам), то я ў падобныя спектаклі не веру. І калі чалавек не ідзе на такі крок дзеля папулярнасці, то гэта яму толькі плюс.

Наяўнасць свабодамыснасці ў грамадстве сведчыць пра яго сталасць. Будзем цярпімымі да тых, хто думае інакш.

Цяжка ўспомніць у падрабязнасцях ўсе выступленні, але кандыдаты імкнуліся аддзяліць прэзідэнта Беларусі ад народа. Гэта відаць было простым вокам. Маўляў, народ у нас самы-самы, а вось прэзідэнт...

— І чаго яны да Лукашэнкі прычапіліся? — краем вуха пачуў я ў краме.

Аддзяліць А. Лукашэнку ад народа немагчыма. Успомнім, каго першым прэзідэнтам выбіралі ў Расіі? Па сваім характары, паводзінах Ельцын быў рускім чалавекам — гэткі «рускі мядзведзь», ад якога можна было чакаць «выбрыка» ў любы момант.

У Польшчы першым прэзідэнтам стаў Л. Валенса — каталік з цвёрдымі рэлігійнымі ўстоямі, але не інтэлектуал, а рабочы.

І нічога дзіўнага няма ў тым, што беларусы выбралі Аляксандра Лукашэнку. Нічога выпадковага не бывае (у які раз паўтараю). Калі чытаем, што «вёска нахіліла горад», то застаецца толькі ўсміхнуцца наіўнасці аўтара. У нашых гарадах у першым-другім пакаленнях жывуць сяляне — вёска перасялілася ў горад. І беларусы выбралі прэзідэнта, які адпавядае іх менталітэту.

І я кажу абсалютна шчыра — Аляксандр Лукашэнка не з'яўляецца чужародным элементам у нашым грамадстве — ён яго плоць ад плоці. Толькі час пакажа, якую ролю адыграў у лёсе Беларусі яе першы прэзідэнт. Не трэба рабіць паспешлівых вывадаў.

Чалавеку няпроста змяніць свае погляды на жыццё, звычкі, якія склаліся, а перагледзець эканамічныя адносіны ў краіне (зрабіць лёсавызначальны крок) без узрушэнняў немагчыма. Можна з экрана абяцаць народу шчаслівае жыццё, паказваць графікі і казаць пра крэдыторскую і дэбіторскую запазычанасць, у якой большасць тэлегледачоў нічога не разумее, але як вырашыць праблему Баранавіцкага баваўнянага аб'яднання, то, напэўна, ніхто не ведае. Стратнае прадпрыемства можна было б закрыць, але выкінуць на вуліцу некалькі тысяч чалавек... Эканамічныя праблемы, як правіла, выліваюцца ў палітычныя. А якая ўлада хоча іх мець?!

Не хачу выступаць у ролі адваката, але калі чуеш, што трэба разганяць калгасы, то становіцца няёмка. І вожыку зразумела, што рэформы ў сельскай гаспадарцы неабходныя, але жыццё паказала, што яны эфектыўнымі былі толькі ў Польшчы, дзе не было калгасаў і выжыў уласнік. На постсавецкай прасторы тагачасная сістэма вынішчыла селяніна-гаспадара і аказалася, што далёка не кожны можа быць фермерам. Саматужнікаў хапае, а вось прафесіянал-земляробаў мала.

Праблемы ёсць у сельскай гаспадарцы, у прамысловасці, але вырашэнне іх неабходна пачаць з «жалезнага» закона — неабходнасці жыць па сродках. Сямейны бюджэт, як і дзяржаўны, трымаецца на даходах і выдатках. Кожная сям'я плануе жыццё ў адпаведнасці з магчымасцямі свайго кашалька. І калі ў суседніх краінах людзі мерзлі зімой і ў кватэрах не было святла, узнікалі перабоі з выдачай пенсій, то нам жылося даволі прывольна, мы гэтых праблем не ведалі. А можа, і нам у той час неабходна было падцягнуць паясы і заняцца рэфармаваннем эканомікі?

І калі я чую, як той ці іншы кандыдат прапануе свой шлях у «светлую будучыню», то думаю: а ці не скажуць потым людзі: «О-о, як пры Лукашэнку добра жылося, а цяпер што робіцца!» Гэта да таго, што сур'ёзныя зрухі ў эканоміцы магчымыя, калі да іх гатова грамадства. А ці наш чалавек патрываць годдва нястачы ў імя будучыні? За ўсё неабходна плаціць, і за рэформы таксама.

Пасля выступлення У. Някляева паўстала пытанне: а ці можа наш знакаміты паэт быць прэзідэнтам? Хоць кандыдат і спасылаўся на чэшскага прэзідэнта, быццам бы ў сваё апраўданне. У ЗША прэзідэнтам быў акцёр Р. Рэйган, а ў Францыі — мастацтвазнаўца Ж. Пампіду, але ў гэтых краінах палітычна-эканамічная сістэма даўным-даўно абкатаная і пасада прэзідэнта там не адыгрывае той ролі, напрыклад, у эканоміцы, як у рэспубліках былога Саюза.

Някляеў паўстаў перад выбаршчыкамі не як палітык, а як паэт. Каб яшчэ быў час, то, напэўна, нешта і заспяваў бы — сваё.

30 хвілін прамога эфіру на тэлебачанні дастаткова, каб у выбаршчыкаў ужо на гэтым этапе склалася думка пра кандыдатаў. Але пры наяўнасці столькіх прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта хто з іх здольны рэальна канкураваць з Аляксандрам Лукашэнкам?

Дзевяць кандыдатаў расцягнуць раздроблены апазіцыйны электарат, а гэта гарантуе сённяшняму прэзідэнту перамогу на выбарах. Адсутнасць у апазіцыі аднаго лідара пазбаўляе яе магчымасці ўплываць на сітуацыю.

Некаторыя кандыдаты заклікалі людзей выйсці на плошчу. Цікава, а каго тыя павінны падтрымліваць? Усіх дзевяцярых? Ці чакаць, як карта ляжа — хто набярэ больш працэнтаў?

Думаю, спадзявацца на натоўп апазіцыі асабліва не выпадае. Што ў натоўпе розуму няма, то гэта зразумела. Ён, як правіла, генеруе чыесьці ідэі і часта становіцца іх закладнікам. Але генерацыя гэтая магчыма, калі натоўп набірае крытычную масу. А ў Беларусі, у сёлетнюю выбарчую кампанію, няма ніякай перадумовы для гэтага.

Штучна выклікаць у грамадстве нестабільнасць немагчыма. Спрадвеку беларусы разлічвалі на сябе, а ўлічваючы, што яны зведалі на сваім вяку галечу, здзекі, нацыянальны прыгнёт, то сёння ім жывецца параўнальна някепска.

Не магу забыць знаёмага дзеда, які сказаў: «Добра было б яшчэ

ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН: УНІКАЛЬНЫ ПОЎДЗЕНЬ КРАІНЫ

Дырэктар СДЮШ алімпійскага рэзерву Юрый ПАЎЛЮК.

Галоўны трэнер па цяжкай атлетыцы Мікалай ВАРАНОВІЧ.

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Жывёлагадоўлю пачынаем падымаць

У самым буйным раёне вобласці (320 тыс. га), на сельгасугоддзі прыпадае толькі 40 тыс. га, з іх палова — паша. Урадлівасць глебы тут складае па кадастравай ацэнцы каля 25 балаў. Карацей кажучы — пяскі і балоты. Але ж і тут паступова развіваецца сельская гаспадарка. У вёсцы Сініцкае Поле да снежня павінен быць уведзены другі сучасны комплекс на 700 галоў дойнага статку. Будуецца ферма ў Сіманічах — гэта дапаможная гаспадарка «Аграсэрвіса». Ідзе будаўніцтва памяшканняў для сельскай гаспадаркі ў вёсцы Баравое, запланавана будаўніцтва новай фермы на 720 кароў у Дуброве.

— Кармавая база апошнія гады была слабая, — адзначае старшыня Лельчыцкага райвыканкама Аляксандр Капыткоў. — Але сёлета мы добра папрацавалі. 28 умоўных кармавых адзінак на галаву жывёлы нарыхтавана. Гэта на 5 кармавых адзінак больш, чым летась. Добра папрацавалі з кукурузай. Яе сёлета мы сабралі 5400 тон — гэта нядрэнны паказчык. Праўда, азімыя, як і рапс, з-за абледзянення практычна прапалі. Таму сярэдняя ўраджайнасць у цэлым склала толькі 19,5 т з гектара. Будзем рухацца наперад і па вытворчасці малака. На працягу 10 гадоў раён быў у рэспубліцы апошнім сярод усіх 118. Сёння — ужо 108-ыя. Што датычыцца жывёлагадоўлі — трэба стварацъ умовы, каб людзі заставаліся жыць. Цяпер не кожны пойдзе працаваць у памяшканне, якое будавалася 30-40 гадоў таму. Калі ў гаспадарцы «Ударны» ўвялі ў строй новы комплекс на 720 кароў, вынікі не прымусілі сябе доўга чакаць. Людзі ад'язджаць не збіраюцца. Ёсць належныя ўмовы для жыцця і працы — чалавек застаецца і ўпэўнена сябе адчувае. Мы імкнёмся даваць лепшым вучням накіраванні на вучобу — асабліва на спецыяльнасці, звязаныя з сельскай гаспадаркай. Нядаўна вярнуўся пасля вучобы ў Горацкай акадэміі ў гаспадарку «Сініцкае Поле» Міхаіл Чарняўскі — яго адразу паставілі галоўным ветэрынарным урачом. Сёння ён — прыклад у працы для ўсёй мясцовай моладзі і не толькі. Вельмі працаздольны, і з навукай сябруе. 8 ветэрынарных урачоў вярнуліся пасля вучобы ў вёску. А вось аграномаў пакуль не хапае. Аднак я ўпэўнены, што надалей мы будзем толькі паляпшаць справы.

Журавіны і чарніцы

— Мы ўвайшлі ў праект для чарнобыльскіх рэгіёнаў, які дазваляе развіваць вытворчасць і перапрацоўку дзікарослых раслін, — гаворыць старшыня Лельчыцкага райвыканкама Аляксандр Капыткоў. — Адна бяда, якая застаецца на нашай тэрыторыі — забруджанасць. Праўда, журавіны ў нас усе чыстыя, а вось чарніцы — толькі 30 %. У нас ёсць вопыт вырошчвання журавін. Яны не саступаюць па якасці дзікарослым, толькі больш буйныя. 120 га распрацавана пад гэтую карыснуюягаду на базе гаспадаркі «Новая Ніва». Гэтая ягада вельмі запатрабаваная, у тым ліку ў Расійскай Федэрацыі. Калі перапрацаваць яе тут — гэта будзе яшчэ больш выгадна. На адным з прадпрыемстваў ёсць камера замарозкі ўмяшчальнасцю каля 300 тон. Між тым, менавіта дары лесу для многіх мясцовых жыхароў — асноўная крыніца прыбытку. Дары прыроды дапамагаюць нашым людзям жыць. Асноўная наша мэта — сабраць падаткі з нарыхтоўшчыкаў. На жаль, не заўсёды гэта атрымліваецца, шмат ідзе нелегальна. У нас жа ў сезон працуе каля 35 нарыхтоўшчыкаў з усёй рэспублікі.

Кандыдат у майстры спорту, чэмпіёнка краіны сярод юніёраў Алена ЛЯХАВЕЦ і яе першы трэнер Аляксандр ЛІСІЦКІ рыхтуюцца да чэмпіянату Еўропы па цяжкай атлетыцы.

Міні-ЦЭЦ у Лельчыцах

Пакуль гэта толькі планы, але ж тут сапраўды сур'ёзна задумаліся пра будаўніцтва міні-ЦЭЦ. Рэч у тым, што ў раёне праблема з цяплом. Няма цэнтралізаванай кацельнай для падагрэву гарачай вады. Кіраўнік райвыканкама Аляксандр Капыткоў расказвае, што менавіта таму нядаўна звярнуліся да акадэміка НАН Беларусі, доктара тэхнічных навук, прафесара Івана Ліштвана, які дае пацвярджэнне аб мэтазгоднасці будаўніцтва міні-ЦЭЦ, і знайшлі ў яго падтрымку. На тэрыторыі раёна ёсць паліва, якое можна здабываць. Буры вугаль ляжыць на глыбіні 200 метраў — для вытворчасці гэта не вельмі глыбокі пласт. Яшчэ адна галіна, якой патрэбна ўдасканальванне, — адзначае Аляксандр Васільевіч — сфера бытавога абслугоўвання.

— Яна абслугоўваецца, у асноўным, спецыялістамі прыватнага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Буткоўскі В.П.». Але ж прыватнік не мае тых льгот, якімі карыстаецца гэтая сфера ў дзяржаўным сектары. Менавіта таму прыватныя прадпрымальнікі гавораць, што няма сэнсу займацца «бытоўкай». Мы робім усё, каб захаваць «бытоўку» на вёсцы. Трэба сетку цырульняў пашыраць і ў пасёлку, і на сяло выязная цырульня павінна часцей ездзіць, і іншыя віды паслуг трэба развіваць, такія як рамонт тэлевізараў і пральных машын. Мне б хацелася, каб у гэтым краі развівалася бондарства, якое тут захавалася. Зараз у Лельчыцкім раёне працуе 362 прадпрымальнікі. Наш раён мае 40 % даходаў у бюджэт ад дзейнасці прыватнага бізнэсу. Ну а што датычыцца буйных прадпрыемстваў, якія даюць асноўны прыбытак у бюджэт раёна — дык гэта ў першую чаргу друзавы завод «Глушкевічы». Менавіта таму тэма будаўніцтва чыгункі для нас застаецца паранейшаму актуальнай. Друз — прадукт каштоўны, ён патрабуецца паўсюль для вытворчасці даро. Але ж друз становіцца занадта каштоўным, калі яго вывозіць аўтатранспартам. Таму на ўзроўні ўрада ідзе пошук інвестара для будаўніцтва чыгункі да Глушкавічаў. Будзем спадзявацца, што з будаўніцтвам чыгункі Лельчыцкі раён атрымае другое дыханне.

Унікальныя ўласцівасці сапрапелю

Між тым, за апошнія пяць гадоў у Лельчыцкім раёне рэалізаваны шэраг інвестыцыйных праектаў, накіраваных на павялічэнне вытворчых магутнасцяў існуючых прадпрыемстваў і стварэнне новых вытворчасцяў:

- Усталяваная лінія па вытворчасці паганажных вырабаў у Лельчыцкім лясгасе;
- Ідзе рэканструкцыя цэха па вытворчасці хлебабулачных вырабаў вытворчага камбіната Лельчыцкага райпа;
- Праведзена рэканструкцыя лініі па вытворчасці друзу на друззаводзе «Глушкевічы»;
- ААТ «Лельчыцкі аграсэрвіс» увёў у эксплуатацыю новую лінію па затарванні сапрапелю ў спецыяльныя ёмістасці для яго далейшай транспарціроўкі. Яе магутнасць складае 40 т у гадзіну.

Што датычыцца апошняга праекта, да прамысловай здабычы сапрапелю ў Лельчыцкім раёне прыступілі ў пачатку гэтага года. Сродкі для закупкі спецыяльнага абсталявання былі выдаткаваныя з абласнога бюджэту. Кошт інвестыцыйнага праекта па будаўніцтве лініі складае Br600 млн. Лельчыцкі сапрапель валодае ўнікальнымі ўласцівасцямі. Хімічны аналіз сведчыць, што ўтрыманне фосфару прыкладна ў 4 разы больш у параўнанні з яго канцэнтрацыяй у іншых пакладах на тэрыторыі рэспублікі. Ацэнка саставу паказала магчымасць выкарыстання Лельчыцкага сапрапелю для вытворчасці ўгнаенняў, кармавых дабавак і лячэбных грязяў. ААТ «Лельчыцкі аграсэрвіс» падпісала кантракт з польскай фірмай аб пастаўцы да канца гэтага года пробнай партыі сапрапелю ў аб'ёме 1 тыс. т. Калі здзелка будзе паспяховай для бакоў, то ў 2011 годзе аб'ёмы паставак могуць скласці 20-30 тыс. т. Адгружана таксама 20 т сапрапелю ў адрас нямецкай фірмы, якая плануе выкарыстоўваць яго як матэрыял, які звязвае, пры вырабе паліўных пялет з торфу. Торф таксама будзе здабывацца ў Лельчыцкім раёне.

Акрамя таго, налета на базе ўнікальнага радовішча сапрапелю плануецца пабудаваць прадпрыемства па вытворчасці кармавых дабавак.

Пелікан прызямліўся ў гімназіі

Дашкольнай адукацыяй у Лельчыцкім раёне ахоплена 95% дзяцей ва ўзросце ад трох да пяці гадоў. А школьнікі зусім нядаўна набылі магчымасць трапіць вучыцца ў раённую гімназію. На яе будаўніцтва па праграме «Дзеці Беларусі» было ўкладзена больш за 17 мільярдаў рублёў. Але ж цяпер і ў гэтым населеным пункце ёсць установа адукацыі на 540 вучняў, дзе самыя лепшыя школьнікі з усяго раёна атрымліваюць веды ад самых лепшых настаўнікаў.

— У раёне апошні час практычна палова вучняў, якія заканчваюць школу, паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Новая гімназія, спадзяёмся, будзе спрыяць таму, што іх стане яшчэ больш, — гаворыць дырэктар навучальнай установы Галіна Карапунарлы. — Беларускую мову выбралі профільным прадметам. Вельмі шмат мерапрыемстваў праводзіцца зараз на базе гімназіі, хоць пакуль рана гаварыць пра дасягненні. Сваім сімвалам мы абралі пелікана — як сімвал настаўніцкага самаадрачэння і клопату пра дзяцей.

Не так даўно ў раёне быў адкрыты і цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі — для аказання практычнай дапамогі дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, і сацыяльна-педагагічны цэнтр у вёсцы Маркаўскае, дзе працуюць з дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Алімпійскія надзеі

Гэта не перабольшванне. Фізкультура і спорт у Лельчыцкім раёне займаюць асаблівае месца. Тут з пашанай гавораць пра выхаванцаў, якія абараняюць гонар краіны на чэмпіянатах свету і Еўропы па цяжкай атлетыцы.

— Звычайныя вясковыя хлопцы, некаторыя з няўдалых сем'яў, прыходзяць займацца і паказваюць вельмі добрыя вынікі ў спорце, — прадстаўляе спартсменаў старшыня Лельчыцкага райвыканкама Аляксандр Капыткоў. — Ёсць у нас два стадыёны са штучным пакрыццём. Праўда, мы яшчэ марым пра будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу з басейнам.

Дырэктар Лельчыцкай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву Юрый Паўлюк расказвае, што за час існавання іх установы тут падрыхтавана 62 майстры спорту, 6 майстроў міжнароднага класа. Толькі сёлета — 6 майстроў спорту і 1 майстар спорту міжнароднага класа.

— Сёлета на чэмпіянаце Еўропы сярод дарослых ў Мінску Мікалай Новікаў заняў 3 месца. Валянціна Ляхавец — 2 месца ў рыўку, 3-е ў штуршку на чэмпіянаце Еўропы. На першынстве свету па цяжкай атлетыцы сярод юніёраў у Балгарыі наш Казімір Фіцнер заняў 2 месца, а Наталля Колас — 3 месца. 5 выхаванцаў ўключана кандыдатамі на алімпійскія гульні ў Лондан: Казімір Фіцнер, Мікалай Новікаў, Валянціна Ляхавец і Наташа Колас — па цяжкай атлетыцы. І па лёгкай атлетыцы — Аляксандр Ашомка ў кіданні кап'я. Наша маленькая зорачка падрастае — Алена Ляхавец, кандыдат у майстры спорту па цяжкай атлетыцы. Яна сама важыць 32 кг, а лепшы вынік у штуршку паказвае — 56 кг.

Рэкорды выхаванцаў Лельчыцкай СДЮСШАР — вынік апантанай працы галоўнага трэнера Гомельскай вобласці па цяжкай атлетыцы Мікалая Варановіча, які калісьці пасля вучобы ў Віцебскім тэхнікуме фізічнай культуры вярнуўся на малую радзіму. Мікалай Іванавіч добра ведае беларускую мову і пра сваіх вучняў расказвае па-беларуску:

— Я пачынаў займацца самастойна ў 17 гадоў. Снарадамі былі колы з трактара на трубе — такая штанга. А ўжо калі сюды вярнуўся і працаваў старшынёй спорткамітэта, мне прапанавалі пайсці трэнерам у добраахвотнае таварыства «Ураджай». Цяжка было пачынаць з нуля. Спачатку толькі адна штанга была на ўсіх. Потым, у 1977 годзе, — дзве для трэніровак дарослых, і дзве — для дзяцей. Трэніраваліся ў хатцы без ацяплення 6 гадоў. Таму зімой займаліся ў цёплых кашулях, целагрэйках і рукавіцах — бо рукі прыліпалі да жалеза. Хаця ўжо тады асноўны касцяк на рэспубліку з вобласці быў — нашы хлопцы. Так і характар загартоўваўся. Раней не было шмат забаў і была большая цяга да спорту.

Новая гімназія ў Лельчыцах — гонар раёна.

— Якім чынам вы цяпер дзяцей зацікаўліваеце?

— Для любога вучня прыкладам служыць настаўнік. Я трэнераў падбіраў, каб былі фанатамі сваёй справы. У выніку стварэцца мікраклімат, каманда. Калі чалавек патрэніраваўся год — яго ўжо цягне сюды, ён без гэтага не можа. Спартсмен выязджае на розныя спаборніцтвы, адчувае адказнасць. У нас ёсць моцныя дзяўчынкі. Увогуле 11 лельчукоў уваходзяць у розныя каманды зборных Беларусі.

Ганарацца лельчукі і конна-спартыўным аддзяленнем пры Лельчыцкай ДЮСШ. Яе дырэктар Эдуард Юніцкі расказвае, што аддзяленне з'явілася зусім нядаўна, калі школе перадалі конна-спартыўны клуб, які раней знаходзіўся на балансе адной з гаспадарак.

— Нашы вучні пакуль выступаюць на абласным узроўні, але ж мы будзем выхадзіць на больш высокі ўзровень і ўдзельнічаць у рэспубліканскіх, міжнародных спаборніцтвах. Цяпер у нас ёсць два манежы — адкрыты і крыты, і 6 коней розных парод. Гэта вельмі дарагі від спорту, але ж на бюджэтнай аснове тут займаецца 36 навучэнцаў. Многія прыходзяць сюды проста адпачыць.

Конна-спартыўная школа.

Паспяваем разам з «Лелем» і «Лагодай»

За апошнія гады тут адкрылася адразу некалькі ўстаноў культуры. І ў першую чаргу — новы будынак Палаца культуры ў вёсцы Глушкавічы. Дарэчы, са сваіх прыродных матэрыялаў будавалі — з граніту. Калі прыязджая бачаць будынак — здзіўляюцца, і, відаць, зайздросцяць.

Пасля капітальнага рамонту адкрыліся Буйнавіцкі і Сіманіцкі цэнтры культуры і адпачынку, рамантуюцца ўстановы культуры ў аграгарадках Ударнае, Стадолічы, Дуброва, а таксама Ліплянскі і Бараўскі дамы культуры. Праведзены капітальны рамонт будынка дзіцячай бібліятэкі, цэнтра для дзяцей і юнацтва, гарадскога цэнтра культуры...

— Людзям ёсць дзеля чаго працаваць, — лічыць старшыня Лельчыцкага райвыканкама Аляксандр Капыткоў. — Каб потым можна было добра і адпачыць. Прадстаўнікі раёна выступаюць на прэстыжных міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах і фестывалях. Наш калектыў «Лагода» сёлета заняў першае месца ў Севастопалі на фестывалі «Самародкі-2010». Узоры фальклорны калектыў «Карагод» Ліплянскага сельскага дома культуры стаў прызёрам рэспубліканскага фестывалю «Берагіня». Не думаю, што многія раёны могуць пахваліцца і наяўнасцю чыста мужчынскага вакальнага народнага калектыву. У гарадскім цэнтры культуры такі ёсць, «Лель» называецца. Кіруе ім на працягу 10 гадоў Аляксандр Раманаў:

— У нас 8 удзельнікаў — усе мужчыны, усе вельмі любяць спяваць. У нашым калектыве займаюцца тыя, хто працуе ў мясцовым ПТВ, у бальніцы, настаўнікам, мастаком... У рэпертуары — нашы беларускія народныя песні, робім і свае апрацоўкі. Мы прымаем удзел у самых розных конкурсах.

Да гэтага трэба дадаць, што на вераснёўскім фестывалі ў Ляскавічах «Покліч Палесся» першае месца было аддадзена менавіта Лельчыцкаму падворку. Вызначыліся там і самадзейныя калектывы, і рамеснікі, і гандаль.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Алена ДАЎЖАНОК.
Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

УНН 400032854

Легенды пра Лельчыцы

Гарадскі пасёлак Лельчыцы вядомы з XVI ст. як сяло Мазырскага павета Кіеўскага, а з 1569 г. — Менскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. З 1793 г. — цэнтр воласці ў Мазырскім павеце. 27 верасня 1938 года мястэчку Лельчыцы прысвоены статус гарадскога пасёлка. Але самыя старажытныя археалагічныя знаходкі ў Лельчыцкім раёне датуюцца эпохай мезаліту. Пра назву населенага пункта ёсць некалькі легендаў. Гавораць, што першапачатковая назва была крыху іншая — Ленчыцы. Быццам бы з'яўленне яе было звязана з польскімі перасяленцамі, якія заснавалі невялікую вёсачку і назвалі яе так, як называлася тое мястэчка ў Польшчы, адкуль яны перасяліліся — Ленчыца.

Ёсць прыгожая легенда пра тое, што падчас мангола-татарскага нашэсця ворагі шукалі ў лясах і балотах залатую выяву лясного бога Леля памерам у чатыры аршыны. Але ж знайсці не маглі, і гінулі татары ў бяздонных балотах. Пры гэтым паўтаралі імя лясного бога — «Лельчы, Лельчы...» Так сталі называць месца, дзе спынілася варожае войска, — Лельчыцы.

Яшчэ адно паданне сведчыць, што назва пайшла ад імя князя Аляксандра Алелькі. Яго ўладанні ў XV стагоддзі распаўсюджваліся ад Нёмана да Прыпяці. Да іх належалі і землі Лельчыцкага раёна.

МІНЧАНІН ІЛЬЯ ЧЫЖОЎ СКЛАЎ БЕЛАРУСКІ АЛФАВІТ З МІНСКІХ БУДЫНКАЎ!

Малады архітэктар разгледзеў праз спадарожнік, што ў сталіцы ёсць нават «апостраф» ды «і» з кропачкай

Кожны з нас напэўна ж некалі ўяўляў, што Плошча Перамогі нагадвае ў плане літару «О», будынак суседняй школы — літару «Н», а скрыжаванне каля дома мы нездарма называем «Т-падобным». Мінчанін Ілья Чыжоў задаўся мэтай — і знайшоў абсалютна ўсе літары нашага алфавіта. Здавалася б — дзе ўзяць «Ў нескладовае» альбо «Ж»? Аказваецца, і такое можна.

Нясціпла прызнаюся, што ідэю гэтаму ўважліваму мінчаніну незнарок падказаў менавіта я — праз свой сайт www.labadzenka.by Пасля паездкі ў Польшчу, Швецыю і Данію я выклаў здымак, які ўбачыў у рэдакцыі гарадской газеты шведскага мястэчка Мальмё. Адзін з чытачоў склаў з будынкаў амаль увесь шведскі алфавіт. Не знайшоў усяго некалькі «літар-будынкаў».

— Паколькі я архітэктар, то адразу натхніўся ідэяй скласці такі алфавіт для Мінска, — кажа спадар Ілья. — Было вельмі цікава, калі пачало атрымлівацца! Нечакана знайшліся нават будынкі ў форме літары «З», «Ў». Найбольшыя складанасці ўзніклі з літарамі Э, Ч... Падбіраючы літары, я намагаўся выкарыстоўваць больш-менш значныя аб'екты горада — можа, часам і на шкоду выявам. Але знаёмыя аб'екты і будынкі разглядваць цікавей! У мяне самога і цяпер ёсць пэўныя прэтэнзіі да выгляду літар Ы, Э, Ц, Д.... Затое, скажам, літары Б, Е, З, К, Л, М, Р, У назапасіліся ў мяне ўжо ў некалькіх варыянтах!

Спадар Ілья кажа, што часу на такі алфавіт у яго пайшло адносна няшмат — два дні, паралельна з іншымі справамі на працы.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Ілюстрацыі Ільі ЧЫЖОВА.

А Трамвайнае кола на Казлова

Б Квартал па Кірава

В Развязка МКАД—Мазурава

Г «Загагуліна» Свіслачы ў раёне вуліцы Ульянаўскай

Д Развязка МКАД—Лагойскі тракт

Е Будынкі па вуліцы Сердзіча

Ё Корпус БНТУ на праспекце Незалежнасці

Ж Сутык дзвюх развязак у раёне Уручча

(Заканчэнне будзе.)

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Здание склада (здание бойни кроликов)	Склад (здание бойни кроликов) Литер Б1/к. Площадь застройки 153 м.кв., объем здания 444 м.куб., общая площадь здания 179,6 м.кв., фундамент бетонный, наружные стены – силикатные блоки, внутренние стены кирпичные, перекрытия – деревянные, крыша – азбестоцементные листы, полы бетонные, электроснабжение – проводка, вентлиция естественная. Пристройка В1/к. Площадь застройки 28 м.кв., объем здания 44 м.куб., фундамент – бетонный, стены и перегородки – кирпичные, кровля – шифер, полы – бетон, элекричество – проводка. Пристройка Г1/бл. Площадь застройки 27 м.кв., объем 68 м.куб., фундамент бетонный, стены и перегородки – блоки, кровля – шифер, полы бетонные, электричество – проводка.
Местонахождение объекта	г. Гродно, станция Лососно,16-а
Земельный участок	Площадь земельного участка 0,1283 га, назначение – для обслуживания здания склада
Начальная цена продажи	95 190 480 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	9 519 048 белорусских рублей с учетом НДС
ЛОТ 2	
Здание склада вторсырья и здание весовой	Здание склада вторсырья , площадь застройки 518,0 м. кв., объем здания 2590 м.куб., общая площадь здания 503,3 м.кв., фундамент – металлические столбы, наружные и внутренние стены – азбестоцементные листы, крыша – азбестоцементные листы, полы – бетонные. Здание весовой, площадь застройки 176 м.кв., объем здания 210 м.куб., общая площадь здания 64,2 м.кв., фундамент – бетонный, наружные стены – кирпичные,перегородки – кирпичные, силикатные блоки, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, электроснабжение – проводка, вентиляция – естественная
Местонахождение объекта	г. Гродно, станция Лососно,16-б
Земельный участок	Площадь земельного участка 0,2943 га, назначение – для обслуживания здания склада
Начальная цена продажи	221 540 328 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	22 154 033 белорусских рубля с учетом НДС
ЛОТ 3	
Здание склада с навесами	Здание склада с навесами. Площадь застройки 406 м.кв., объем здания 643 м.куб., общая площадь здания 175 м.кв., фундамент бетонный, наружные стены – силикатные блоки, кирпичные, перегородки – металлическая решетка, крыша – азбестоцементные листы, полы – бетонные, вентиляция – естественная.
Местонахождение объекта	г. Гродно, станция Лососно,16-б/1
Земельный участок	Площадь земельного участка 0,0644 га, назначение – для обслуживания здания склада
Начальная цена продажи	121 119 696 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	12 111 970 белорусских рублей с учетом НДС
ЛОТ 4	
Здание магазина и складские помещения	Здание магазина и складские помещения, площадь застройки 75,0 м. кв., объем здания 203 м.куб., общая площадь здания 64 м.кв. фундамент – бутобетонный, наружные и внутренние стены – кирпичные, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, полы – бетонные, электроснабжение – скрытая проводка, вентиляция – приточно-вытяжная
Местонахождение объекта	г. Скидель, ул. Ленина, 5
Земельный участок	Площадь земельного участка 0,0550 га, назначение – для обслуживания здания магазина
Начальная цена продажи	50 285 322 белорусских рубля с учетом НДС
Сумма задатка	5 028 532 белорусских рубля с учетом НДС

ЛОТ 5	
Здание магазина и хозяйственная пристройка	Здание магазина и хозяйственная пристройка. Площадь застройки 158 м.кв., объем здания 432 м.куб., общая площадь здания 139 м.кв., фундамент бутобетонный, наружные стены – бревенчатые, перегородки – деревянные, перекрытие – деревянное, крыша – шиферная 2-скатная, полы – мозаичные, электроснабжение – скрытая проводка, вентиляция – естественная
Местонахождение объекта	г. Скидель, ул. Ленина, 41
Земельный участок	Площадь земельного участка 0,456 га, назначение – для обслуживания здания магазина
Начальная цена продажи	38 537 172 белорусских рубля с учетом НДС
Сумма задатка	3 853 717 белорусских рублей с учетом НДС
Продавец	Гродненское районное потребительское общество, 230003, г. Гродно, ул. Озерское шоссе, д. 41, тел. 74 67 08
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк» код банка 152101705, УНП 500833225

Аукцион состоится 31 декабря 2010 г. в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 30 декабря 2010 г. до 17.00.

Телефон для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

ДАДОМУ НЕ ВЯРНУЛІСЯ

28 ЛІСТАПАДА ў Слонімскім раёне адбылася самая буйная з пачатку года на Гродзеншчыне аўтамабільная аварыя. Інакш як трагедыяй яе не назавеш. Прынамсі ў тры сям'і прыйшло гора. На 124-м кіламетры аўтадарогі Мяжа Літвы—Ліда—Слонім—Быцень абарваліся жыцці трох маладых людзей.

Аварыю здзейсніў дваццацігадовы юнак. Хлопец прыехаў на выхадныя да бацькоў і ўвечары збіраўся вяртацца на вучобу ў Мінск. А пакуль быў на малой радзіме, па просьбе брата забраў яго разам з двума напарнікамі па працы ў Дзятлаўскім раёне і паехаў у Слонім. Магчыма, не хапіла вопыту ваджэння машыны. Хлопец толькі ў лютым гэтага года атрымаў вадзіцельскае пасведчанне. Каля вёскі Задвор'е на мокрым асфальце ён не справіўся з кіраваннем аўтамабіля свайго бацькі. Праязджаючы закругленне дарогі налева, машына не ўпісалася ў паварот. «Фіят» вынесла на паласу сустрэчнага руху, дзе ён правым бокам стукнуўся ў

«Газэль» — аўтамабіль «хуткай дапамогі» адвёз пацыента ў Слонімскую бальніцу і вяртаўся ў Дзятлава.

Удар аказаўся настолькі моцным, што двух маладых людзей, якія ехалі на заднім сядзенні «Фіята», выкінула з салона. Абодва памерлі на месцы. Такая жа доля спасцігла роднага брата вадзіцеля «Фіята». Каб дастаць яго цела з машыны, давялося разразаць яе. Кіроўцы абодвух аўтамабіляў, а таксама фельчар хуткай дапамогі змешчаны ў бальніцу.

Алег ДУК, старшы інспектар ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«Падчас грамадскага абмеркавання праекта будаўніцтва жылога дома заўваг і прапаноў не паступала»

У рэдакцыю газеты звярнулася Валянціна Дзмітрыеўна Валкавец, якая пражывае ў сталіцы па адрасе: вуліца Заслаўская, дом 33 расказала такую гісторыю.

— У двары нашага пяціпавярховага дома, які яшчэ называюць колішнім домам сляпых, пабудавалі новы 19-павярховік. Прычым вельмі блізка да нас. Каб жыхарам з новабудоўлі было дзе ставіць аўтатранспарт, у нас забралі дзіцячую пляцоўку. Калі ўладкоўвалі паркоўку, зрэзалі прыгожыя дрэвы. Цяпер будаўнічыя работы ў двары ідуць поўным ходам. Усё «ўзарвалі», паставілі агароджу, прычым так, што ад яе да вакон нашага дома засталася толькі нешырокая — каля двух метраў шырынёй — дарожка. Дапамажыце! — прасіла заяўніца. — І яшчэ. Колькі часу таму па кватэрах хадзілі дзве жанчыны, казалі, што збіраюць подпісы за пашырэнне дзіцячай пляцоўкі. Мы падпісвалі, асабліва не гледзячы. А потым, як высветлілася, замест той пляцоўкі вельмі хутка ў нашым двары ўзвялі гэты 19-павярховы дом. Падманулі, выходзіць?

Рэдакцыя напачатку патэлефанавала ў адміністрацыю Цэнтральнага раёна г. Мінска, а потым, па просьбе адтуль, накіравала на рэагаванне адпаведны пісьмовы запыт. Вось што нам у выніку паведамілі.

«У адпаведнасці з рашэннямі Мінгарвыканкама ад 27.08.2009 № 2032(1) і ад 31.12.2009 № 3124 СТАА «Белінте-роба» (заказчык — **С.Р.**) прадастаўлены зямельны ўчастак і дазволена будаўніцтва 19-павярховага 132-кватэрнага жылога дома па пр. Машэрава, а таксама інжынерных сетак да яго (далей — аб'ект). Праектная дакументацыя па аб'екце распрацаваная і ўзгодненая ў вызначаным парадку ў адпаведнасці з актамі выбару месца размяшчэння зямельнага ўчастка ад 29.04.2008 і ад 7.04.2009 , зацверджанымі старшынёй Мінгарвыканкама.

Праектным рашэннем на будаўніцтва ўказанага дома прадугледжанае добраўпарадкаванне і пашырэнне існуючых парковак для часовага захоўвання індывідуальнага транспарту насельніцтва на ўчастках, прылеглых да жылых дамоў № 33 і № 35 па вул. Заслаўскай, у тым ліку ўладкаванне дзвюх дзіцячых пляцовак (замест той, што зносіцца перад жылым домам № 33) на свабоднай тэрыторыі паміж дамамі № 33 і № 35 па вул. Заслаўскай і з боку бакавога фасада дома № 33 з устаноўкай на іх дзіцячага гульнявога абсталявання.

У адпаведнасці з дзейным заканадаўствам, распрацоўкай і ўзгадненнем ва ўстаноўленым парадку праектна-каштарыснай дакументацыі прадугледжана выдаленне шляхам высечкі аб'ектаў расліннага свету (дрэў і кустоўя), што трапляюць у пляму забудовы гэтага аб'екта, з наступнымі кампенсацыйнымі пасадкамі. На выкананне будаўніча-мантажных работ па аб'екце заказчыкам атрыманы дазвол органаў Дзяржбуднагляду па г. Мінску ад 28.12.2009.

Пры правядзенні механізаваных работ па зняцці існуючага асфальтавага пакрыцця праезду і паркоўкі ў двары жылога дома па вул. Заслаўскай, 33 былі пастаўленыя секцыі сеткавай агароджы. Зараз яны ў зоне вытворчасці работ дэмантаваныя, вядуцца работы па ўстаноўцы бартоў і ўладкаванні новай пешаходнай дарожкі з дробнапамернай пліткі ўздоўж жылога дома № 33».

Далей у адказе таксама паведамляецца, што, згодна з шэрагам афіцыйных дакументаў (у мэтах эканоміі газетнай плошчы апусцім пералік іх грувасткіх назваў, а таксама дат прыняцця, назваў афіцыйных органаў, што выдавалі гэтыя дакументы), «з 31.07.2009 па 14.08.2009 адбылося грамадскае абмеркаванне праекта будаўніцтва аб'екта «Шматпавярховы жылы дом па пр. Машэрава». Заказчыкам былі паказаныя неабходныя графічныя матэрыялы для арганізацыі экспазіцыі ў фае будынка адміністрацыі Цэнтральнага раёна па вул. Мельнікайтэ, 6... Інфармацыя аб правядзенні гэтага грамадскага абмеркавання была загадзя размешчаная на сайце Мінгарвыканкама і ў сродках масавай інфармацыі — газетах «Звязда» і Советская Белоруссия», а таксама вывешаная на дошках аб'яў каля пад'ездаў жылога дома па вул. Заслаўскай, 33 і прылеглых жылых дамоў з указаннем даты, месца і часу яго правядзення, адраса і кантактнага тэлефона арганізатара.

Пры правядзенні грамадскага абмеркавання і азнаямлення з экспазіцыйнымі матэрыяламі па гэтым праекце пісьмовых заўваг і прапаноў ад удзельнікаў абмеркавання не паступала».

Сяргей РАСОЛЬКА.



ГУЛЯЙ, ВАСЯ?

Не ведаю, як іншыя, а мой брат некалі вельмі зайздросціў забеспячэнцам, бо яны ж сёння тут, а заўтра... Ды дзе заўгодна: у Кіеве, Маскве, Варкуце, Тбілісі... Якія адлегласці! Якія гарады! А галоўнае — для паездкі (лічы, экскурсіі!) ні табе грошы трэба плаціць, ні табе водпуск траціць... Выпісаў камандзіроўку і едзь — гуляй, Вася!

Мы казалі яму, што не ўсё, відаць, так проста, што едуць жа людзі па нейкіх справах, што за імі мо нічога не бачаць, але ён не верыў, пакуль аднойчы сам не адкроіў гэтага хлеба і не паспытаў. Прычым, як той казаў, напоўніцу.

Дзе? Ды ў самой Маскве. Ехаў ён туды, каб у саюзным міністэрстве ўзгадніць пытанне з новым абсталяваннем; папярэдне, як заведзена, тэлефанаваў — праз некага з клеркаў замаўляў гасцініцу, і яму яе абяцалі. А далей...

Прыехаў, значыць, брат у Маскву, каб не марнаваць часу, адразу ж знайшоў патрэбную ўстанову, пахадзіў там па кабінетах (больш, зразумела ж, пасядзеў — пад дзвярыма), аднак што-кольвек высветліў, што-кольвек узгадніў, нешта, як і папярэджвалі, пакінуў на заўтра, бо працоўны дзень скончыўся.

Пасля яго брат, зразумела ж, паехаў на Красную плошчу, у маўзалей, у ГУМ, у іншыя крамы, тоесёе (радня прасіла) купіў, стаміўся — час прыйшоў адпачыць.

Аднак не з ягоным шчасцем, бо ў названай гасцініцы — вочы з арбіт! — ніякага месца яму... не замаўлялі. Начуй, дзе хочаш.

Як на тое ліха, у Маскве ў нас нікога — ні радні, ні знаёмых... Суцяшала хіба маленькая надзея, што не адзін Гаўрыла ў Полацку, не адна гасцініца ў Маскве. Магчыма, хоць недзе знойдзецца месца, ці хоць нехта (усюды ж людзі) раптам субожыцца і пусціць нанач.

Яно і сапраўды — пусцілі б, але не дарма: у адной з гасцініц (здаецца, пятай па ліку) адміністратарка ў адказ на братава «Што ж мне рабіць?», шматзначна паглядзела на яго і вывела на паперцы лічбу 10. Гэта значыць, дай ёй 10 рублёў, тады яна паселіць.

У брата мову адняло, бо гэта ж цяпер тую дзесяцірублёўку з зямлі ніхто не падыме — палянуецца згінацца, а тады яе хапіла б на тое, каб з Мінска ў Маскву даехаць (прытым у купэйным вагоне!). Гэта — па-першае, а па-другое, брат той дзясяткі ўжо проста не меў — патраціўся...

«Са стану ступару» яго вывеў... нейкі мужык, ён далікатна ўзяў брата за локаць і сказаў, што за пяць рублёў пусціць нанач у сваю кватэру. Маўляў, усе выгоды там, ложак з чыстай пасцеллю. Морда ў самога — ну выліты бандыт, але ж выйсця не было: брат згадзіўся.

Пра што ён там думаў, едучы ў аўтобусе, ужо няважна. Важна, што выгоды ў той кватэры (цеснай, з брудными шпалерамі...) сапраўды былі, пакой з двума ложкамі таксама. На адным ужо нехта ляжаў. Мужык, дзякуй Богу. Пазнаёміліся, брат са свайго «дыпламата» дастаў сабраны жонкай перакус — павячэралі, лягці спаць. Праўда, сон быў кароткі, бо іх пабудзіла... міліцыя. Яна даўно, відаць, падазравала гаспадара ў атрыманні непрацоўных прыбыткаў, а тут, як кажуць, злавіла за руку: у начлежнікаў (што мала прыемнага) праверылі документы, учынілі сапраўдны допыт.

Але ж куды большы жах брат перажыў потым, калі раніцой прывёў сябе ў парадак і зноў пайшоў па кабінетах.

У чарговым, нясмела зайшоўшы, сеў на краёк высокага крэсла, сказаў хто ён і адкуль, па якім пытанні. Чыноўнік уважліва выслухаў яго, здаецца, усё зразумеў, папрасіў паказаць паперы. Брат падхапіў з падлогі партфель («дыпламат»), паклаў сабе на калені, адчыніў і, бядак, як не струпянеў: там было аж цёмна, там кішма кішэлі... тараканы.

Што было рабіць? Брат тут жа апусціў крышку дыпламата, хуценька ўстаў, папрасіў прабачэння, сказаў, што на хвільку выйдзе.

А далей куды? Ногі самі панеслі ў бок прыбіральні, дзе, зачыніўшыся ў кабінцы, стаў вытрасаць «кватарантаў» са сваіх папер, з пакупак, з брытвы, з пакетаў, у якіх што-кольвек яшчэ заставалася, каб з'есці па дарозе назад...

Што цікава, казаў, тараканы, апынуўшыся на светлай бліскучай падлозе, замаралі хіба на міг, і тут жа знаходзілі дзірачкі.

Брату, як чалавеку прыстойнаму, вядома ж, сорамна было, што прынёс іх, што выпусціў, але ж іншага выйсця ён проста не меў, бо праз хвіліну павінен быў вярнуцца ў кабінет, падпісаць паперы.

...Карацей, пасля гэтай паездкі брат перастаў зайздросціць забеспячэнцам, у камандзіроўкі выязджаў неахвотна і перад гэтым узяў за правіла абавязкова тэлефанаваць у названую гасцініцу, каб упэўніцца, што начлегу шукаць не прыйдзецца.

Г. В.,

г. Бабруйск.

НЕ ЎСЁ ПРЫГОЖАЕ СМАЧНА

Практычныя навыкі па ваджэнні баявой тэхнікі я ў свой час атрымаў на танкадроме пад Барысавам. Але ж помніцца не столькі гэта.

Неяк мяне і яшчэ аднаго механіка-вадзіцеля Джалымбекава — казаха па нацыянальнасці — выклікаў камандзір вучэбнай роты капітан Пінчук, па-сяброўску сказаў:

— Хлопцы, танкі вы водзіце добра, малайцы, ужо навучыліся. Таму зараз схадзіце на кухню, вазьміце там па вядры і гайда ў лес. Заўтра камандзір нашай дывізіі адзначае дзень народзінаў. Яго жонка хоча, каб на стале была яго любімая страва — грыбы. Так што ў 20.00 чакаю вас ля сталовай.

Бор ад нас быў зусім недалёка — у нейкім кіламетры. Мой напарнік быў у ім першы раз у жыцці, таму, трапіўшы, стаў з цікавасцю разглядацца, мацаць рукамі ўсё, што расло і ці не ўсё, што рухалася... Мне таксама карцела пабыць аднаму, і мы разышліся. А што — гадзіннікі ў абодвух меліся, а заблудзіцца там было немагчыма — танкі пачуў бы за пяць кіламетраў...

Але ўжо на першым стала відавочным іншае — грыбоў тут мы не назбіраем: ліпеньская спёка высушыла зямлю настолькі, што пажоўкла трава...

Затое ў адным месцы, у нізінцы, я натрапіў на чарніцы — буйныя, салодкія... Забыўшыся пра ўсё на свеце, я еў іх жменя за жменяй.

Карацей, у прызначаны час я асабіста вынес з лесу прыгаршчы сыраежак ды падсохлых лісічак, поўнае пуза і чорны ад ягад шчаслівы твар.

Паказаўся з лесу і Джалымбекаў. Сэрца маё ёкнула ад нядобрага прадчування: яго поўнае пад ручку вядро было відаць здалёку. Але ж, калі ён падышоў бліжэй, я прыкусіў губу, каб не рассмяяцца: грыбы — спрэс — былі неядомыя, у асноўным — мухаморы. Што зразумела, бо адкуль Джалымбекаву, дзіцяці казахстанскіх стэпаў, ведаць, што імі, такімі прыгожымі, можна атруціцца...

Іншымі словамі, загад камандзіра мы не выканалі, таму да ваджэння танкаў капітан Пінчук нас больш не падпускаў: зранку да адбою мы з Джалымбекавым «драілі» тэхніку.

Л.А. МІШУЦІН,

г. Пінск.

КУКІШ ДЛЯ ПАДМАНШЧЫКА

Дзіву даешся, колькі цяпер махляроў. То яны некаму сказалі, што на сям'ю насланы праклён і псота, то «афіцыйна» паведамілі чалавеку, што ён нешта істотнае выйграў, то пад выглядам распродажу прынеслі ў дом «каштоўны» тавар, то зайшлі ў кватэру пад выглядам сацыяльных работнікаў або камунальнікаў... А мэта адна — пажывіцца, выманіць, выцягнуць грошы. Тым больш што гэта і не так складана, бо народ наш даверлівы, не ўмее, як казаў Шолахаўскі дзед Шчукар, «даць адлуп» прайдзісветам.

У адрозненне ад майго сябра.

...Адразу пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС малых дзяцей разам з матулямі вывезлі з нашага Хойніцкага раёна, рассялілі па санаторыях, дамах адпачынку — па ўсёй краіне.

Мы з аднавяскоўцам месяцы праз два пасля гэтага засумавалі па сваіх, выбраліся ў няблізкую дарогу. Дабраліся неяк да Віцебска, стаім там на прывакзальнай плошчы ў чаканні аўтобуса на славутыя Лётцы, мярзнем, бо ў Хойніках зранку было цяплей, чым у Віцебску ўдзень. Сябар мой (у лёгкай тэнісцы) ад холаду згорбіўся, засунуў рукі ў кішэні. Я ж згледзеў, што непадалёк зусім прадаюць гарачыя піражкі і вырашыў «пагрэцца» імі. Толькі рушыў, да сябра — бачу — падыходзіць цыганка, нешта гаворыць. Ну, думаю, трэба ісці назад — аблапошыць... Але ж не — хуценька падышла яна, хуценька адышла: я не паспеў нават піражкоў купіць. Вяртаюся да сябра, пытаю:

— Чаго яна хацела?

— Ды, як заведзена, сказала, што псота на мне, — смяецца той. — Падрадзілася зняць...

— А ты што?

— Я для пачатку папытаўся, ці ўмее яна варажыць. Яна аж падскочыла ад радасці: «Яшчэ ж як!» — кажа. Ну дык я ёй першае заданне даў: «Скажы, у якой кішэні я фігу трымаю?..» То, бач, мусіць, пабаялася, што не ўгадае, што памыліцца — адышлася...

Мы ж, уволю пасмяяўшыся, у хуткім часе ад'ехалі. Аднак досвед свайго спадарожніка наконт фігі я ўзяў на ўзбраенне сам і настойліва раіў бы іншым. Глядзіш, і паменее ў нас ахвотнікаў пажывіцца за чужы кошт.

В.М. ГАЎРЫШ,

г. Чавусы.

ХТО КАГО?

Гэтую гісторыю мне распавядаў мой тата. Усё жыццё ён працаваў галоўным аграномам у эксперыментальнай базе. Праца, як вы разумееце, вымагала шмат ведаў, часу, нерваў, яна ж патрабавала пільнага назірання за зямлёй, за прыродай, аднак ён спраўляўся.

Зрэшты, гаворка не пра тое. Не ведаю, як дзе, а ў нас, на Гродзеншчыне, ёсць прыкмета: калі ўвесну першы раз пачуеш зязюлю і ў той момант у кішэні ў цябе будуць грошы, то мець іх будзеш цэлы год. І наадварот, калі зязюля закукуе, а ў кішэні пуста, то ўвесь год будзеш сточваць канцы з канцамі.

Ну дык вось, з года ў год тату майму катастрафічна не шанцавала: як зязюля ні закукуе — грошай няма. Прычым — ні ў той момант, ні потым...

Збрыдзела яму гэта, і таму пра зязюлю ён прыняў цвёрдае рашэнне: ну ўсё, досыць, у гэтую вясну знянацку ты мяне не застанеш!

З самага пачатку сакавіка бацька стаў рыхтавацца. Падрыхтоўка гэта складалася ў тым, што ва ўсе свае кішэні — у куртцы, у штанах, у сарочках — ён паклаў хоць па некалькі медзякоў. І перш чым выходзіць з хаты — куды б ні ішоў і ні ехаў — заўсёды праверыць, ці на месцы ж грошы?

А зязюля, як на здзек, кукаваць у той год не спяшалася: сакавік прайшоў, красавік, май настаў, — ціха. «Нічога, — думае тата, — я цярплівы, я дачакаюся». І ўсё грошы ў кішэнях мацае, бо ёсць жа!

Але аднойчы ён прачнуўся на золаку, патрэба ўзнікла — не сказаць каб вялікая, але ж дужа неадкладная: апранацца не было калі. У адных трусах ён выскачыў у двор. Толькі прыпыніўся, чуе: «Ку-ку, ку-ку».

Праўда, на гэты раз тата не пакрыўдзіўся. Ён зарагатаў і сам сказаў сабе: «Не жыў багата, і пачынаць не варта».

А. МАРЦУЛЬ,

в. Рэзы Шчучынскі раён.

P.S. *Некалі паказка была «Што ні край, то звычай». Цяпер кажуць, што ў кожнай мясцовасці (установе, галаве...) паказаны. Можа, тараканы. Можа, з лёгкай рукі майго брата?*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

НА МОГІЛКАХ МІНСКА ЎСТАЛЁЎВАЮЦЬ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭРМІНАЛЫ

Інфармацыйныя тэрміналы з'явіліся на могілках «Усходнія», «Заходнія» і «Вайсковыя». Яны дапамагаюць наведнікам зарыентавацца на тэрыторыі могілак і адшукаць месцы пахаванняў. Для гэтага трэба набраць на клавіятуры прозвішча пахаванага, і на маніторы высвецяцца дата пахавання, нумары ўчастка і магілы, а таксама маршрутная схема. У базу звестак не ўнесеныя толькі некаторыя старыя пахаванні, звесткі пра якія страчаныя.

Як паведаміў намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце УП «Спецкамбінат камунальна-бытавога абслугоўвання» Сяргей Тур, да канца 2011 года тэрміналы будуць усталяваныя таксама на могілках «Міханавічы», «Калодзішчы», «Кальварыйскія», «Паўночныя» і «Чыжоўскія». За кожным з іх адміністрацыйна замацаваныя некропалі паменш, так што з дапамогай тэрміналаў можна будзе знайсці інфармацыю аб пахаваннях на ўсіх 23 могілках Мінска.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,

«Мінск—Навіны».

Кватэрнае пытанне

Прыватызацыя не забаронена

Мы, муж і жонка, пенсіянеры, жывём на ўмовах дагавора найму ў старым драўляным доме. Ці можам мы прыватызаваць яго і на якіх умовах?

І. З., *Столінскі р-н.*

Дзейныя нарматыўныя дакументы па прыватызацыі дзяржаўнага жыллёвага фонду не ўтрымліваюць забароны на перадачу грамадзянам ва ўласнасць аднапавярховых драўляных жылых дамоў з вялікім фактычным зносам, якія яны займаюць на ўмовах дагавора найму.

Больш за тое, пунктам 12 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» вызначана, што займаемыя грамадзянамі Рэспублікі Беларусь жылыя памяшканні ў аднаквартэрных, блакіраваных жылых дамах, якія маюць не больш як адзін надземны паверх, перадаюцца ім бязвыплатна (з улікам жыллёвай квоты, сумы квот) пры зносе іх на 60 % і вышэй. Прычым названыя жылыя памяшканні перадаюцца ва ўласнасць бязвыплатна незалежна ад памеру іх агульнай плошчы.

Для набыцця ва ўласнасць жылога памяшкання, якое займае найменшы, поўнагадовыя члены яго сям'і, а таксама іншыя грамадзяне, за якімі ў адпаведнасці з заканадаўствам захоўваецца роўнае з наймальнікам права карыстання гэтым жылым памяшканнем, падаюць заяву аб прыватызацыі ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган альбо ў орган кіравання юрыдычнай асобы, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якога знаходзіцца жылое памяшканне.

Віктар САВІЦКІ.

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

(8 017) 287 19 68

АБ ЧЛЕНСКІХ УЗНОСАХ І ЛЬГОТАХ

У мяне пытанне, ці распаўсюджваецца Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб ільготах інвалідам другой групы па агульным захворванні па аплаце ўзносаў за прыватызаваны гараж. Кааператыў ажыццяўляе ахову гаража.

П.П., *Смалявіцкі раён*

У сваім лісце вы не называеце нумар або назву Указа, на які спасылаецеся. Магчыма, вы маеце на ўвазе Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.09.2009 г. № 458 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе» ці Закон Рэспублікі Беларусь ад 14.06.2007 г. «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян». Названымі Указам і Законам не прадугледжваецца прадастаўленне льгот па аплаце ўзносаў, звязаных са знаходжаннем у складзе гаражных кааператываў — як інвалідам, так і іншым катэгорыям грамадзян.

Ёсць яшчэ Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 года № 43, якім зацверджана Палажэнне аб стварэнні і дзейнасці гаражных кааператываў і кааператываў, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак.

Гэтым Указам і зацверджаным ім Палажэннем таксама не прадугледжваецца прадастаўленне інвалідам і іншым катэгорыям грамадзян такіх ільгот. У адпаведнасці з пунктам 43 названага Палажэння вызначэнне памераў і тэрмінаў унясення уступных, паявых (пры фінансаванні будаўніцтва самім кааператывам), членскіх, мэтавых і дадатковых узносаў аднесена да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу гаражнага кааператыва.

Што ўяўляюць сабой гэтыя ўзносы? У Палажэнні гэтаму даецца азначэнне. Так, уступны ўзнос, згодна з Палажэннем, — гэта грашовая сума, якая ўносіцца пры ўступленні ў члены кааператыва і накіроўваецца на пакрыццё расходаў, звязаных з яго дзейнасцю.

Паявы ўзнос — сума, якая ўносіцца членам кааператыва адначасова або перыядычна на фінансаванне будаўніцтва гаража або аўтастаянкі, калі будаўніцтва ажыццяўляецца самім кааператывам.

Членскі ўзнос — сума, якую перыядычна ўносіць член кааператыва на мэты, звязаныя з ажыццяўленнем дзейнасці кааператыва, у тым ліку на аплату працы штатных работнікаў, узнагароджанне членаў праўлення, рэвізійнай камісіі і на іншыя патрэбы.

Мэтавы ўзнос — сума, якая ўносіцца членам кааператыва на падставе рашэння агульнага сходу членаў кааператыва або сходу ўпаўнаважаных для дадатковага фінансавання рамонтна-гаспадарчых работ, а таксама мерапрыемстваў, зацверджаных гэтым сходам.

Дадатковы ўзнос — сума, якая ўносіцца членам кааператыва на пакрыццё страт кааператыва.

Паколькі ваш кааператыў, напэўна, ужо дзейнічае, а не ў стадыі будаўніцтва, то, мяркую, што вы б хацелі атрымаць ільготу на выплату членскіх узносаў, бо ўступны і паявы ўзносы вамі даўно выплачаны. Таксама вас як члена кааператыва могуць, пры ўзнікненні ў тым неабходнасці, абавязаць заплаціць мэтавы і дадатковы ўзносы.

Вышэйшым органам кіравання кааператыва з'яўляецца агульны сход яго членаў. Згодна з пунктам 38 Палажэння, агульны сход склікаецца праўленнем па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў год.

Паколькі нормы Палажэння дазваляюць зрабіць выснову, што прадастаўленне льгот па выплаце ўзносаў адносіцца да кампетэнцыі агульнага сходу кааператыва, то сваё пытанне вам неабходна вынесці на разгляд сходу. Для гэтага вы можаце звярнуцца з заявай да праўлення кааператыва аб уключэнні вашага пытання аб прадастаўленні льгот па выплаце ўзносаў (членскіх, мэтавых і дадатковых) у парадак дня чарговага агульнага сходу кааператыва.

ЗАВЕРЕНО
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
_____А.Л.Гальперин
26.11.2010

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием Участников
КСО «Внешэкономстрой» ООО
29 октября 2010 года
(протокол № 26)

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже жилищных облигаций четвертого, пятого, шестого, седьмого, восьмого, девятого и десятого выпусков

Коммерческой совместной организации «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (КСО «Внешэкономстрой» ООО)

Раздел 1. Общие сведения об эмитенте

1. Наименование эмитента.

На белорусском языке:

полное наименование: Камерцыйная сумесная арганізацыя «Знешэканомбуд» таварыства з абмежаванай адказнасцю;

сокращенное наименование: КСА «Знешэканомбуд» ТАА.

На русском языке:

полное наименование: Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (далее по тексту – эмитент);

сокращенное наименование: КСО «Внешэкономстрой» ООО.

2. Место нахождения эмитента: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А; **телефон**: (017) 218 15 56; **факс**: (017) 218 15 55; **электронный адрес (e-mail):** market@vnesheconomstroy.by.

3. Основной вид деятельности эмитента:

согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006

701 – Операции с собственным недвижимым имуществом.

Эмитент вправе осуществлять функции заказчика (застройщика) согласно «Инструкции о застройщике, заказчике в строительстве», утвержденной приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь 22 июня 1999 г. № 174 (с учетом изменений в действующей редакции).

4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка: р/с № 3012004529008 в ОАО «Белвнешэкономбанк», г. Минск, ул. Мясникова, 32, код 226.

5. Бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном пунктом 9 Инструкции о порядке представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг, утвержденной постановлением Комитета по ценным бумагам при Совете Министров Республики Беларусь от 16 декабря 2005 г. № 10/П «О некоторых вопросах представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг», **в соответствии с законодательством в периодическом печатном издании не публиковалась и ее опубликование не требуется.**

6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента: Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» (далее по тексту – депозитарий).

Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, ком. 607. Зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный номер 24.

Специальное разрешение (**лицензия**) № 02200/0247744 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выдано (продлена) Министерством финансов Республики Беларусь депозитарию на основании решения от 13 июля 2007 года № 243 сроком на 5 лет и действительно до 29 июля 2012 года.

7. Размер уставного фонда эмитента: 1 197 275 (Один миллион сто девяносто семь тысяч двести семьдесят пять) долларов США (уставный фонд сформирован в размере 100 %).

8. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование органа, его зарегистрировавшего.

Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь 15 августа 2002 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800015707.

9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.

Ознакомиться с Проспектом эмиссии облигаций можно ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:

- в КСО «Внешэкономстрой» ООО по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А;
- в ОАО «Белвнешэкономбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

10. Решение о выпуске жилищных облигаций четвертого, пятого, шестого, седьмого, восьмого, девятого и десятого выпусков принято 29.10.2010 года на внеочередном Общем собрании Участников (**протокол № 26**).

11. Объем эмиссии жилищных облигаций составляет:

четвертого выпуска – 731 250 000 (Семьсот тридцать один миллион двести пятьдесят тысяч) белорусских рублей;

пятого выпуска – 705 636 750 (Семьсот пять миллионов шестьсот тридцать шесть тысяч семьсот пятьдесят) белорусских рублей;

шестого выпуска – 1 161 382 950 (Один миллиард сто шестьдесят один миллион триста восемьдесят две тысячи девятьсот пятьдесят) белорусских рублей;

седьмого выпуска – 688 591 800 (Шестьсот восемьдесят восемь миллионов пятьсот девяносто одна тысяча восемьсот) белорусских рублей;

восьмого выпуска – 5 267 176 200 (Пять миллиардов двести шестьдесят семь миллионов сто семьдесят шесть тысяч двести) белорусских рублей;

девятого выпуска – 436 390 000 (Четыреста тридцать шесть миллионов триста девяносто тысяч) белорусских рублей;

десятого выпуска – 2 969 070 000 (Два миллиарда девятьсот шестьдесят девять миллионов семьдесят тысяч) белорусских рублей.

Количество жилищных облигаций:

четвертого выпуска – 125 (Сто двадцать пять) штук;

пятого выпуска – 98 (девяноста восемь) штук;

шестого выпуска – 158 (Сто пятьдесят восемь) штук;

седьмого выпуска – 102 (Сто две) штуки;

восьмого выпуска – 627 (Шестьсот двадцать семь) штук;

девятого выпуска – 85 (Восемьдесят пять) штук;

десятого выпуска – 331 (Триста тридцать одна) штука.

12. Номинальная стоимость одной жилищной облигации:

четвертого выпуска – 5 850 000 (Пять миллионов восемьсот пятьдесят тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 2-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

пятого выпуска – 7 200 375 (Семь миллионов двести тысяч триста семьдесят пять) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 7-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

шестого выпуска – 7 350 525 (Семь миллионов триста пятьдесят тысяч пятьсот двадцать пять) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 8-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

седьмого выпуска – 6 750 900 (Шесть миллионов семьсот пятьдесят тысяч девятьсот) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 4-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

восьмого выпуска – 8 400 600 (Восемь миллионов четыреста тысяч шестьсот) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 11-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

девятого выпуска – 5 134 000 (Пять миллионов сто тридцать четыре тысячи) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира № 214, 17 эт., 2-я секция) в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске;

десятого выпуска – 8 970 000 (Восемь миллионов девятьсот семьдесят тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 12-ой категории по проспекту Победителей, 27 в г. Минске).

13. Открытая продажа (размещение) жилищных облигаций проводится **с 1 декабря 2010** года **по 23 марта 2012 года**.

14. Срок обращения облигаций с 1 декабря 2010 года по 31 марта 2012 года включительно (487 календарных дней).

15. Проведение открытой продажи (размещения) жилищных облигаций осуществляется ОАО «Белвнешэкономбанк» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

16. Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 26 ноября 2010 года.

Регистрационный номер: № 5-200-02-0858 (4-й выпуск).
Регистрационный номер: № 5-200-02-0859 (5-й выпуск).
Регистрационный номер: № 5-200-02-0860 (6-й выпуск).
Регистрационный номер: № 5-200-02-0861 (7-й выпуск).
Регистрационный номер: № 5-200-02-0862 (8-й выпуск).
Регистрационный номер: № 5-200-02-0863 (9-й выпуск).
Регистрационный номер: № 5-200-02-0864 (10-й выпуск).

УНП 800015707.

БЕРАГ НАДЗЕІ

Апошняя з магікан павінна выжыць. Дапамажыце!

Насцю Навумаву з Рэчыцы я ведаю ўжо тры гады. Менавіта столькі яна лечыцца ў дзіцячым анкагематалагічным цэнтры ў Бараўлянах. Многіх нашых агульных сяброў ужо няма. Яна апошняя з магікан. І ёй патрэбна дапамога. А мы можам дапамагчы.

У 2007 годзе Насця неяк ударыла нагу. Праз некалькі месяцаў на гэтым месцы з'явілася пухліна. Паставілі дыягназ — альвеалярная рабдаміясаркома правай галёнкі, II стадыя. Дзяўчынка мужна перанесла дзевяць курсаў хіміятэрапіі, дзве аперацыі і курс прамянёвай тэрапіі. Амаль два гады яны з бабуляй пражылі ў анкацэнтры.

Мы звалі яе «хахатушкай». Насця заўсёды смяялася, весяліла ўсіх наўкол. Гледзячы на яе, хацелася жыць. Немагчыма было паверыць, што ў Насці баліць нага — яна, як Карлсан з маторыкам, лётала

БАТАРЭІ ХАЛОДНЫЯ, А Ў КВАТЭРЫ... ЦЁПЛА

Калі энергаэфектыўнае домабудаванне стане ў Беларусі не эксперыментам, а нормай?

Адзін з жыльцоў першага ў горадзе над Нёманам і другога ў рэспубліцы эксперыментальнага энергаэфектыўнага дома па вуліцы Дзяржынскага, 23 б нядаўна, калі ўключылі ацяпленне, запытаўся ў дырэктара інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Уладзіміра Дзяшко: « Што здарылася? Чаму батарэі халодныя? Можа, яны запаветрыліся? Але тады чаму ж у кватэры цёпла?»

Дырэктар інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Уладзімір ДЗЯШКО.

Ніякага збою ў сістэме цеплазабеспячэння няма, супакоіў жыльца Уладзімір Іосіфавіч. Батарэі, як прынята лічыць у падобных выпадках, не запаветрыліся, а былі, скажам так, адключаныя аўтаматыкай энергазберагальнай сістэмы, якая адказвае за падачу цяпла ў кватэру. У выніку цяпла паступае ні многа і ні мала, а менавіта столькі, колькі трэба для камфортнага пражывання. І пры гэтым гаспадары кватэры самі рэгулююць цеплавы рэжым у кожным з пакояў, ды і на кухні таксама. А значыць, рэальна ўплываюць на эканомію энергарэсурсаў, зацікаўленыя ў гэтым.

Але якім жа чынам у кватэры нармальная цеплавая сітуацыя пры халодных батарэях? Гэта мы патлумачым ніжэй. А цяпер адзначым, што такіх дамоў у Беларусі пакуль раз, два і ... Не проста мала — мізэр у маштабах краіны. І няўжо гэтага хопіць? Чаму энергаэфектыўнае домабудаванне, у адрозненне ад многіх еўрапейскіх краін, у нас так марудна прабівае сабе дарогу ў жыццё? Што патрабуецца для таго, каб дом па вуліцы Дзяржынскага быў у краіне не «экзотыкай», а нормай? І што рабіць з даўно існуючым, вельмі затратным па энергаспажыванні жылым фондам?

Свае меркаванні на гэты конт выказвае дырэктар інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Уладзімір ДЗЯШКО.

НАША ДАВЕДКА

Энергаэфектыўным прынята лічыць дом, дзе аптымізаваныя ўсе энергетычныя працэсы. Эфект эканоміі цяпла ў такіх будынках дазваляе хутка акупіць затраты на прымяненне энергазберагальных тэхналогій. Найбольшых поспехаў у гэтай справе дасягнулі краіны Заходняй Еўропы і Скандынавіі, дзе ўжо пройдзены этап першапачатковых распрацовак, доследнай эксплуатацыі і вядзецца практычна масавае будаўніцтва такіх стандартных будынкаў. На рынку ўжо дастаткова матэрыялаў і кампанентаў інжынерных сістэм для ўзвядзення энергаэфектыўных домаў, і па гэтай прычыне яны не надта даражэйшыя за звычайныя. Акрамя таго, у Даніі, Германіі, Фінляндыі і іншых еўрапейскіх краінах дзейнічаюць спецыяльныя мэтавыя дзяржаўныя праграмы па прывядзенні ўсіх аб'ектаў ранейшай забудовы да энергаэфектыўнага ўзроўню. Пры гэтым усяляк стымулююцца энергазберагальныя меры пры будаўніцтве і рэканструкцыі аб'ектаў.

У пяць-шэсць разоў менш

спажывае цеплавой энергіі ў параўнанні з асноўнай масай жылля ў рэспубліцы энергаэфектыўны дом па вуліцы Дзяржынскага, 23 б у Гродне. І прыкладна ў 2—2,5 раза менш, чым у сучаснай стандартнай забудове.

Ініцыятарам будаўніцтва гэтага 69-кватэрнага дома стаў інстытут «Гроднаграмадзянпраект». Прычым упершыню ў сваёй гісторыі інстытут, у сценах якога народжаныя дзясяткі праектаў жылых дамоў, прадпрыемстваў, школ і іншых аб'ектаў, узяў на сябе функцыі і генпраекціроўшчыка, і заказчыка, выступіўшы, па сутнасці, галоўным менеджарам у працэсе будаўніцтва — ад пачатку і да канца. Ды і жыльцы — гэта ў асноўным работнікі «Гроднаграмадзянпраекта», якія спасцігаюць новыя тэхналогіі домабудавання не толькі ў службовых кабінетах, але і ва ўласных кватэрах.

— Першы ў краіне энергазберагальны дом быў пабудаваны на вуліцы Прытыцкага ў Мінску. Мы многае там перанялі і ў цесным партнёрстве з рэспубліканскім прадпрыемствам «Інстытут НІПТІС імя Атаева» на чале з дырэктарам Уладзімірам Піліпенкам пайшлі далей, у кірунку яшчэ больш эфектыўнага цепласпажывання, — расказвае Уладзімір Дзяшко. — Тым больш што наш дом не з буйнапанэльных канструкцый, як у сталіцы, а з дробнаштучных сценавых матэрыялаў. Таму ў нас было больш магчымасцяў павялічыць тэрмічнае супраціўленне вонкавай сцяны будынка, што мы і зрабілі. Цепласпажыванне па доме, па нашых разліках, за першы год эксплуатацыі (дом здадзены летась у верасні) склала 39 кілават-гадзін на квадратны метр жылля. Такім чынам, тэарэтычныя распрацоўкі пацвердзіліся фактычным вынікам. Прычым трэба мець на ўвазе, што дом быў не зусім, як мы кажам, прасохлы і ўвесь мінулы асенне-зімовы перыяд доўжыліся «мокрыя» працэсы. Цяпер жа, пасля гадавой эксплуатацыі будынка, спякотнага лета вільготнасць у вонкавых сценах, ды і ва ўсіх загароджваючых канструкцыях стабілізавалася, і, спадзяёмся, гэтай зімой атрымаем яшчэ лепшыя вынікі. Разлічваем, што спажыванне цеплавой энергіі будзе ў межах 30 квт-г на квадратны метр у год. Гэта нават не сярэдні, а выдатны паказчык, на ўзроўні падобнага шматкватэрнага жылля ў Еўропе.

За кошт чаго «Гроднаграмадзянпраекту» гэтага ўдалося дасягнуць?

— Па-першае, у перыяд будаўніцтва прымянялі павышанае тэрмічнае супраціўленне агароджваючых канструкцый знадворных сцен, вокнаў, перакрыццяў, падвалаў, — тлумачыць Уладзімір Іосіфавіч. — Прычым дыферэнцыравана, каб цепласпажыванне не залежала ад выгаднага ці нявыгаднага размяшчэння кватэры — у тарцы альбо ўнутры дома, на верхнім ці ніжнім паверсе. Гэта фактар не толькі энергаэфектыўнасці, але і сацыяльнай справядлівасці, бо цяпер няважна, хто якое жэрабя перад засяленнем выцягнуў. Аплата за цяпло залежаць будзе не ад месцазнаходжання кватэры, а толькі ад плошчы.

Акрамя таго, у гэтым доме задзейнічалі рэкуперацыю. Менавіта рэкуператары «даюць адказ» на вышэйзгаданае пытанне аднаго з жыльцоў, чаму ў кватэры цёпла нават пры халодных батарэях.

НАША ДАВЕДКА

Рэкуператар — гэта механізм, які выконвае функцыю энергазберажэння. Дзякуючы яму халоднае паветра, якое падаецца ў памяшканне, награваецца за кошт цеплаабмену з адпрацаваным паветрам, якое адтуль выдаляецца.

— Рэкуперацыя дасць гадавую эканомію не менш за 30 кілават-гадзін на квадратны метр жылля, вяртаючы назад каля 80-85 працэнтаў цяпла, — зазначае Уладзімір Дзяшко. — Рэкуператары ўстаноўлены на лоджыі кожнай кватэры. Прычым сістэма рэкуперацыі зблакаваная з пакватэрным ацяпленнем. І ў выпадку, калі тэмпература ў кватэры павышаецца (дапусцім, тэмпература выдаляемага паветра складае 25 градусаў), аўтаматычна адключаецца сістэма ацяплення. І за справу падтрымання належнага цеплавога рэжыму бярэцца паветра, якое награецца пры дапамозе рэкуператара. Плюс сапраўдная асалода ад пастаянна свежага паветра, бо працуе механічная прымусовая вентыляцыя з яго фільтраваннем. Мала таго, устаноўленыя ў доме рэкуператары вельмі карысныя ў пераходны перыяд, калі ўжо халаднавата, аднак ацяпленне яшчэ не ўключана: ёсць паветраны электранагравальнік, які дазваляе падтрымліваць у кватэры камфортную тэмпературу.

А вось што думаюць на гэты конт самі жыхары, спецыялісты інстытута «Гроднаграмадзянпраект».

Валянціна САКАЛОВА, галоўны спецыяліст па электратэхніцы:

— Па месцы майго ранейшага пражывання, калі я 30 гадоў таму засялялася, снег ляжаў каля самага дома. А цяпер пры любых маразах снегу практычна няма: не толькі таму, што некалькі змяніўся клімат, але і па той прычыне, што нашы дамы больш за палову спажываемай энергіі губляюць у атмасферу. Іншая справа — у энергаэфектыўных будынках з сістэмай рэкуперацыі. Мая знаёмая летась устанавіла ў сваёй сматалагічнай паліклініцы рэкуператар і да 15 снежня... не ўключала ацяпленне. І ў нашым доме карысць відавочная. Асабліва мне падабаецца, што ёсць магчымасць самім уплываць на мікраклімат у кватэры.

Павел ШАФРАНОВІЧ, інжынер-цеплатэхнік, старшыня жыллёва-будаўнічага кааператыва ў доме па вуліцы Дзяржынскага, 23 б:

— У многіх дамах, калі надыходзіць восень і запускаецца ацяпленне, адбываецца перагрэў сістэмы. Адпаведна, адчыняюцца форткі і цяпло вылятае на вуліцу. У нашым жа доме, па-першае, вельмі добра працуюць агульнадамавыя рэгулятары цяпла — перагрэву ўжо няма. А па-другое, у кожнага жыхара ёсць магчымасць рэгуляваць падачу цяпла ў сваю кватэру і трымаць тэмпературу, якую захоча. Сістэма ацяплення працуе надзейна, збояў пакуль не было.

Вось, дарэчы, вынік праведзенага намі тэсціравання ў адной з кватэр. Тэмпература на вуліцы ў той момант была плюс 6 градусаў, у кватэры — плюс 22. А паветра з вуліцы за кошт утылізацыі цяпла паступала ў кватэру з тэмпературай плюс 20. Такім чынам, пры звычайным праветрыванні, адчыняючы фортку, мы страчваем 16 градусаў цяпла, а ў нашым выпадку — толькі 2.

Алег ГРУШЭВІЧ, інжынер-праекціроўшчык:

— Вулічнае паветра не заўсёды падыходзіць для кватэры. Яно можа быць, як гэтым летам, занадта гарачым, альбо, калі зіма суровая, — вельмі халодным. А рэкуператар робіць паветра заўсёды аптымальным: пры высокай тэмпературы — ахалоджваецца, пры халодным надвор'і — можа награвацца. У любым выпадку паветра заўсёды камфортнае, свежае і няма патрэбы перыядычна адчыняць вокны. Акрамя таго, паколькі пастаянна працуе механічная вентыляцыя паветра, практычна выключана магчымасць кандэнсацыі вільгаці і з'яўлення цвілі на сценах, што сёння носіць масавы характар. Пры гэтым я ў сваёй кватэры рэгулюю падачу цяпла ў кожнае памяшканне. Напрыклад, у дзіцячым пакоі рэгулятар працуе на больш высокую тэмпературу, у кухні — на больш нізкую.

Максім ЗІНАВЕЦКІ, кіраўнік групы ў аддзеле геадэзіі:

— Цяпер для нашай сям'і, бадай, галоўны плюс — гэта заўсёды свежае паветра ў кватэры (колькі б людзей там ні знаходзілася), недахоп якога адчуваўся, калі жылі ў інтэрнаце. А значыць, рэкуперацыя працуе не толькі на эканомію энергарэсурсаў, але і на аздараўленне чалавека.

Вельмі станоўчыя ўражанні ад энергаэфектыўнага дома і ў першага **намесніка старшыні Гродзенскага гарвыканкама Аляксандра ЦЫБУЛЬНІКАВА.** Пры гэтым ёсць рэальныя магчымасці скараціць розніцу паміж коштам квадратнага метра ў такіх дамах і стандартных.

Трэба падтрымаць забудоўшчыкаў энергаэфектыўнага жылля

У мінулым годзе была прынята пастанова ўрада Беларусі аб будаўніцтве энергаэфектыўнага жылля. Аднак сур'ёзнасць гэтай праблемы, якая напрамую звязана не толькі з камфортным пражываннем канкрэтных людзей, але і з энергетычнай бяспекай краіны, на думку Уладзіміра Дзяшко, пакуль яшчэ ў нашым грамадстве не ўсвядомлена. Мы працягваем будаваць даволі затратныя ў энергетычным плане будынкі, хоць ужо ёсць вопыт не толькі Заходняй Еўропы, але і ўласны.

— Што трэба зрабіць, каб такія дамы, як на вуліцы Дзяржынскага ў Гродне, былі не спецыяльнымі, эксперыментальнымі, а сталі нормай, будаваліся ў масавым парадку? Патрэбен заказ, — лічыць Уладзімір Дзяшко. — Той скептычны настрой у дачыненні да энергаэфектыўнага домабудавання, які быў у некаторых спецыялістаў, у тым ліку будаўнічага профілю, і тых, хто працуе ў сістэме заказчыкаў, сёння ўжо, мабыць, сышоў на нуль. За год эксплуатацыі нашага дома жыльцы пераканаліся, што ўсё нармальна, энергазберагальнае абсталяванне працуе надзейна. І ўсе, ад каго залежыць развіццё гэтай справы на будаўнічым рынку, павінны пераканацца. Таму трэба даваць заказы праекціроўшчыкам. Вядома, такія дамы пакуль што трохі даражэйшыя. Рэкуперацыя на сённяшні дзень павялічвае кошт квадратнага метра жылля на 6-7 працэнтаў, альбо на 130 тысяч рублёў. І з-за гэтага ўсё тармозіцца.

Аднак у інстытуце «Гроднаграмадзянпраект» падлічылі, што за кошт зэканомленага цяпла (пры ўзроўні сусветных цэн на газ) гэтае ўдараджанне можна акупіць за 6-7 гадоў. І пры гэтым трэба памятаць, што да 80 працэнтаў (у залежнасці ад раёна) цяперашняга кошту цеплавой энергіі цяпловырабляючым прадпрыемствам датуецца дзяржавай.

— Дык, можа, трэба накіраваць гэтыя датацыі адразу ў выглядзе дапамогі на тую ж рэкуперацыю, а не спальваць лішняе паліва, не браць лішнія кубаметры газу ў Расіі, не перапампоўваць лішнія тоны вады па трубах? Ці, можа, варта скарыстацца вопытам Масквы, дзе для зацікаўленасці жыльцоў у будаўніцтве энергаэфектыўных дамоў іх на пяць гадоў вызваляюць ад аплаты камунальных паслуг? — разважае Уладзімір Дзяшко.

Даволі значны рэзерв скарачэння кошту энергаэфектыўных будынкаў — у кошце адпаведнага абсталявання.

— Сённяшні дзень камплектуючыя і для рэкуператара, і для вузла кіравання сістэмай ацяплення ў асноўным імпартныя — Швецыя, Германія, Расія, Кітай, — зазначае Уладзімір Дзяшко. — Каб выканаць задачу будаўніцтва ў краіне 10 мільёнаў квадратных метраў жылля ў год, — а неабходна будаваць толькі ў энергаэфектыўным выкананні, — нам трэба будзе мець 100 — 120 тысяч рэкуператараў. І ў Беларусі дастаткова прадпрыемстваў, дзе можна асвоіць, паставіць на паток і іх масавую вытворчасць, і іншых камплектуючых. Тады энергазберагальнае абсталяванне будзе ў разы таннейшае, чым у нашым доме.

Пры сусветных цэнах на газ тэрмашуба будынкаў акупляецца за адзін — два гады

— Мы будуем каля 7 мільёнаў квадратных метраў жылля. А на абслугоўванні ў камунальшчыкаў цяпер больш за 100 мільёнаў квадратных метраў старога жыллёвага фонду, які пры сучасных падыходах да энергазбярожэння не вытрымлівае ніякай крытыкі, — лічыць Уладзімір Дзяшко. — Маштабы гэтай праблемы мы ў інстытуце не бачылі, пакуль не набылі цеплавізар, з дапамогай якога мінулай зімой вывучылі сітуацыю са стратамі цяпла ў жылых дамах, пабудаваных за апошнія 50 гадоў. Вынік проста шакіруючы. У параўнанні з дамамі, пабудаванымі па нормах 2006 года, цепластраты праз сцяну ў старых цагляных будынках у чатыры разы большыя. А панэльныя дамы 116-й серыі страчваюць яшчэ больш. Гэта азначае страты 200 кілават-гадзін альбо 0,17 Гкал энергіі за ацяпляльны сезон праз адзін квадратны метр сцяны. Сапраўды, як кажуць у народзе, грэем вуліцу. І таму першачарговая задача — масава займацца цеплавой рэабілітацыяй усяго жылога фонду. І не толькі жылля, але і аб'ектаў аховы здароўя, дзіцячых садкоў, школ, бытавых карпусоў прамысловых прадпрыемстваў і іншых.

Згодна з разлікамі інстытута «Гроднаграмадзянпраект», тэрмашуба будынкаў у горадзе над Нёманам акупляецца за тры — пяць гадоў. Аднак калі ўлічыць сусветныя цэны на газ, то яна акупіцца ўжо за адзін-два гады! Такога жылля толькі ў Гродне 5 мільёнаў квадратных метраў, і шляхам іх цеплааховаы можна зэканоміць да 450 тысяч Гкал энергіі, што раўнацэнна расходу 65 мільёнаў кубаметраў газу. Гэта, падкрэслім, толькі ў адным з абласных цэнтраў. А па краіне ў цэлым?

— У рамках падрыхтоўкі да Усебеларускага народнага сходу ўношу такую прапанову, — гаворыць Уладзімір Дзяшко. — Калі мы ўжо падышлі з новым жыллём да чаргі 2007 года, то ці не больш мэтазгодна спыніцца на дасягнутых тэмпах, а ўкладанні капіталу і ўсе намаганні накіраваць на цеплаабарону існуючага жылога фонду? І, разам з гэтым, другое пытанне: можа, датацыі насельніцтву і камунальным службам лепш накіроўваць зноў жа на ўцяпленне жылля? Бо тэрмін акупляльнасці атрымліваецца ніжэй за нарматыў у два-чатыры разы! Дарэчы, рэкуперацыю можна прымяніць і для старых будынкаў. Мяркую, там рэкуператары проста абавязковыя, асабліва калі праводзіцца капітальны рамонт дома.

Дарэчы, цеплаахова старых будынкаў можа быць таксама, як і будаўніцтва энергаэфектыўных будынкаў, больш таннай, лічыць Уладзімір Дзяшко:

— Пакуль мы выкарыстоўваем для вытворчасці ненапласту сыравіну расійскую альбо ўкраінскую, расходуем валюту. А навошта? Адзін кампанент можа быць выраблены на гродзенскім «Азоце», другі, са спальваемых адходаў вытворчасці — на магілёўскім прадпрыемстве «Хімвалакно». Аднак справа стаіць на месцы.

...Тым часам інжынерная служба інстытута «Гроднаграмадзянпраект» рыхтуецца да будаўніцтва другога энергаэфектыўнага дома — зноў жа ў якасці не толькі праекціроўшчыка, але і заказчыка. Ужо на 120 кватэр, прычым не толькі для сваіх супрацоўнікаў, але і іншых гараджан. Уладзімір Дзяшко не сумняваецца, што з улікам ужо набытага вопыту другі дом па пытаннях энергаэфектыўнасці пераўзыдзе першы. У прыватнасці, яшчэ больш удасканаліць канструкцыю сцен, каб мінімізаваць цеплавыя страты. Верагодна, задзейнічаюць і яшчэ больш эфектыўныя рэкуператары, ды і іншыя тэхнічныя рашэнні.

Хто, дзе, калі і ў якіх маштабах падтрымае гродзенцаў?

Уладзімір ЛОГАШ, інжынер-будаўнік, у мінулым — загадчык аддзела будаўніцтва Гродзенскага абкама КПБ, Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

Павел Шафрановіч рэгулюе падачу цяпла ў сваю кватэру.

Фокус

46 гадоў пад цэнзурай. Арыгінал культавай «Ладдзі Роспачы» прэзентаваны на радзіме

Прэм'ера кнігі Караткевіча адбылася ў Рагачове. Менавіта ў гэтым горадзе жыў галоўны герой навелы — Гервасій Выліваха. Тут, у дзедавай хаце, Караткевіч стварaў твор.

Першая прэзентацыя «Ладдзі Роспачы» прайшла ў Рагачоўскім педагагічным каледжы. Перад будучымі настаўнікамі, якія будуць вучыць нашых дзяцей. Другая — у гарадской гімназіі Рагачова.

У імпрэзах прымалі ўдзел спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб Лабадзенка, які і вярнуў у беларускую літаратуру нецэнзураваную «Ладдзю Роспачы», музыка Зміцер Вайцюшкевіч, прадстаўнікі ўлады. Дзеці паставілі арыгінальную тэатралізаваную пастаноўку: праілюстравалі на сцэне інтэрв'ю з Уладзімірам Караткевічам, чыталі вершы класіка ў сучаснай манеры.

Чаму гэтая сціплая прэзентацыя выклікала такую ўвагу? Чаму я і іншыя зацікаўленыя людзі кінулі ўсе справы і паехалі ў Рагачоў?

Таму што навела «Ладдзя Роспачы» — асаблівая, у ёй закладзена наша нацыянальная ідэя: шчырая любоў да Беларусі і яе мовы, адвага, каханне і байцоўскі дух сапраўднага беларуса. Гэта прарочы пасыл Уладзіміра Караткевіча ўсім нам.

Гервасій Выліваха, герой навелы, — не мужык у лапцях, якому наканавана спрадвечная беларуская «горкая доля», а годны шляхціц, які ўратуўвае свой народ ад гібелі, абхітрыўшы Смерць...

Калі хто не ведае, нагадаю. Твор быў напісаны ў 1964 годзе. Незадоўга да гэтага, у 50-х, была праведзена так званая «рэформа беларускага правапісу», калі нашу мову штучна наблізілі да рускай. У тыя часы ўсё беларускае, мякка кажучы, не віталася. Тым не менш Уладзімір Караткевіч не пабаяўся напісаць «Ладдзю Роспачы».

Але ў 1968 годзе найперш выйшла рускамоўная версія навелы (у перакладзе славутага Васіля Сёмухі), і толькі ў 1978-м — беларускамоўная. У двух варыянтах, на 23 старонках рукапісу, было зроблена аж... 296 цэнзарска-рэдактарскіх правак! Філасофская глыбіня, якая набліжае навелу да твораў сусветнага эшалону, была бяздарна спрошчана цэнзарамі.

І вось у 2009 годзе спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб Лабадзенка атрымаў арыгінальны рукапіс «Ладдзі Роспачы» і выкрыў цэнзарскія праўкі. Пра гэта «Звязда» падрабязна напісала ў нумары за 26 лістапада.

Грошы на выданне кнігі ахвяравалі неабыякавыя беларусы, значную частку накладу мусіць закупіць бібліятэчная сістэма краіны...

Аднак у самім Рагачове яшчэ год таму не было, лічы, ніводнай згадкі пра Караткевіча. Крытычны матэрыял быў надрукаваны ў «Звяздзе» мінулай восенню. На артыкул адрэагавалі і мясцовыя ўлады, і простыя грамадзяне. З таго часу ў Рагачове шмат што змянілася ў станоўчы бок. Вуліцу Чкалава (на ёй і сёння стаіць хата, дзе класік стварыў «Ладдзю Роспачы») пераназвалі ў вуліцу Караткевіча. А звычайныя грамадзяне праз блог Глеба Лабадзенкі (www.labadzenka.by) сабралі грошы на гранітны помнік, які ўсталявалі на магіле бабулі Уладзіміра Караткевіча.

У часе прэзентацыі нецэнзураванай «Ладдзі Роспачы» ў Рагачоўскай гімназіі **намеснік старшыні райвыканкама Васіль КАРАЛЬЧУК** паведаміў пра тое, што да Новага года каля дзедаўскай хаты Караткевіча будзе ўсталяваны валун з памятнай шыльдай у гонар класіка. Заўважу, што чыноўнік выступаў на выдатнай беларускай мове. У актавай зале гімназіі зашапталіся былыя вучні Васіля Каральчука (у мінулым ён працаваў настаўнікам гісторыі): «Талковы мужык. А ведаеце, чаму? Выхоўваўся на творах Караткевіча. Такіх бы чыноўнікаў пабольш...»

Пасля выступаў мне ўдалося пагутарыць з былой выхаванкай рагачоўскай гімназіі Алінай Радачынскай, якая сёння навучаецца ў сталічнай ВНУ. Дзяўчына распачала кампанію па ўсталяванні ў Рагачове помніка Гервасію Выліваху — герою «Ладдзі Роспачы».

— Гэта ўнікальны літаратурны герой, які павінен служыць прыкладам для кожнага беларуса, — лічыць Аліна. — Беларускі скульптар Генік Лойка вылепіў пластылінавы макет помніка, ёсць людзі, якія гатовы ахвяраваць на скульптуру грошы. Слова — за мясцовымі ўладамі... Мая мара, каб у Рагачове з'явіўся гэты помнік. Наш некалі шэры горад пачне пераўтварацца ў прывабны турыстычны куток...

Напэўна, Уладзімір Караткевіч усцешыўся б усяму гэтаму.

Нецэнзураванае выданне «Ладдзі Роспачы» у хуткім часе, дзякуючы Міністэрству культуры, з'явіцца ва ўсіх беларускіх бібліятэках. Чытайма!

Яўген ВАЛОШЫН. Фота аўтара.

Паляванне на інвестыцыі

Як завабіць нямецкую лань у беларускую пушчу?

Гэта цікавае і дакладнае паляўнічае параўнанне інвестыцый з лясной ланню, якая палохаецца кожнага шоргату, я пачуў шмат гадоў таму ў Боне — тагачаснай сталіцы ФРГ. Тады, на другім годзе незалежнасці Беларусі, у Германію на чале з першым намеснікам прэм'ер-міністра Міхаілам Мясніковічам прыехала вялікая дэлегацыя прадстаўнікоў дзелавых колаў — амаль сотня чалавек. Гэта былі пераважна генеральныя дырэктары вядучых прадпрыемстваў, амаль усе кіраўнікі буйных камерцыйных банкаў, міністры і намеснікі міністраў. Былі і прадстаўнікі сярэдняга бізнэсу, але мала. Калі параўноўваць з сённяшнім днём, то дэлегацыя прыбыла не вельмі падрыхтаванай, нягледзячы на яе салідны склад. Бо досведу работы напрамую з замежнымі партнёрамі было мала. Ды і адкуль яму ўзяцца?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Я асвятляў гэтую паездку і добра памятаю, што перамовы вяліся ў асноўным у рэжыме запрашэння і агітацыі: давайце, укладвайце грошы ў нашу эканоміку, не пашкадуеце. А будзеце доўга думаць — спозніцеся, іншыя зоймуць ваша месца, казалі нашы прадстаўнікі. Немцы ўважліва і ветліва слухалі, задавалі канкрэтныя пытанні наконт будучых прыбыткаў, тое-сёе ўдакладнялі, але не спяшаліся з абвяшчэннем інвестыцыйнага наступу на Беларусь. Вось тады на заключным мерапрыемстве адзін сталы і паважаны ў нямецкім дзелавым асяроддзі бізнэсмен параўнаў інвестыцыі з ланню. Даў зразумець, што трэба шмат папрацаваць, каб іх прыцягнуць у краіну.

Пасля Беларускага інвестыцыйнага форуму ў Франкфурце-на-Майне тую паездку ўспрымаеш як яго своеасаблівую першую рэпетыцыю. Бо цяпер наша дзелегацыя прывезла на форум не адзін дзясятак складзеных і разлічаных строга ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі інвестыцыйных праектаў і прапаноў. За гады незалежнасці мы шмат чаму навучыліся, у тым ліку і ў нямецкіх партнёраў.

«Беларускі» немец Клаус Байер

Сярод тых, хто не адзін год спакваля, крок за крокам ускосна рыхтаваў глебу для форуму ў Франкфурце-на-Майне — «беларускі» немец Клаус Байер і яго сябры-суайчыннікі па германа-беларускім эканамічным клубе. Першыя часы гэта было грамадскае аб'яднанне па інтарэсах, цяпер гэта зарэгістраваны ў ФРГ саюз. Ён аб'ядноўвае 90 чалавек — у асноўным прадстаўнікоў вялікага бізнэсу Германіі, якія хто даўно, а хто нядаўна працуюць у нашай краіне.

У Беларусь Клаус Байер трапіў, можна сказаць, выпадкова. У Германіі быў аб'яўлены конкурс на пасаду дырэктара з нямецкага боку ў Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр, які сёння носіць імя прэзідэнта ФРГ Іаганеса Рау. Нагадаем, гэта сумеснае прадпрыемства Мінгарвыканкама і Дортмундскага адукацыйнага цэнтра. Прэтэндэнтаў на пасаду ў Мінск было нямала, але супыніліся на Байеры. Сярод яго пераваг было і тое, што ён родам з былой ГДР, там вывучаў рускую мову. Усходнія немцы, як вядома, блізкія да нас па менталітэце.

Там, у Ене, закончыў універсітэт. Меў вялікі досвед работы за мяжой, добра валодаў праблематыкай пераходу планавай сацыялістычнай эканомікі да рынкавай. Нават стварыў уласнае адукацыйнае прадпрыемства для ўсходніх немцаў — у Германіі веды таксама сфера бізнэсу. Ахвотнікаў вучыцца прадпрымальніцтву было шмат, і справы ў Байера ішлі добра. І як потым ён прызнаўся новым беларускім сябрам, яму няпроста далося рашэнне пераехаць у Мінск. Але гэтая прапанова вельмі зацікавіла Клауса, ён пагадзіўся. Гэта быў 1995 год.

А праз год немцы, якія знаходзіліся ў Беларусі ў доўгатэрміновай камандзіроўцы (пераважна прадстаўнікі слынных фірмаў і банкаў), прапанавалі яму ўзначаліць іх грамадскае і нефармальнае тады аб'яднанне, якое ўмоўна назвалі нямецкім эканамічным клубам. Ён ужо дзейнічаў каля двух гадоў, але з часам стала відавочна, што на чале яго патрэбны чалавек з наборам асаблівых вартасцяў і сувязямі ў калідорах улады Мінска. І зноў кандыдатура Байера аказалася падыходзячай. Чаму? На гэтае пытанне я папрасіў адказаць аднаго з тых, хто ведае Байера амаль з першых дзён яго знаходжання на нашай зямлі, — Віктара Балакірава, цяперашняга дырэктара Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра з беларускага боку.

— Па першае, гэта абаяльны і ветлівы чалавек, прыроджаны дыпламат, які здольны наладжваць кантакты з патрэбнымі для справы людзьмі, умее надалей падтрымліваць сувязі. Па-другое, ён высокаадукаваны спецыяліст, валодае, я сказаў бы, сучасным эканамічным мысленнем і чуццём, шырокім далягляднам, — гаворыць Віктар Фёдаравіч.

Кансультант урада

Гэтыя здольнасці Байера былі заўважаны і беларускім бокам, дакладней, супрацоўнікамі Савета Міністраў краіны. Клауса Байера як старшыню клуба запрасілі ў Кансультатыўны савет па замежных інвестыцыях пры ўрадзе. Крок, на першы погляд, даволі дзіўны, бо галоўнай мэтай клуба з'яўляецца абарона інтарэсаў нямецкіх прадпрыемстваў у Беларусі. Іх прадстаўнікі нярэдка сутыкаліся з чыноўніцкім непаразуменнем, незразумелай і абуральнай для заходніх бізнэсменаў валакітай. Гэта з аднаго боку. А з другога, абгрунтаваныя прэтэнзіі вядомых нямецкіх кампаній давалі падставу для перамен у працэсе стварэння лепшых умоў для інвестараў, ліквідацыі штучных бар'ераў. Ёсць прыклады, калі па ініцыятыве клуба прымаліся адпаведныя рашэнні.

— Мы ўжо шмат гадоў актыўна працуем у савеце, у прыватнасці, у рабочай групе па фарміраванні станоўчага эканамічнага іміджу Беларусі за мяжой. Дарэчы, сам факт існавання клуба ўжо рэклама для Беларусі. Для іншых інвестараў гэта прыклад таго, што ў вашай краіне можна працаваць, калі ў ёй ёсць такое аб'яднанне. Дзякуючы непасрэднаму дыялогу з вашым урадам мы можам у меру сваіх магчымасцяў садзейнічаць паляпшэнню інвестыцыйнага клімату, — гаворыць Клаус Байер. Натуральна, перш чым укласці многамільённыя інвестыцыі ў той ці іншы сегмент нашай эканомікі, уладальнікі вялікіх грошай абавязкова параяцца з тымі фірмамі, якія ўжо даўно працуюць у Беларусі. Будзьце ўпэўнены, тыя скажуць сваю праўду пра нас. І хацелася, каб гэта заўсёды была прыемная для нас інфармацыя.

— Калі нейкая паважаная замежная кампанія скажа, што ў яе няма праблем у Беларусі, бізнэс паспяхова развіваецца, то гэта будзе лепшай рэкламай вашай краіны для інвестараў, — кажа Клаус Байер. На яго думку, з часам падстаў для такіх слоў усё больш. За тыя 15 гадоў, што ён узначальвае клуб, многае ў заканадаўстве краіны, падатковай сістэме памянялася ў лепшы бок. Праўда, адбываецца гэта не так хутка, як хацелася б, але ўсё ж рух наперад ёсць. І гэта галоўнае. Напрыклад, ужо шмат законаў адаптаваны да міжнародных нормаў, прыведзены ў адпаведнасць з сусветнымі стандартамі. Значна менш стала бюракратычных перашкод. У гэтым заслуга ўрада, лічыць Клаус Байер. Ён успамінае, што раней уся працэдура рэгістрацыі была надзвычай складанай, цяпер яна істотна спрошчана. Сістэма падаткаабкладання была проста жахлівай, цяпер яна стала прасцей, хоць тут яшчэ ёсць над чым працаваць. Значна паменела відаў дзейнасці, якія неабходна было ліцэнзаваць.

— Куды менш стала масавых праверак. Бо быў час, калі амаль штодзень з'яўляліся на парозе ўсё новыя кантралёры. У гэтыя станоўчыя змены ёсць і наш сціплы ўнёсак, — гаворыць Клаус Байер.

Клуб — даніна традыцыям

Для дасягнення пэўных мэт аб'ядноўвацца ў саюзы, у тым ліку і эканамічнага кірунку — даўняя нямецкая традыцыя, карані якой у сярэднявеччы. З тых часоў набыты вялікі досвед дзейнасці саюзаў самага рознага характару. У традыцыях нямецкай эканомікі стварацца свае саюзы і за мяжой. Таму клуб у Мінску — і даніна традыцыям, і надзённая справа сённяшняга дня. У 1994 годзе ідэю яго стварэння падтрымалі прадстаўнікі кампаній БААСФ, Комерцбанка, Люфтганзы, Цэйса, іншых сусветнавядомых фірмаў.

Асноўны інтарэс членаў клубаў просты і зразумелы для беларускіх уладаў: іншаземцы хочуць працаваць у спрыяльных умовах. Што можа зрабіць і робіць клуб? Для ўсведамлення і асэнсавання глыбіні пэўнай праблемы яго члены збіраюцца на штомесячныя сходы. Яны праводзяцца без фармальнасцяў, у форме клубных вечарын. Галоўнае — якасны ўзровень абмеркавання. Гэтыя пасяджэнні праходзяць у адкрытым рэжыме — на іх рэгулярна запрашаюцца прадстаўнікі беларускіх ведамстваў і арганізацый. Пры гэтым выбар тэмы чарговай сустрэчы падказваюць члены клуба.

Сёлета бадай аднадушна яны прапанавалі грунтоўна абмеркаваць такую перспектыўную на будучыню тэму, як бізнэс ва ўмовах Мытнага саюза. На той сустрэчы ў маі выступаў як асноўны дакладчык першы намеснік старшыні Мытнага камітэта, які пастараўся дакладна адказаць на ўсе пытанні членаў клуба. А днямі яго госцем стаў намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка. Таксама адбылася цікавая і змястоўная гутарка. Сёлета абмяркоўвалі з інфармаванымі прадстаўнікамі дзяржаўных органаў тэмы падаткаабкладання і цэнаўтварэння. У клуба ёсць кантактная асоба ва ўрадзе — віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў, з якім Клаус Байер мае магчымасць аператыўна звязвацца. Дзякуючы такой сувязі і ўвазе з боку ўрада ўдаецца вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць. Ва ўрадзе, заўважае Клаус Байер, заўсёды гатовыя нас выслухаць і дапамагчы

ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН: УНІКАЛЬНЫ ПОЎДЗЕНЬ КРАІНЫ

Сапраўдная мужчынская работа — здабываць карысныя выкапні

Кар'ер «Сялянская Ніва».

Прырода дала Палессю ўнікальныя карысныя выкапні. І сёння калектыў друзавага завода «Глушкевічы», які з'яўляецца філіялам КПРСУП «Гомельаблдарбуд», робіць усё, каб з розумам выкарыстоўваць такое багацце. Тут, у кар'еры «Сялянская Ніва», на працягу больш чым 35 гадоў здабываецца і перапрацоўваецца гранітны будаўнічы камень. Аналагічнай вытворчасці няма ў ніводнай дарожна-будаўнічай арганізацыі нашай краіны. У апошнія гады, пасля сумнага перапынку ў 90-я, завод пачаў стабільна развівацца. Адчувальны імпульс у яго развіцці быў атрыманы ў 2004 годзе, калі завод наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Паэтапна прайшла рэканструкцыя і мадэрнізацыя прадпрыемства. Абноўлена лінія драбнення. Гэта дазволіла ў некалькі разоў павялічыць аб'ём выпуску друзавых матэрыялаў.

(Працяг. Пачатак на 1-й і 5-й стар.)

ДЫРЭКТАР друзавага завода «Глушкевічы» **Леанід БУРЛЕВІЧ** адзначае, што атрымалася пераадолець штомесячны 80-тысячны рубеж здабычы.

— Раней мы выраблялі інертных матэрыялаў не больш за 55-60 тысяч кубічных метраў, зараз — 85. Інертныя матэрыялы — гэта друз розных фракцый. Мы пастаўляем друз для ўкладкі і рамонту дарог Гомельшчыны. Часткова наш друз ідзе і ў Расію. Тут праходзіць так званы Карпацкі шчыт, які цягнецца з Украіны. Глушкавічам пашанцавала, што мы маем такое радовішча. Распрацоўкі кар'ера «Сялянская Ніва» вядуцца свідравальна-выбуховым спосабам. Разведаныя запасы складаюць 67,7 мільёна кубічных метраў, і даразведка паказала наяўнасць яшчэ 274 мільёнаў «кубоў» у цвёрдым целе. Радовішча разлічана на 110 гадоў. Пароды тут выветраныя, трэшчынаватыя, таму камень з гэтага радовішча выкарыстоўваецца для вытворчасці друзу.

Леанід Бурлевіч пераехаў з Міншчыны больш за 2 гады таму, дзе працаваў на адказных пасадах. Кажа, што толькі тут, на радзіме, знайшоў сябе пасля вандраванняў па свеце:

— Цягнула сюды, на радзіму, заўсёды. Прызначылі на пасаду дырэктара, калі падала вытворчасць — было нават страшна. Тэхніка ламалася, здабываць горную пароду не было дзе, а 300 чалавекам трэба выплачваць заробак. Таму многа тут прыйшлося мяняць кардынальна. Людзі паверылі, цяпер сталі добры заробак атрымліваць. Важна ўзяць на сябе пэўную адказнасць і ісці наперад. І людзі пойдуць. Я знаходжу задавальненне ў працы таму, што гэта сапраўдная мужчынская работа — здабываць карысныя выкапні.

Мірны выбух

Мы стаім над кар'ерам, і Леанід Аляксандравіч паказвае свае ўладанні. Карцінка заварожвае. Дзесьці далёка ўнізе, быццам цацачныя, бегаюць 30-тонныя БелАЗы. Цяпер на гэтым распрацаваным кар'еры разведана 6 уступаў. Кожны ўступ — па 12 метраў. Такім чынам, агульная глыбіня разведаных запасаў дасягае больш за 70 метраў. Здабыча вядзецца зараз на другім уступе, а ў будучым годзе пойдзе на трэці. Тры разы на месяц паветра калышацца ад магутнага выбуху — так, што ва Украіне чуюць. Гэта ідзе нарыхтоўка горнай пароды.

— Але ж спачатку з дапамогай свідравальных станкоў у камені робяцца свідравіны дыяметрам 220 мм, — працягвае тлумачыць дырэктар прадпрыемства, — Туды засыпаецца ўзрыўчатка, камутуецца сець — і адбываецца выбух. Сёлета мы асвоілі новы від узрыўчаткі — нітраніт — яна вадкая. Палепшылася якасць горнай масы, працэс стаў больш экалагічным і бяспечным.

Зямля тут сапраўды каменная, хоць Леанід Аляксандравіч і ўзгадвае словы сваячніцы, якая казала, што на месцы сённяшняга кар'ера жыта калісьці сеяла. Парода месцамі выходзіць на паверхню, там, дзе яе не бачна, яна знаходзіцца на глыбіні больш за метр. Сустракаецца тут прыгожы граніт з ружаватымі ўключэннямі.

— Апошнім часам мы вызвалілі яшчэ 11 га для вядзення горных работ і вывелі 1 млн тон ускрышных парод. У нас ёсць два экскаватара з пяцікубовымі каўшамі. Яны грузяць пароду на 30-тоныя БелАЗы. Летась мы набылі 8 новых такіх машын, а таксама 3 карэйскія экскаватары. У гэтым вялікую дапамогу нам аказала кіраўніцтва «Гомельаблдарбуда». Набыццё новай тэхнікі дало нам магчымасць павялічыць вытворчасць друзу. Праўда, ёсць праблемы з негабарытам. Некаторыя камяні не могуць прайсці на драбілкі. Таму гідрамолат разбівае іх да патрэбных нам габарытаў. Пасля вывозіцца ўсё на драбільны ўчастак. Вада выдаляецца спецыяльнымі магутнымі ўстаноўкамі.

Каштоўны граніт па звышкаштоўнай чыгунцы

Глушкавіцкі граніт — адзін з самых цвёрдых. Яго марка — 1400 кг на см², што азначае мяжу трываласці. Таму камень каштоўны, і здабыча яго рэнтабельная. Але вось дастаўка перакрэслівае ўсе перавагі.

— Аўтапаязды возяць наш друз да чыгункі, прадукцыя загружаецца ў вагоны і падаецца да спажыўца на поўнач краіны, — расказвае аб тэхналогіі дастаўкі матэрыялу дырэктар друзавага завода «Глушкевічы» Леанід Бурлевіч. — Транспартнае плячо робіць прадукцыю значна даражэйшай, і яна становіцца неканкурэнтаздольнай. Таму нашаму аб'яднанню «Гомельаблдарбуд» дазволена выкарыстоўваць свой матэрыял. Вядома ж, чыгунка, пра якую даўно вядзецца размова на ўзроўні ўрада, магла б вырашыць многія праблемы. Аднак, пры пашырэнні вытворчасці, павелічэнні аб'ёмаў пацерпіць вёска. У нас ёсць бізнэс-план для будаўніцтва прадпрыемства з вытворчасцю 4 мільёнаў кубаметраў у год. Будаўніцтва каштуе $420 млн, а чыгунка каштуе значна больш, чым будаўніцтва завода. Праблема і ў тым, што дарога не скразная, а тупіковая. Таму акупаемасць яе вырастае ў разы.

Праца для сваіх і не толькі

Насельніцтва аграгарадка Глушкавічы працуе на друзавым заводзе. Вядома ж, не ўсе 2,5 тысячы. Але ж прадпрыемства горадаўтваральнае — а дзе яшчэ знойдзеш працу? Быў час — ад'язджалі на заробкі, шукалі лягчэйшага хлеба. Толькі ці ёсць ён, лёгкі хлеб?


Дырэктар друзавага завода «Глушкевічы» Леанід БУРЛЕВІЧ.

— Пасля таго, як паспыталі працы на чужыне, вяртаюцца, просяцца назад, — расказвае Леанід Аляксандравіч. — У свой час у нас быў дэфіцыт машыністаў свідравальных станкоў, бульдазерыстаў — запрасілі з Украіны, бо мы маем ліцэнзію на запрашэнне замежнай рабочай сілы. А людзі адтуль імкнуцца працаваць. Нам спецыялісты патрэбны, таму 5 чалавек вучыцца завочна ў БНТУ на горным факультэце. Даём жыллё людзям. Хацелася б тут бачыць сваіх, мясцовых, бо наўрад хто паедзе ў такую глыбінку.

Між тым прадпрыемства дае вялікую частку даходаў у бюджэт Лельчыцкага раёна. Ды і самі людзі тут не бядуюць — бяруць крэдыты, будуюць жыллё, ездзяць на нядрэнных машынах. Сацкультбыт — калі ласка! Каманды друзавага завода па міні-футболе, футболе, валейболе займаюць прызавыя месцы сярод арганізацый «Гомельаблдарбуда». У Глушкавіцкім палацы культуры ёсць добрая спартзала для трэніровак.

— Не забываем сваіх ветэранаў — робім для іх выплаты да Дня ветэранаў і прафесійнага свята, — расказвае аб сферы сацкультбыта дырэктар прадпрыемства. — У нас падшэфны дзіцячы садок — ім таксама аказваем дапамогу. Уявіце: чалавек 12 гадзін працуе на такой цяжкай вытворчасці, а потым сена косіць, гаспадарку вядзе, дзяцей выхоўвае... Няпроста гэта. Але ж я, калі дзе бываю, паказваю фотаздымкі — як мы жывём — у гэтай глыбінцы Палесся, самай аддаленай паўднёвай кропцы Беларусі. У нас заўсёды чыста, і галоўнае — людзі імкнуцца падтрымліваць чысціню. Між іншым, гэта датычыцца не толькі быту, але і вытворчасці. Побач, ва Украіне, дзе кар'еры прыватныя і распрацоўваюцца яны з дапамогай самай сучаснай тэхнікі, ёсць іншыя, затопленыя і кінутыя кар'еры. І людзі там без працы. Яны нам зайздросцяць, бо ў нас культура вытворчасці вышэй, ды і заробак таксама.

Да таго ж, на прадпрыемстве паспяхова прымяняецца камп'ютарная сістэма ўліку выпуску прадукцыі, а таксама галоўнага пуску магутных электрарухавікоў. На заводзе ўкаранёна і новая сістэма аддаленага маніторынгу па кантролі руху вялікагрузных аўтамабіляў. На іх устанавілі 16 тэрміналаў. Гэта дазваляе мець дакладную інфармацыю аб перамяшчэнні транспартных сродкаў, адсочваць фактычны маршрут кожнай адзінкі, колькасць выкананых рэйсаў, прабег. Такім чынам, вытворчасць прадукцыі стала больш эканомнай.

Глушкавіцкая Карэлія

Акрамя «Сялянскай Нівы», ёсць у Глушкавічах яшчэ адно радовішча з назвай «Надзея». Там граніт іншай якасці і здабываюцца блокі маналітнага каменю. Дарэчы, у сталіцы нашай краіны на многіх станцыях метрапалітэна граніт з Глушкавічаў.

— Чорны і шэры з белымі развод-дамі — гэта наш камень, — паказвае ўзор дырэктар завода Леанід Бурлевіч. — Пры будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі ён таксама прымяняўся. Мы праходзілі адпаведную сертыфікацыю — наш граніт дапускаецца нават для ўнутраных работ. Цэнтральная алея ля храма Хрыста Збавіцеля ў Маскве і верхні ўзровень бардзюра зроблены таксама з нашага каменя. Мінскі аэрапорт нашым каменем упрыгожаны.

Кар'ер «Надзея», які быў некалі распрацаваны, цяпер затоплены. Вадаём, створаны чалавекам і прыродай, знаходзіцца практычна побач з тым месцам, дзе калісьці было каменнае возера. На берагах сучаснага возера — адвалы нераспрацаванай пароды, якія параслі маладымі бярозамі. Ёсць адчуванне, што нейкім чынам трапіў не ў Беларусь, а ў Карэлію. Таму «Надзею» завуць тут таксама «глушкавіцкай» Карэліяй.

Нараду на друзавым заводзе вядзе намеснік генеральнага дырэктара «Гомельаблдарбуда» Аляксандр ПЛАТКОЎСКІ.

Вяртаемся да старажытнасці?

На друзавым заводзе зараз вядзецца вялікая і карпатлівая праца з інвестарамі. Намеснік генеральнага дырэктара КПРСУП «Гомельаблдарбуд» Аляксандр Платкоўскі гаворыць аб перспектыве развіцця прадпрыемства і павелічэнні аб'ёмаў выпуску яго прадукцыі:

— Інвестары ёсць — гэта і чэхі, і іранцы, і кітайцы. З кім будзе заключана пагадненне — вызначыць жыццё. Думаю, што гэта справа максімум аднаго года. Сёння мы хочам адрадзіць работу на кар'еры «Надзея», дзе да 90-х гадоў здабывалі гранітныя блокі, з якіх выраблялі абліцовачныя будаўнічыя матэрыялы. Мы хочам у бліжэйшыя паўгода стварыць вытворчасць пілена-колатай брусчаткі з аколу, які ўтварыўся ў гэтым кар'еры.

Драбільна-сартавальны ўчастак.

Вядома, што новае — добра забытае старое. Вось таму ўспомнілі аб старажытным і нятанным спосабе будаўніцтва дарог — каменных, з брусчаткі. Яны, прынамсі, самыя даўгавечныя.

— Мы навучыліся вырабляць асфальтабетон, у якім утрыманне друзу да 73 %. Але ж 23 працэнты — гэта пяскі, іншыя вяжучыя кампаненты, — дзеліцца асаблівасцямі сучасных тэхналогій будаўніцтва дарог Аляксандр Аляксандравіч. — А вось для аднаўлення гістарычных частак горада, пешаходных зон, прыпынкаў транспарту можна выкарыстоўваць брусчатку. Ёсць планы ў Гомелі цэнтральную плошчу зрабіць з брусчаткі, вуліцы ў старым горадзе ў Мінску — таксама. У Гомелі вуліца Камунараў зроблена з брусчаткі, на шэрагу прыпынкаў аўтатранспарту мы зрабілі палосы тармажэння з гэтага матэрыялу. Гэта ўсё добра працуе — няма правалаў, «грыбоў», як на асфальце — дарога не разбураецца. Так што перспектыва ёсць. Яшчэ 5 гадоў таму казалі, што занадта каштоўна, а цяпер многія хочуць на сваёй дачы дарожку з натуральнага каменя зрабіць. Каменем і ўзоры цікавыя можна выкладваць. Таму ўпэўнены, што гэтая вытворчасць будзе запатрабаванай. Хочам стварыць на друзавым заводзе плошчы па вытворчасці 40 тысяч кубічных метраў брусчаткі ў год. У красавіку павінна ўжо гэта здзейсніцца.

Царства лясоў, балот і туманаў

На тэрыторыі раёна пражывае 27,2 тыс. чалавек. З іх у сельскай мясцовасці — 17,4 тыс. чалавек, у гарадскім пасёлку Лельчыцы — 9,8 тыс. чалавек.

Геаграфічная плошча раёна — 322 тысячы га, з іх — 215 тысяч складаюць лясы, 40 тысяч га — сельгасугоддзі. Тэрыторыя раёна пераважна раўнінная. Тут працякаюць 24 рэчкі агульнай працягласцю амаль 500 кіламетраў. Гэтыя мясціны — край балотаў і забалочаных участкаў, азёраў і вадасховішчаў, асабліва ў рэчышчы Убарці.

На тэрыторыі раёна можна сустрэць рэдкія віды флоры і фаўны, занесеныя ў Чырвоную кнігу: баранец звычайны, шалфей лугавы, кучаравую лілею, вянерын чаравічак.

На беразе Убарці з аднаго кораня растуць дуб і бяроза. Ёсць у Лельчыцкім раёне і цар-дуб, якому больш за 600 гадоў.

Водзяцца тут барсук, рысь, белавежскі зубр, беркут, гагара, шэры журавель, балотная чарапаха.

Карысныя выкапні: буры вугаль, торф, пясок, гліна. Каля вёскі Глушкавічы ёсць унікальнае радовішча будаўнічага каменю, які знаходзіцца на паверхні.

Малочныя рэкі з каменных берагоў

Гаспадарка «Зара Палесся» была створана на базе стратнага калгаса «Перамога» і пяць гадоў таму практычна стаяла на каленях, пасля далучэння да магутнага прадпрыемства «Гомельаблдарбуд» яна паступова выйшла з крызісу. Сёння тут гавораць словы ўдзячнасці генеральнаму дырэктару Вадзіму Краўчанку, які пільна сочыць не толькі за асноўнай вытворчасцю — дарогамі, але і за сітуацыяй у падшэфных вяскоўцаў, якіх калісьці прыйшлося ўзяць на свой баланс. Прынамсі, стабілізаваліся за кароткі час і эканоміка гаспадаркі, і адносіны людзей да працы. Цяпер друзавы завод з гаспадаркай — практычна як брат з сястрою — дзеляцца ўсім, чым патрэбна. Дзякуючы заводу ідзе ў камунальным даччыным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве будаўніцтва з размахам — завершана адкормачная пляцоўка на 600 галоў. Калі больш дакладна — комплекс для круглагадзічнага ўтрымання буйной рагатай жывёлы. Кіраўнік прадпрыемства Сяргей Дублянін гаворыць, што на сённяшні дзень у будаўніцтва ўкладзена 5,5 мільярда рублёў.

Брыгада ДРБУ № 153 «Гомельаблдарбуда», што будавала ўнікальную адкрытую пляцоўку: дарожны рабочы Ігар МАЗУР, майстар Сяргей БЯЛОЦКІ, машыніст пагрузчыка Сяргей АСТАПОВІЧ, майстар Уладзімір ХАЛЯВА, цясляр-бетоншчык Андрэй ВАРАНОВІЧ і трактарыст Мікалай КАЗАЧЭНКА.

Валянцін ДЗЕКАВЕЦ уносіць апошні штрых перад увядзеннем адкрытай пляцоўкі для жывёл.

— І ЯШЧЭ каля мільярда плануецца ўкласці ў гэты аб'ект. Паводле ўказа Прэзідэнта, нам выдзелена 2 млрд 400 мільёнаў. А яшчэ трэба 4 мільярды — з улікам будоўлі першага памяшкання. Там праектуецца малочны блок на 24 месцы. Гэта самая сучасная тэхналогія, і для такой пляцоўкі самае галоўнае — каб было дастаткова кармоў для жывёлы. Тут будзе жывёла масай 330 кг і вышэй. Менш у зімовых умовах не рэкамендуецца. А вясной і летам гэта выдатная пляцоўка для ўсіх — у тым ліку і маладых жывёлін.

Майстар ДРСУ-153 Уладзімір Халява кажа, што раней не працаваў з сельскагаспадарчымі аб'ектамі — усё больш дарогі будаваць прыходзілася:

— Такая будоўля — упершыню. Плошча вялікая і была тут праблема з адводам вады. Але ж разам з праекціроўшчыкамі мы яе вырашылі. Шмат арганізацый удзельнічала ад КПРСУП «Гомельаблдарбуд», прыйшлося іх усіх курыраваць і каардынаваць — з Рэчыцы, Ельска, Петрыкава, Акцябрскага, Турава, Лельчыцаў.

Лекі супраць стрэсу... у каруселі

Галоўны заатэхнік КДСУП «Зара Палесся» **Іван Пятровіч КАЎБІЧЭНКА** праводзіць экскурсію па пляцоўцы, якая больш нагадвае вялізны стадыён:

— Там будуць стаяць кармавыя сталы з правільна падабраным рацыёнам, будзе вада з падагрэвам — у зімовы час гэта актуальна. Першая пляцоўка — на 300 галоў, дзве другія — на 150 галоў кожная. Самае галоўнае — каб не было скразнякоў. Каруселі будуць паступова прывыкаць кожная да свайго стойла. Прывязваць іх не будуць тут. Месца нямнога, але разлічана на велічыню жывёлы. І гэта добра — так лягчэй даглядаць жывёлу. Яна ж разумная — будзе чужых згоняць. Жывёла ў такіх умовах не мае падстаў для стрэсаў, а значыць, будзе і прывес, будзе і малако. Гэта праверэная тэхналогія.

Галоўны бухгалтар Любоў КАЗАЧОК і бухгалтар-сакратар Надзея ДУБЛЯНІНА.

Спецыялізацыя гаспадаркі — мяса-малочная вытворчасць. Зараз тут 1440 галоў, з іх 385 галоў дойнага статку. Астатняе — маладняк буйной рагатай жывёлы. У планах — 480 галоў дойнага статку пры агульным пагалоўі — 1550 галоў.

— Мы сёлета добра аднавілі свой механізаваны парк, — дзеліцца дырэктар КДСУП «Зара Палесся» Сяргей Дублянін, — набылі па лізінгу зернеўборачны і кормаўборачны камбайны, трактар, пагрузчык і два МАЗа. Цяпер яшчэ патрэбны прычэпы.

Аб'яднанне нам добра дапамагае — падаткі закрываем іх сродкамі. У перспектыве плануем пабудаваць тут міні-цэх па перапрацоўцы малака. Наладзім, магчыма, выпуск рознай малочнай прадукцыі. За год у нашай гаспадарцы палепшыліся паказчыкі па якасці малака і па яго продажы. Па прывагах мы ідзём 156 % да ўзроўню мінулага года. Летась мы таксама ўвялі малочны блок. Спачатку было цяжка: жывёла была непрывучаная, а цяпер — нармальна. Працэс пайшоў. Сёлета кармоў не хапала, каб перавесці на круглагадзічнае ўтрыманне, і тэхнікі было недастаткова. А вось у будучым годзе плануем перавесці жывёлу на новы рэжым жыцця і ўжывання ежы. Калі паказчыкі паляпшаюцца — толькі за кошт тэхналогіі і арганізацыі працы.

Дырэктар КДСУП «Зара Палесся» Сяргей ДУБЛЯНІН.

Пра тэхналогію ў падрабязнасцях расказвае галоўны заатэхнік КДСУП «Зара Палесся» Іван Каўбічэнка:

— Планы ў нас — 5 тысяч літраў малака і сяроднесутачная прывага — 650—700 грамаў. А пакуль мы выходзім на ўзровень 4-4200 літраў малака. Сярэднясутачная прывага складае каля 600 грамаў. З ўводам у строй адкормачнай пляцоўкі, я думаю, гэтыя паказчыкі мы павысім. Тое паляпшэнне паказчыкаў, якое ўжо адзначаецца, адбылося ў першую чаргу за кошт падбору чыстапародных жывёлы. У нас у асноўным чорна-стракатая парода, мы закупалі яе за межамі Гомельскай вобласці. Акрамя таго, мы пачалі паляпшаць кармавую базу. Цяпер у жывёлы больш сбалансаваны рацыён. На наступны год плануем аднатыпнае кармленне. Жывёла будзе карміцца не на пашы, а толькі з сіласнай і сянажнай траншэі. У гаспадарцы амаль не засталося старых памяшканняў. Калі раней былі хляваў з выдаленнем гною транспарцёрамі, то цяпер мы перанялі вопыт работы саўгаса-камбіната «Зара» Мазырскага раёна. Будуем памяшканні для цялят 3-6 месяцаў. Вось цялятнік, разлічаны на жывёл фактычна ад нараджэння да 3 месяцаў з беспрывязным утрыманнем і свабодным падыходам да кармоў. Мы тут атрымліваем 700 грамаў прывагі. У нас цэхавая сістэма. Расцялілася карова — у індывідуальны домік пайшло цяля. Потым — у групу да 3 месяцаў. Пасля — у групу 3-6 месяцаў. У рацыён уваходзіць усё неабходнае: камбікорм, сена, кукуруза, соль, мел, малако. Бачыце — тут яны свабодна рухаюцца, а рух — гэта жыццё. Калі сонейка выглянула — у іх ёсць магчымасць выйсці пабегаць.

Зернеачышчальны сушыльны комплекс, камбікормавы цэх, зерняскладгэта ўсё гэта з'явілася ў гаспадарцы таксама нядаўна.

— Калі я прыйшоў працаваць, тут было 198 чалавек, цяпер — 112, — успамінае дырэктар КДСУП «Зара Палесся» Сяргей Дублянін. — Прыйшлося пазбавіцца ад тых людзей, якія не жадаюць працаваць. Сёння сярэдні ўзрост тых, хто працуе ў гаспадарцы, — да 40 гадоў. Механізатары атрымліваюць зарплату большую за мільён. Камбайнеры за месяц у сезон зарабляліпа 2-3 мільёны. Раніцай, у абед і вечарам праязджаю — кантралюю працу рабочых. Стаяць над імі не трэба — толькі кантраляваць час ад часу.

Працаўнікі гаспадаркі «Зара Палесся» адчуваюць не толькі контроль з боку кіраўніцтва, але і клопат. За здачу малака з асабістых падворкаў атрымліваюць пак сена, пак саломы і 100 кг зерня. Таксама і для камбайнераў, даярак, механізатараў, калі працуюць добра, гаспадарка выдзяляе па 2 тоны сена і 300-500 кг зерня.

Літаральна днямі гаспадарку наведаў старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон, які адзначыў, што такой маштабнай адкормачнай пляцоўкі на 600 галоў, пабудаванай па ўсіх сучасных тэхналогіях, няма, напэўна, ва ўсёй Беларусі. Застаецца толькі сканцэнтраваць свае сілы, уменні, вопыт работы — бо напярадзе ў кіраўніцтва КДСУП «Зара Палесся» яшчэ шмат планаў. У іх увасабленні многае будзе залежаць ад карпатлівай работы кожнага працаўніка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Алена ДАЎЖАНОК.
Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

УНП 490322382.

Глушкевічы ў Глушкавічах

Справа ў тым, што вёска спакон веку мае назву Глушкавічы. Менавіта так свой населены пункт называюць мясцовыя жыхары. Першы ўспамін пра вёску Глушкавічы сустракаецца ў архіўных дакументах за 1545 год — населены пункт узгадваецца як прыватнае сяло ў складзе ВКЛ. Але ж прадпрыемства, заснаванае тут у 1975 годзе, было зарэгістравана, можна сказаць, з расійскім акцэнтам. Атрымалася «Глушкевічы». Адсюль і блытаніна, да якой усе прызвычаіліся і асабліва не скардзяцца. Цікава, што юрыдычны адрас прадпрыемства «Друзавы завод «Глушкевічы» — Лельчыцкі раён, в. Глушкавічы, вул. Савецкая, 242.

5 АСОБАЎ, ПРА ЯКІХ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ БЕЛАРУС

(5 суб'ектыўных меркаванняў)

Людзей на свеце шмат. Розных. Разумных, аўтарытэтных, празаікаў і навукоўцаў, лірыкаў і фізікаў, музыкаў і мастакоў, рэжысёраў і акцёраў, прыбіральшчыц і манекеншчыц... Але заўжды ёсць сярод іх найбольш вядомыя. Тыя, на каго раўняюцца, з кім раяцца, кім ганарацца, каму зайздросцяць. Вось сёння ў нас модна пастаянна абмяркоўваць і адраджаць нацыянальную ідэю: у кінематографе, у мастацтве, у эканоміцы... Такое адчуванне, што мы крыху заблыталіся. Сучаснаму беларусу як ніколі патрэбна нейкае надзейнае апірышча. Я маю на ўвазе не толькі блізкіх, родных і сваякоў. Але і носьбітаў гэтага самага нацыянальнага. Тых, хто мог бы скіраваць думкі ўсяго народа ў адзінае сугучнае рэчышча. «Звязда» апытала пяць чалавек, якія займаюцца музыкай, кіно, літаратурай, выяўленчым мастацтвам, гісторыяй і якія маюць свой погляд на тое, пра каго з асобаў кожны беларус сёння абавязкова павінен ведаць. І чаму. Большасць абраных асобаў — прадстаўнікі культуры і мастацтва, своеасаблівыя пасіянарыі. І гэта яскрава пацвярджае важнасць культуры і мастацтва для духоўнага развіцця і жыцця нацыі.

Адам МАЛЬДЗІС, прафесар, літаратуразнавец, гісторык, пісьменнік:

Немажліва мне, чалавеку, які звязаў сябе са складаннем і напісаннем энцыклапедый, выбраць усяго 5 асобаў з усіх сфераў дзейнасці. Бо тады гэта будзе вельмі бедны выбар, а Беларусь, як вядома, багатая на выбітных дзеячаў. Таму я дазволю сабе выбраць 5 прадстаўнікоў прыгожага пісьменства, пра якіх павінен ведаць кожны беларус, творы якіх павінен чытаць і прыслухоўвацца да іх, бо яны, як ніхто, носьбіты беларускага крэда:

1. **Францыск Скарына.**
2. **Янка Купала.**
3. **Якуб Колас.**
4. **Максім Багдановіч.**
5. **Уладзімір Караткевіч.**

Таццяна ЛОГІНАВА, кінааператар:

1. Васіль Быкаў. Адзін з нямногіх беларускіх літаратараў, які вядомы ўсяму свету і які сказаў новае важкае сваё слова пра вайну.

2. Алесь Адамовіч. Гэты пісьменнік меў неверагоднае чалавечае сумленне, валодаў такой бясстрашнасцю! Ён жыў і ствараў у часы, калі ўсе баяліся, але сам ён заўсёды імкнуўся перамагчы страх і дапамагаў перамагаць страх іншым.

3. Святлана Алексіевіч. Лічу, што яе кнігі павінен чытаць абсалютна кожны беларус, каб разбірацца ў гэтым свеце, у яго праблемах і, наогул, усведамляць, у якой краіне, на якой зямлі ён жыве. Вельмі крыўдна, што гэты аўтар не выдаецца ў нас, больш яна вядомая за мяжой. Яна чытае лекцыі на Захадзе, а мы бачым яе толькі час ад часу і чытаем інтэрв'ю ў газетах... Гэта не зусім нармальна.

4. Барыс Заборaў. Гэта чалавек, які эміграваў з СССР у 1980-х гг., стаў мастаком года ў Францыі ў 2000-х гг. Барыс Забораў — гэта з'ява. Калі б ён мог тут, у нас, так жа працаваць, як ён працаваў у Францыі, то Беларусь не страціла б такога выдатнага мастака. Барыса Заборава трэба ведаць як прыклад таго, чаго не павінна больш ніколі здарацца з беларускімі творцамі...

5. Валянцін Елізар'еў. Гэта творца, які праславіўся сваімі балетамі на ўвесь свет. Я, напрыклад, перажываю наконт таго, што ён зараз не ставіць спектаклі ў нашых тэатрах, а ставіць недзе ў Японіі, у гарадах Расіі... Ён сярод тых нашых асобаў, якімі мы павінны ганарыцца і ведаць іх, таму што іх ведае ўвесь свет!

Аксана СПРЫНЧАН, пісьменніца:

1. Вацлаў Ластоўскі. Бо ў ім спалучаецца беларуская шматграннасць (пісьменнік, гісторык, літаратуразнавец, публіцыст і палітычны дзеяч). Да таго ж ён адзін з пачынальнікаў нацыянальнага адраджэння, а Беларусь спрадвеку была краінай пачатку.

2. Язэп Драздовіч. Бо ён адзін з заснавальнікаў беларускага нацыянальнага гістарычнага жывапісу, а ўсё, што датычыцца гісторыі, у Беларусі найбольш сучаснае. Да таго ж ён пачынальнік касмічнай тэмы ў выяўленчым мастацтве, а Беларусь — гэта святло ў Космасе.

3. Ігнат Канчэўскі. Бо ён аўтар праграмнага эсэ беларускай філасофіі «Адвечным шляхам». А жыць магчыма адно тады, калі ставіцца да жыцця па-філасофску. І па-беларуску.

4. Эмілія Плятэр. Бо яна ў мірны час збірала, апрацоўвала, спявала беларускія песні і танчыла народныя танцы. А хто спявае і танчыць лепей за беларусаў?! А ў час вызваленчага паўстання 1831 года Эмілія Плятэр змагалася, кіравала паўстанцамі: як сапраўдная жанчына, раскрыла сапраўдную сутнасць Беларусі. Наша краіна — гэта краіна разумных і моцных жанчын.

5. Уладзіслаў Чарняўскі. Бо гэты каталіцкі святар — удзельнік беларускага хрысціянскага руху XX стагоддзя: ён захоўваў агеньчык беларушчыны ў 50—80-х гадах. А ў Беларусі, каб яна рухалася наперад, кожны рух душы павінен быць беларускім.

Алеся, спявачка:

1. Еўфрасіння Полацкая. Заступніца і асветніца Беларусі, пра якую павінен ведаць кожны патрыёт.

2. Францыск Скарына. Па-беларуску вельмі шматгранная асоба, асветнік. Недарэмна ў нашай краіне адным з самых старэйшых узнагарод з'яўляецца ордэн Францыска Скарыны.

3. Якуб Колас. Калі мяне пытаюць, чаму Якуб Колас значная для Беларусі асоба, я пытаю ў адказ: а чаму яму стаіць помнік на адной з галоўных плошчаў краіны?! Напэўна, недарэмна.

4. Уладзімір Мулявін. Шыкоўны музыка, кампазітар. Чалавек, які можа быць для ўсіх прыкладам ва ўсім. Мой бацька таксама шмат чаму ў яго вучыўся.

5. Майкл Джэксан. Поп-культура — гэта сфера, дзе арыентуецца пераважная большасць людзей. І таму яны павінны ведаць гэтага геніяльнага музыку: і ў сэнсе творчага таленту, і ў чалавечым сэнсе (ён быў нязломнай прынцыповай асобай, заўжды выкарыстоўваў максімум сваіх магчымасцяў і ва ўсім ішоў да канца).

Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, мастак:

1. Якуб Колас. У гэтага вялікага беларускага паэта ёсць такія творы, якія застануцца сярод людзей на доўгія-доўгія часы не толькі ў нашай краіне, але ва ўсім свеце. Ягоная славутая паэма «Новая зямля» — гэта надзвычайны твор мастацтва. З напісанага ў XX стагоддзі выпраменьвае столькі любові да нацыі, да людзей, да тых, хто разумее, што такое прыгажосць, Радзіма, Беларусь.

2. Пётр Машэраў. Выбітны палітычны дзеяч самага высокага гатунку, адзін з самых цікавых у савецкія часы. Цудоўны кіраўнік, які неверагодна шмат зрабіў для Беларусі. Ён дбаў пра інтарэсы людзей, а яны за гэта яму давяралі. Гэта ў палітыцы досыць рэдка бывае, на жаль... Акрамя таго, як дасведчаны палітык ён падтрымліваў мастацтва, яго разумеў і цаніў. А гэта значыць, што ён дбаў пра духоўнае жыццё свайго народа.

3. Яўген Глебаў. Славуты беларускі кампазітар, творы якога прасякнутыя любоўю да чалавека. Тое, што ён напісаў, заўжды было і будзе цікавым. Паказаў высокі сусветны ўзровень беларускага мастацтва.

4. Віталь Цвірка. Выбітны і адзін з самых цікавых жывапісцаў нашага часу ў Беларусі. Ён пісаў фарбамі толькі па-беларуску! Тое, што ён зрабіў — усё для нашай Радзімы і пра яе.

5. Уладзімір Мулявін. Гэтага чалавека, напэўна, і так усе ведаюць. Па нацыянальнасці Мулявін быў рускім, але тое, што ён зрабіў для Беларусі — гэта подзвіг. Сваім зваротам да беларускасці ён узняў наш нацыянальны аўтарытэт. Яго творчасць — гэта прыклад найвялікшага і найшчырэйшага патрыятызму, да якога Уладзімір Мулявін свядома прыйшоў сам. Кожнаму беларусу варта ў яго гэтаму павучыцца.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

30 лістапада

Дзве даты

1830 год — 180 гадоў таму ў Беларусі, Польшчы і Літве пачалося паўстанне супраць царскай Расіі за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Паўстаўшых падтрымалі жыхары Варшавы і польскія вайсковыя часці. 30 лістапада паўстанцы авалодалі Варшавай. Расійскія войскі вымушаны былі адступіць з горада, а пазней і з усёй тэрыторыі Польшчы. Значная частка іх сканцэнтравалася ў Беларусі. У Варшаве быў сфарміраваны Часовы ўрад. На Беларусь, Літву і Украіну былі накіраваны эмісары, каб узняць там паўстанне. У студзені-лютым 1831 года ў Беларусі і Літве быў створаны падпольны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. У сакавіку-красавіку таго ж года паўстанне ахапіла Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Дзісненскі паветы, у кожным з іх ствараліся ўрады, якія праводзілі рэкруцкі набор у войскі. Да канца мая ў Віленскай і Мінскай губернях паўстанне было падаўлена, але працягвалася ў Гродзенскай губерні, што перашкаджала расійскім войскам рухацца на Польшчу. У чэрвені-ліпені 1831 года паўстанцкія выступленні адбыліся ў Пінскім, Мазырскім, Рэчыцкім, Навагрудскім паветах, а таксама на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай губерняў. У жніўні 1831 года паўстанне ў Беларусі і Літве пацярпела паражэнне, хоць асобныя атрады дзейнічалі і ў верасні.

1872 год — праведзены першы футбольны матч на ўзроўні зборных — гулялі каманды Англіі і Шатландыі.

Цытата дня

«Прапаведаваць тысячам з амвону, заклікаць з трыбуны, вучыць з кафедры значна лягчэй, чым выхоўваць адно дзіця».

Аляксандр Герцэн (1812—1870), рускі пісьменнік, філосаф.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 5



Белыя: Крe1, Лd3, Сс2, Сс7, Кd8, Кe3, п. g5 (7).

Чорныя: Крh3, Кb8, пп. c3, h6 (4).

Мат за 3 хады.

Заданне № 6



Белыя: Крg8, Сg1, Сg2, Кg3, Кg4 (5).

Чорныя: Крg6 (1).

Мат за 5 хадоў.

Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ АДКАЗЫ

Прыводзім адказы на задачы, апублікаваныя 6 лістапада г.г.

М. Быкаў. 1. Фd3!~2. Ф:e4x, 1... Ф:e6 2. Ф:d4x, 1... Кc5 2. Лd6x 1... f5 2. Лe5x, 1... cd 2. Cb3x, 1... ed 2. Cf3x.

А. Лобусаў. 1. Крh2!~2. Кe5+ Ф:e5 2. Кd2x, 2... C:e5 3. Кg5x 1... Фd8 2. Кd4+ Ф:d4 3. Кg5x, 2... C:d4 3. Кd2x, 1... Лf5 2. Кg5+, 1... Сс3 2. Кd2+, 1... c3 2. Кf6! Л:f6 3. Кd4x, 2... C:f6 3. Лf4x.

ТАК ГУЛЯЛІ РАНЕЙ

Камплекты часопіса «Шахматы» — сапраўдная бібліяграфічная рэдкасць (ён выдаваўся вядомым арганізатарам шахматнага руху ў СССР М. Грэкавым з 1922 па 1929 г.). Цікава пазнаёміцца з гульнёй савецкіх майстроў таго часу.

Б. Вярлінскі — Г. Левенфіш

ІСПАНСКАЯ ПАРТЫЯ

1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cb5 a6 4. Ca4 Kf6 5. Kc3 Ce7 6. o-o b5 7. Cb3 d6 8. d3 o-o 9. Kd5 Ka5 10. K:e7 Ф:e7 11. Ke1 K:b3 12. ab Kd7 13. f4? f5! 14. ef Л:f5 15. Kf3 Cb7! 16. Cd2 ef 17. Kd4 Лg5 18. Kf3 Лg4! 19. h3 Л:g2+! 20. Кр:g2 Фg5+ 21. Kph1 Ke5 22. Фe2 Фg3 23. Фg2 K:f3! 24. Cc3 Kd4 25. Ф:b7 Ф:h3+ 26. Крg1 Ke2+ 27. Kpf2 Фc3+, і чорныя фарсіруюць мат за 2 хады.

Партыя згуляная на 4-м усесаюзным чэмпіянаце, Ленінград, 1924 г. Партыя адзначаная прызам за прыгажосць.

Юбілейны конкурс «Уладзімір Папонін»-55»

Часопіс «Уральский проблемист» і газета «На смену!» аб'явілі конкурс складання двухходовак юбілею «В. Папонін-55». Задачы дасылаць на адрас: 624140, Россия, Свердловская обл., г. Кіраград, ул. Мамина-Сибиряка, д. 3, кв. 61. Тэрмін да 1.05.2011 г.

ЗДАЕЦЦА, што зусім нядаўна мы з вамі, дарагія нашы чытачы, рыхтаваліся да сустрэчы новага 2010 года, і вось — бац! — да новага 2011-га застаўся ўсяго месяц! Можа, прадукты закупляць яшчэ і ранавата, а вось пра напоі падумаць трэба загадзя, бо для прыгатавання некаторых з іх патрабуецца некалькі тыдняў. Самае галоўнае правіла для навагодняга стала — не перабраць з алкаголем, таму кактэйль для ўжывання трэба выбраць толькі адзін, інакш рызыкуеце не ўбачыць канец свята і наклікаць на сябе гнеў гаспадара надыходзячага года — Труса (або Ката). Як вядома, гэтыя жывёлы вельмі не любяць п'яных. Таму вызначайцеся з выбарам і захоўвайце меру!

ЛІКЁР «БЕЙЛІС ПА-ХАТНЯМУ»

Вазьміце: *400—500 мл 22-працэнтных вяршкоў, 380 г згушчаных вяршкоў, 100 г горкага шакаладу (без дабавак), 20—30 г ванільнага цукру, 0,3—0,4 л гарэлкі.*

Шакалад дробна паламаем і паставім на вадзяную лазню, дададзім крышку вяршкоў. Змяшаем да атрымання аднароднай масы і адставім на час у бок. У вяршкі дададзім ванільны цукар і ўзаб'ём да поўнага растварэння цукру. Пасля дададзім па чарзе і ўзаб'ём да аднароднага стану астатнія інгрэдыенты (парадак дабаўлення не адыгрывае ролі). Дададзім шакалад, згушчаныя вяршкі і гарэлку.

АПЕЛЬСІНАВЫ ЛІКЁР

Нам спатрэбіцца: *4 апельсіны, 300 г кускавога цукру, 1 кавалачак палачкі карыцы (даўжынёй 5 см), 12—15 зерняў каляндры, 0,7 л каньяку (зразумела, што чым лепшы каньяк, тым смачнейшы лікёр).*

Апельсіны добра прамыць пад струменем кіпеню і абсушыць. З трох апельсінаў надзерці цэдру, белую плёнку старанна выдаліць. Цэдру здрабніць і разам з кавалачкамі цукру і прыправамі пакласці ў шкляны графін з шырокім рыльцам. З апельсінаў адціснуць сок. Пераліць сок у графін, зверху наліць каньяк, усё адзін раз перамяшаць і, шчыльна закаркаваўшы графін, настойваць лікёр на працягу 5—6 тыдняў у цёмным месцы. Адзін раз у тыдзень лікёр перамешваць і ўстрэсваць. Затым прапусціць змесіва графіна праз валасяное сіта або фільтр і, дадаўшы 2—3 свежыя апельсінавыя долькі, пераліць у дэкаратыўны шкляны графін. Закрыць шкляной або драўлянай накрыўкай.

Лікёр вельмі смачны з кубачкам кавы, а таксама ў якасці верхняга слою ванільнага марожанага або пудынгу.

ГАРЭЛКА З ЧЫРВОНЫХ ПАРЭЧАК

На 1 бутэльку вазьміце: *100 г чырвоных парэчак (можна браць замарожаныя), 50 г дробнага цукру, 200—300 мл гарэлкі.*

Ачысціць чырвоныя парэчкі, выкласці іх у чыстую бутэльку і перасыпаць цукрам. Заліць гарэлкай. Закаркаваць бутэльку і патрэсці. Пакінуць як мінімум на 2 тыдні, перыядычна ўстрэсваючы.

Захоўваць напой у халадзільніку, падаваць на стол лепш ахалоджаным.

АМАРЭТА

На 3 шклянкі нам спатрэбіцца: *1 шклянка вады, 1 шклянка белага цукру, 1/2 шклянкі карычневага цукру, 1 шклянка гарэлкі, 2 сталовыя лыжкі міндальнага экстракту, 2 чайныя лыжкі ванільнага экстракту.*

Змяшаць ваду, цукар і карычневы цукар у каструлі на сярэднім агні. Награваць да кіпення, пакуль цукар не растане. Зняць з агню і даць сумесі астыць на працягу 10 хвілін. Уліць гарэлку, міндальны і ванільны экстракт. Змяшаць і захоўваць у закрытай бутэльцы.

ГЛІНТВЕЙН

Вазьміце: *1 л сухога віна, 200 г цукру, 7—8 гваздзік, 3 драбкі молатай карыцы.*

У каструлі літры на 2 змяшайце ўсе інгрэдыенты, давядзіце да кіпення, затым зменшыце агонь і варыце на працягу 15 хвілін. Падаваць на стол можна як у гарачым, так і астылым выглядзе. Адноль кава смачна!

ЛІКЁР «АДВАКАТ»

На 8 яечных жаўткоў: *1 бляшанка варанай згушонкі, 300—400 г цукру, 0,5 л добрай гарэлкі, 1 пакецік ваніліну.*

Жаўткі змяшаць з цукрам і варанай згушонкай. Згушонку лепш варыць самім (бо заводская — несмачная) не больш як 2 гадзіны. Дадаць гарэлку і паціху ўсё гэта перамешваць міксерам да атрымання аднароднай кансістэнцыі. Дадаць ванілін і для характэрнага колеру — крыху жоўтага харчовага фарбавальніка з велікоднага набору. Усё яшчэ раз перамяшаць. Можна адразу піць, а можна настояць тыдзень-другі.

ГАРЭЛКА БЕЛАЯ СТАРАДАЎНЯЯ

Нам спатрэбіцца: *350 г імбіру, 250 г дуброўкі, 350 г шалфею, 350 г мяты перцавай, 350 г анісу, 1 л спірту, 1,5 л вады.*

Складсці ўсе прыправы ў падыходзячы посуд, заліць спіртам і пакінуць настойвацца 18 дзён. Па заканчэнні гэтага часу дадаць у гэтую настойку ключавую ваду (у 1,5 раза больш за спірт).

Гарэлку перагнаць і разліць у бутэлькі.

ЛІКЁР З ЛІМОННАЙ ЛУПІНЫ

Нарэзаць кубікамі лупіну 3 вялікіх або 4 маленькіх лімонаў, заліць 350 г гарэлкі. Шчыльна закаркаваць пасудзіну і вытрымаць у цяпльні 1 суткі. Працадзіць вадкасць і на літр дадаць сіроп, прыгатаваны з 1/2 кг цукру і 1/2 л вады. Лікёр яшчэ раз працадзіць і разліць у бутэлькі.

Такім жа спосабам гатуюць лікёр з апельсінавай лупіны.

ЛІКЁР З НАТУРАЛЬНАЙ КАВЫ

У турку наліць 1,5 шклянкі вады і зварыць 50 грамаў молатай кавы. Шчыльна закрыць посуд накрыўкай і вытрымаць кафейны адвар на працягу сутак. Зварыць густы сіроп з 2,5 шклянкі цукру і 1,5 шклянкі вады. Дадаць у сіроп 1 чайную лыжку лімоннага соку, працэджаны кафейны адвар і 600 мл каньяку. Наліць лікёр у бутэльку і вытрымаць 2—3 тыдні.

БАНАНАВА-МАЛОЧНЫ КАКТЭЙЛЬ

Вазьміце: *2 спелыя бананы, 500 мл малака, 100 мл вяршкоў або ванільнага марожанага, 1 пакецік ванільнага цукру, молатую карыцу на кончыку нажа.*

Усе інгрэдыенты ўзбіваць міксерам каля 2 хвілін да аднароднай масы і растварэння цукру. Падаваць у высокіх шклянках з саломінкай.

Усміхнемся

Сталенне — гэта калі ідзеш па холадзе без шапкі і адчуваеш сябе не крутым, а дурнем.

☺

— Вы чулі, Сёма ўчора адкрыў на Дэрыбасаўскай ювелірную краму!

— Так? І што было?

— Ды нічога. Спрацавала сігналізацыя, і па яго прыехалі...

☺

Вельмі дарагі стыльны рэстаран. Наведнік кліча афіцыянта, той падыходзіць — такі элегантны, паслужлівы. Наведнік:

— Гэтая ваша асятрына зусім неядомая. Забірайце яе і засуньце вашаму шэф-кухару ў... куды-небудзь.

Афіцыянт:

— Жаданне кліента для нас закон. Але вашу просьбу выканаць, на жаль, не магу. Бо туды ўжо засунутыя качка па-пекінску, амары і торт «Фантазія».

☺

— Ты гарэлку наліў?

— Ага.

— І сабе, і мне?

— Ага — і сабе, і мне...

☺

Пара з Расіі прыязджае на курорт. Заходзяць у нумар, размяшчаюцца. Раптам муж чуе крыкі жонкі.

— Тут мыш! А-а-а! Патэлефануй на рэсэпшн, ты хоць штосьці па-англійску ведаеш!

Муж тэлефануе.

— Хэлоў!

— Хэлоў.

— Ду ю ноу «Том энд Джэры»?

— Оф кос.

— Джэры із хіа.



Хлеб ды соль

Бяседныя песні

Песня «Хлеб ды соль» стваралася ў калектыве і для калектыву. Ансамблю народнай музыкі «Бяседа» патрабаваўся ўрачыста-святочны твор, якім добра пачынаць выступленне. У беларускай сямейна-абрадавай і каляндарна-абрадавай музычнай культуры маецца безліч падобных твораў. На кожную святочную дзею, на кожны выпадак заўсёды знаходзілася адпаведная песня, балада ці проста прыпеўка. Але ж цягам часу жыццёвыя рэаліі паступова змяніліся. І ўжо з сучаснымі абставінамі павінен суадносіцца новы песенны тэкст і адпаведнае яго музычнае ўвасабленне.

Мастацкі кіраўнік «Бяседы» Леанід Захлеўны і паэт Леанід Пранчак напісалі такую песню. Мастацка-вобразнай сімволікай яна перадае суладнасць нябесна-зямной прасторы, дзе разгортваецца наша існаванне. У выкананні ансамбля «Бяседа» песня «Хлеб ды соль» гучыць і як жніўная, і як велічальная, і як запрашальная. Такая адметнасць новага твора спрыяе яго пашырэнню сярод люду і асабліва сярод самадзейных артыстаў. А для самога ансамбля «Бяседа» — гэта ўрачыстая візітоўка. Яна прадстаўляе калектыў і яго творчы неўтаймоўны дух на пачатку канцэртных выступленняў.

Верш Леаніда Пранчака. Музыка Леаніда Захлеўнага

Сонца ўсходзіць —
дорыць радасць дню,
Птушкам — голас,
небу — цішыню.
Зорны жнівень —
шчодрае жніво,
Ніва залатая —
лета харство.
Выйду ў поле, звоняць каласы —
Родных ніў жывыя галасы.
І плывуць высока дзіўнаю красой
Песні велічальнай
над маёй зямлёй!

ПРЫПЕЎ:
Хлеб ды соль, хлеб ды соль,
вышыты абрус.
Хлеб ды соль, хлеб ды соль,
маці — Беларусь.
Хлеб ды соль, хлеб ды соль
мы падносім вам.
Хлеб ды соль і наш паклон —
дарагім гасцям!
Хлеб ды соль і наш паклон —
дарагім гасцям!

Кружыцца жыцця вадаварот,
Дні бягуць — бясконцы іх палёт.
А над пожняй скошаных палёў
Развітальным клінам —
вырай жураўлёў.
Бохан хлеба — сонца на руках,
Шчасце ў сэрцы, радасць у вачах.
Спеўны зорны жнівень —
шчодрае жніво,
Ніва залатая — лета харство.

ПРЫПЕЎ.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Праверце, калі ласка, адказы

Сканворд (23 лістапада.)

Па гарызанталі: Нікалаеў. Сват. Біт. Альт. Ліман. Іўе. Рур. Кета. Акат. Ветэрынар. Сакура. Спа. Дама. Старыца. Аха. Дым. Ніл. Адплата. Чачня. Лато. Суд. Грак. Рок. Раб. Амулет. «Кіно». Авар. Бэра. Галыгін.

Па вертыкалі: Грыбалёва. Лушчык. Матка. Анчар. Мухін. Норка. Аляска. Колба. Друкар. Ластаўка. Аліва. Леер. Албена. Ерась. Астат. Торг. Траса. Дог. Карп. Аракс. Луг. Купрыда. Ара. Цытра. Мэта. Гама. Калдун.

Сканворд + судоку (24 лістапада).

Па гарызанталі: Калан. Маналог. Гурт. Рыга. Эму. Факт. Бунт. Рэвіт. Фанаграма. Рыд. Палік. Траса. Сон. Хна. Норка. Дах. Натр. «Мара». Арча. Рым. Муар. Запінкі.

Па вертыкалі: Фрахт. Мароз. Апука. Канстанта. Актэт. Грант. Зруб. Рысора. Уладар. Рэсіфі. Аргон. Коч. Трап. Ас. Лодар. Інары. Гальштук. «Хам». **Судоку**: адказы гл. у табліцы.

1	3	2	8	7	6	5	4	9
8	5	4	9	2	1	7	6	3
9	7	6	5	4	3	8	2	1
7	9	1	3	6	5	4	8	2
3	2	5	4	8	7	9	1	6
6	4	8	1	9	2	3	5	7
4	8	3	2	1	9	6	7	5
2	6	9	7	5	4	1	3	8
5	1	7	6	3	8	2	9	4

Сканворд (25 лістапада.)

Па гарызанталі: Пачастунак. «Рэпка». Бокс. Пюрэ. Рыба. Купа. Аглобля. Лайка. Нюх. Поп. Бабка. Драгун. Лік. Рыса. Жакан. Нікацін. Амід. Кінафільм. Каза. Ода. Дол. Прысмак. Слуп. Амар. Карат. Цнота. Лоб. Акра. Нуварыш.

Па вертыкалі: Дранікі. Рэйка. Сказ. Амаду. Капулеці. Оптыка. Оні. Ідал. Пяро. Кон. Акцёр. Экран. Кайман. Чыпсы. Арол. Бах. Пратон. Ачаг. Табу. «Любэ». Фры. Ралі. Бобрык. Лом. Сальда. Пуня. Адан. Макінтош.

МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ ДЭПАРТАМЕНТ АХОВЫ

АХОВА

ПАД ЗНАКАМ САВЫ

№ 11 (15)

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

„ПОПЫТ НА НАШЫ ПАСЛУГІ РАСЦЕ, І МЫ НЕ СЯДЗІМ НА МЕСЦЫ, ПАШЫРАЕМ ГЕАГРАФІЮ, ПРАПАНОЎВАЕМ ІНШЫЯ СПОСАБЫ ЗАХАВАНАСЦІ МАЁМАСЦІ, АКРАМЯ РЭАГАВАННЯ СВАІМІ НАРАДАМІ"

„ЧАС ПАКАЗВАЕ, ШТО ПРАЦАВАЦЬ У ГРУПЕ ЗАТРЫМАННЯ ДАВОЛІ НЯПРОСТА, А АД МІЛІЦЫЯНЕРА-ВАДЗІЦЕЛЯ НАПРАМУЮ ЗАЛЕЖЫЦЬ АПЕРАТЫЎНАСЦЬ І МАГЧЫМАСЦЬ ЗАТРЫМАННЯ ЗЛАЧЫНЦА ПА «ГАРАЧЫХ» СЛЯДАХ"

Сям'я, сямейны падрад, сямейныя традыцыі, сямейная дынастыя... Спіс выразаў і словазлучэнняў са словам «сям'я» можна яшчэ працягваць. Але ж сутнасць яе была і застанецца нязменнай — гэта праца ці служба пры поўным узаемаразуменні і дапаўненні адно аднаго.

СЁННЯШНІ СПЕЦВЫПУСК «АХОВА» МОЖНА ЛІЧЫЦЬ ПА-САПРАЎДНАМУ СЯМЕЙНЫМ

Кампетэнтна

На актуальныя пытанні месяца адказвае першы намеснік начальніка Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь Уладзімір Міхалаевіч КАРШАКОЎ.

— Закончыўся дачны сезон. Як ён звычайна ўплывае на статыстыку прыросту і змяншэння ахоўваемых памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян для падраздзялення Дэпартамента аховы?

— Дачны сезон, як і пара водпускаў, натуральна ўплываюць на колькасць ахоўных кватэр. Выязджаючы на працяглы час з гарадоў, грамадзяне заключаюць з намі дагаворы на забеспячэнне захаванасці іх маёмасці. А калі яны вяртаюцца з прыходам халадоў дадому, адбываецца часовае скасаванне дагавораў. Але ж абсталяванне, за якое ўласнік ужо заплаціў, застаецца. І на наступны год сітуацыя зноў паўторыцца. Бо практычна ніколі мы не давалі нагоды сумнявацца ў якасці нашых паслуг, прафесійна выконваючы работу.

— Ва ўмовах росту цэн на тавары і паслугі, ці не змяншаецца колькасць гаспадарнікаў і ўладальнікаў кватэр, якія жадаюць заключыць дагаворныя адносіны з Дэпартаментам аховы?

— Фінансавыя праблемы, безумоўна, уплываюць на магчымасці грамадзян набыць той ці іншы тавар, скарыстацца той ці іншай паслугай. Што датычыцца юрыдычных асоб, то разлік тарыфаў звязаны з многімі фактарамі, у тым ліку і з установленай у дзяржаве велічынёй заработнай платы. Паколькі яна змянялася, раслі і тарыфы на паслугі. Мы, са свайго боку зрабілі ўсё магчымае, каб мінімізаваць рост цэн.

А вось для ўладальнікаў кватэр і дамоў, так званых фізічных асоб, вось ужо 3 гады цана на нашы паслугі застаецца нязменнай — палова базавай велічыні ў месяц. І ахвотных абараніць сваю маёмасць менш не становіцца, бо мы нясём поўную матэрыяльную адказнасць і тым самым на рынку паслуг бяспекі, калі можна так сказаць, не маем канкурэнтаў. Статыстыка гаворыць сама за сябе: з пачатку гэтага года мы прынялі пад сваю апеку 11,5 тысячы памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян, амаль 4,5 тысячы гаспадарнікаў заключылі з намі дагаворныя адносіны, намі прадухілена паўтысячы спроб пранікнення на ахоўныя аб'екты.

— Ці аказвае Дэпартамент аховы паслугі па ахове дома-ўладанняў і аб'ектаў, якія знаходзяцца на значнай адлегласці ад гарадоў, у якіх дыслакуюцца яго рэгіянальныя падраздзяленні? Калі так, то якімі спосабамі?

— Да лістапада 2008 года мы сапраўды ахоўвалі толькі аб'екты, якія знаходзяцца ў гарадах, дзе дыслакуюцца нашы падраздзяленні. Але ўлічваючы пажаданні грамадзян і юрыдычных асоб, мы прынялі рашэнне аб пашырэнні «геаграфіі» сваіх паслуг.

На сёння мы «абслугоўваем» амаль 1200 памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян, размешчаных па-за зонай дыслакацыі аддзелаў і аддзяленняў. У нас ёсць пэўныя нарматывы па суадносінах колькасці груп затрымання і ахоўных аб'ектаў да адлегласці да іх, і наўрад ці яны цікавыя абывацелю. Але вось некалькі лічбаў: на адлегласці да 1—5 км ад зоны дыслакацыі падраздзяленняў мы ахоўваем 586 памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян, 5—10 км — 138 памяшканняў, 10—15 км — 65 памяшканняў, звыш 15 км — 70 памяшканняў. Попыт на нашы паслугі расце і мы не сядзім на месцы, пашыраем геаграфію, прапаноўваем іншыя спосабы захаванасці маёмасці, акрамя рэагавання сваімі нарадамі. Калі набіраецца дастатковая колькасць аб'ектаў і ёсць эканамічная магчымасць, мы ўводзім і дадатковыя экіпажы ў гэтай мясцовасці. У кожным канкрэтным выпадку мы індывідуальна падыходзім да патэнцыяльнага заказчыка. Таму не саромейцеся звяртацца — мы заўсёды ідзём насустрач, «асвойваем» новыя тэрыторыі і ўкараняем тэхнічныя навінкі. А сваімі пажаданнямі вы толькі дапамагаеце нам дынамічна развівацца.

Сям'я служыць разам!

25 лістапада адбылася традыцыйная штогадовая рэспубліканская акцыя Міністэрства ўнутраных спраў «Сям'я! Служым разам!». Усе падраздзяленні міністэрства прапанавалі для ўдзелу ў ёй сваіх кандыдатаў. У Дэпартаменце аховы вартых прэтэндэнтаў, як заўсёды, аказалася нямала. Па сутнасці, у ахове прайшоў свой, папярэдні конкурс. Няпроста было і журы выбраць кандыдатаў. Пра некаторыя сем'і і дынастыі мы раскажам у гэтым нумары газеты, і чытач сам зможа пазнаёміцца з імі, зрабіць свой выбар.

Пасля доўгіх спрэчак было вырашана, што прадстаўляць дэпартамент на сцэне сярод мноства сем'яў з іншых упраўленняў і службаў міністэрства, будзе маладая сям'я сяржантаў міліцыі Федарэнчыкаў з Мінска. Абое сужэнцы працуюць у Мінскім гарадскім упраўленні аховы, толькі тэрытарыяльныя падраздзяленні ў іх розныя: ён — міліцыянер групы затрымання ў Партызанскім, яна — міліцыянер асобнага батальёна ў Заводскім аддзелах.

Лёсы двух любячых сэрцаў аб'ядноўваюцца на нябёсах, а ў мірскім жыцці гэтаму садзейнічаюць розныя абставіны. Вось так і нашы пераможцы сустрэліся на першапачатковай падрыхтоўцы ў вучэбным цэнтры Дэпартамента аховы. Яшчэ зусім маладыя, але поўныя сіл і планаў на будучыню, Кацярына і Алег вырашылі стварыць сям'ю і быць разам у жыцці, і ў службе. Гэта не пустыя словы, яны сапраўды ўсё і заўсёды робяць разам: прымаюць актыўны ўдзел у спартыўных святах сваіх падраздзяленняў, вельмі часта самі з'яўляюцца ініцыятарамі спартыўна-забаўляльных мерапрыемстваў. Галоўнае — не сядзець склаўшы рукі.

Алег з'яўляецца кандыдатам у майстры спорту па вольнай барацьбе, два гады запар удзельнічае ў чэмпіянатах Мінскага гарадскога ўпраўлення па самба, займаючы прызавыя месцы. Калегі па працы адклікаюцца аб ім і жонцы толькі са станоўчага боку, ім прыемна назіраць за яшчэ зусім маладой сям'ёй, якая афарміла свае адносіны ў 2008 годзе. «На Алега і Кацярыну немагчыма глядзець без усмешкі, — дзеляцца таварышы, — яны настолькі пяшчотна і шчыра клапоцяцца адно аб адным, перажываюць і ва ўсім стараюцца падтрымаць сваю другую палавінку. Агульная прафесія ім не толькі не перашкаджае, але і дапамагае спрыяльнаму клімату ў сям'і, і гэта факт».

Кацярына нясе службу на пастах вельмі буйных і важных аб'ектаў Заводскага раёна. Праца Алега не менш складаная і адказная, ён — міліцыянер-вадзіцель групы затрымання — выязджае на рэгулярныя «спрацоўкі» аб'ектаў, затрымлівае зламыснікаў і парушальнікаў грамадскага парадку. Служба забірае мноства сіл і часу. Але яны не прывыклі скардзіцца.

Маладым заўсёды і ўсюды дарога! Таму кіраўніцтва Дэпартамента аховы выдзяляе сваіх «навічкоў» і клапоціцца аб іх. Тым большая адказнасць кладзецца на плечы сужэнцаў, якія штодзень знаходзяцца на вачах. Таму Кацярыне і Алегу мы жадаем заўсёды і ва ўсім быць лепшымі, паважаць і шчыра ставіцца адно да аднаго, пацвердзіць паўнацэннасць сям'і магчымым папаўненнем, стварыць яшчэ адну дастойную дынастыю супрацоўнікаў аховы.

У ІХ ДОМЕ ЗАЎСЁДЫ ЦЁПЛА

У аснову моцнай сям'і заўсёды закладваюцца «цаглінкі» кахання, павагі, узаемаразумення, даверу і агульных інтарэсаў. У многіх пункты судакранання сходзяцца на выхаванні дзяцей, стварэнні сямейнай утульнасці. Іншым жа, акрамя ўсяго іншага, выпадае знаходзіцца побач фактычна 24 гадзіны ў суткі, бо працаваць прыходзіцца плячо ў плячо, як нашым героям.

Супрацоўнікі Шклоўскага аддзела Дэпартамента аховы, а па сумяшчальніцтве сужэнцы Апулінскія — Таццяна і Аляксандр. Муж — міліцыянер-вадзіцель групы затрымання, а жонка — бухгалтар.

Таццяна закончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання па спецыяльнасці «эканаміст» і пра іншы горад, акрамя Шклова, нават не думала. Пасля атрымання адукацыі яна ўладкавалася ў адну буйную арганізацыю, але 5 гадоў назад па волі выпадку перайшла ў Шклоўскі аддзел аховы. Спачатку Таццяна хвалявалася, як яе прымуць у новым калектыве, тым больш што тут ужо працаваў яе муж. Аднак баялася яна дарэмна: калектыў з радасцю і дабрадушнасцю аднёсся да новай супрацоўніцы. Апынуўшыся пад апекай граматнага і вопытнага галоўнага бухгалтара аддзела, Таццяна хутка асвоілася з колам сваіх абавязкаў. І ў хуткім часе яна паказала сябе цярплівым, старанным, добрасумленным і дысцыплінаваным работнікам. Ёй уласцівыя патрабавальнасць да сябе і іншых, бо бухгалтэрыя не церпіць недакладнасці, пры гэтым яна заўсёды тактоўная ў зносінах.

Шмат добрага можна пачуць і пра Аляксандра, які на службе зарэкамендаваў сябе прафесіяналам. Працаваць у групе затрымання даволі няпроста, а ад міліцыянера-вадзіцеля напрамую залежыць аператыўнасць і магчымасць затрымання злачынца па «гарачых» слядах. Прапаршчык Апулінскі бездакорна спраўляецца з пастаўленымі задачамі, добра ведае размяшчэнне ахоўных аб'ектаў і іх уразлівыя месцы. Пры паступленні сігналу «трывога» дзейнічае тактычна правільна, хутка прымае рашэнні. Пастаянна ўдзельнічае ў рэйдах па выяўленні «несуноў» і парушальнікаў грамадскага парадку. Калегі лічаць яго надзейным таварышам і адказным супрацоўнікам.

На думку пары Апулінскіх, работа ў адной арганізацыі нікольні не шкодзіць іх асабістым адносінам. Дома яны занятыя выхаваннем дваіх сыноў — Уладзіслава і Дзмітрыя. Старэйшаму Уладзіславу сем гадоў, і хлопчык ва ўсім стараецца быць падобным на бацьку. Але часцінку творчасці «пазычыў» у мамы, якая любіць вышыванне і іншае рукадзелле: хлопец удзельнічае ў конкурсах дзіцячага малюнка, дзе яму бліжэй за ўсё тэма роднай зямлі. Дзмітрыю ўсяго тры гадкі, але, раўняючыся на старэйшага брата, гаворыць, што марыць стаць міліцыянерам, як тата. З дзіцячым гонарам надзявае бацькоўскую фуражку, калі той вяртаецца са службы.

У планах сям'і Апулінскіх добраўпарадкаванне дома, які яны спланавалі і пабудавалі самі. Справа засталася за канчатковым аздабленнем. А астатняе, як кажуць яны, «само сабой дадасца, бо цяпло ў сям'і можа быць толькі ў працавітых людзей і любячых бацькоў».

РАЗАМ СЛУЖБА — ЖЫВЕЦЦА ДРУЖНА

Існуе думка, што ў сужэнцаў, якія разам і дома, і на працы, неўзабаве пачынаюць узнікаць канфлікты, якія могуць прывесці да распаду сям'і. Але сям'я Маршалок з Гродзенскага абласнога ўпраўлення аховы з гэтым зусім не згодная.

Міхаіл Іосіфавіч пачынаў сваю службу з пасады малодшага інспектара аховы — вадзіцеля ўпраўлення. І вось ужо на працягу 25 гадоў не здраджвае любімай справе. Нават пасля звальнення ў запас старэйшы Маршалок не стаў сядзець без справы і зноў вярнуўся ў родны калектыў. А прынялі яго, як кажуць, сардэчна. За доўгія гады службы нараканняў з боку кіраўніцтва ў адносінах да Міхаіла Іосіфавіча не было ніколі. Яго працавітасць і добрасумленныя адносіны да любімай справы неаднаразова адзначаліся і заахвочваліся. Да сваёй работы ставіцца адказна, нават калі выезды не плануюцца, яго заўсёды можна заспець на службе за якой-небудзь справай. Аўтамабіль — гэта яго захапленне і страсць. А яшчэ Міхаіл любіць адпачываць на прыродзе, на беразе рэчкі або возера з вудачкай у руках.

Яго жонка Людміла прыехала ў Беларусь з Карэліцкай АССР. Нейкі час працавала лабарантам на прадпрыемстве «Гродна-Азот». Са з'яўленнем першынца вырашыла змяніць работу і ўладкавалася памочнікам выхавальніка ў дзіцячы садок. А ў 1998 годзе ў абласным упраўленні вызвалілася пасада загадчыка склада, і Міхаіл прапанаваў жонцы працаваць у адной структуры з ім. Вось ужо 12 гадоў Людміла працуе ў Гродзенскім абласным упраўленні. За сваю стараннасць, дысцыплінаванасць і ўважлівасць яна заслужыла вялікую павагу з боку кіраўніцтва.

Сям'я Маршалок складаецца з чатырох чалавек: Міхаіл Іосіфавіч з жонкай і два сыны. Старэйшы Аляксандр пайшоў па слядах бацькі. Праслужыўшы чатыры гады па кантракце ў вайсковай часці № 1234 у горадзе Ліда, ён адназначна і дакладна для сябе вырашыў, што прафесія вадзіцеля — гэта яго прызванне. Тым больш, што багаты бацькоўскі вопыт стаў яркім прыкладам. У часці Саша быў вадзіцелем-кантралёрам, пасля службы міліцыянерам батальёна. Цяпер жа Аляксандр Маршалок працуе міліцыянерам-вадзіцелем у адным упраўленні з бацькамі і нікольні не шкадуе аб выбранай прафесіі. Толькі малодшы сын выбраў зусім іншы шлях, стаўшы тэхнікам па падрыхтоўцы вытворчасці ў ААТ «Гроднапрамбуд».

Як прызнаецца сямейства, сумесная служба дапамагае вырашаць многія праблемы. Бо, калі родныя людзі побач, значна лягчэй перажываць прафесійныя няўдачы і ўтрая прыемней радавацца поспехам і дасягненням адно аднаго.

У Аляксандра падрастаюць двое дзетак: чатырохгадовы сынок і аднагадовая дачушка. Можа, яны ў далейшым працягнуць існуючую сямейную традыцыю — працу ў ахове.

Рэцэпт сямейнага шчасця ад сям'і Маршалок: любіць і разумець сваіх блізкіх, і тады ўсё атрымаецца.

Нітачка з іголачкай

Як вядома, у магніце ёсць дзве супрацьлеглыя палярнасці, за кошт чаго і адбываецца прыцяжэнне. Ва ўтварэнні сям'і Носавых магнітам сталі органы ўнутраных спраў, а палярнасцямі — пасады, якія яны займаюць.

Валерый працаваў оперупаўнаважаным у 6-м аддзеле УУС Брэсцкага аблвыканкама, Алена — следчым Ленінскага (г. Брэста) РУУС. У той момант у працы іх аб'ядноўвала толькі адно — гэта абсалютная адсутнасць свабоднага часу. Аднак менавіта кантакты па службе далі магчымасць маладым людзям пазнаёміцца і ў далейшым стварыць сям'ю.

Сёння сям'я Носавых служыць у Дэпартаменце аховы: Валерый — камандзір асобнай роты міліцыі Брэсцкага абласнога ўпраўлення, Алена — старшы інспектар групы кадраў Ленінскага (г. Брэста) аддзела аховы. «Гэта пара — быццам нітачка з іголачкай, — падкрэслівае начальнік Брэсцкага аблупраўлення Алег Самасюк, — яны заўсёды разам. Гледзячы на іх, здаецца, што няма ні клопатаў, ні бытавых праблем. Валерый і Алена любячыя бацькі двух цудоўных дзяцей — Глеба і Міланы. Яны — увасабленне моцнай і дружнай сям'і».

З'яўляючыся кіраўніком, падпалкоўнікам міліцыі, Валерый прыцягвае да сябе шчырай добразычлівасцю да суразмоўцы, здольнасцю спакойна выслухаць, не навязваючы ўласнай думкі. Менавіта гэта дапамагае яму згуртаваць калектыў, настроіць на рабочы лад. Яшчэ вельмі важнай яго якасцю з'яўляецца ўменне трымаць слова, выканаць любое абяцанне ў тэрмін. Ён адказна і скрупулёзна адносіцца да пастаўленых задач і даручэнняў. Ёсць у Носава яшчэ адзін прынцып: хто добра працуе, той добра адпачывае, — таму ў вольны ад службы час не прапусціць магчымасці парыбачыць і папаляваць.

Маёра міліцыі Алену Носаву можна па праве назваць працаголікам. Адказваючы на бясконцыя службовыя пытанні, яна ўсё паспявае і па службовых абавязках. Не толькі з'яўляецца прафесіяналам у кадравай рабоце, але і актывістам у грамадскім жыцці калектыву. Афіцэра цэняць і за працавітасць, і за яе прыветлівасць, жыццярадаснасць і ўменне разрадзіць абстаноўку, схіліць да сябе самага хмурага чалавека. Валодаючы вялікім творчым патэнцыялам і прафесіяналізмам у рабоце, яна заўсёды гатовая прыйсці на дапамогу любому. Але калі даведаецца пра тое, што хтосьці з яе знаёмых зрабіў подласць або павёў сябе дрэнна, спыняе падтрымліваць з ім адносіны. У вольны ад службы час Алена цалкам і з задавальненнем паглыбляецца ў хатнія клопаты. Дзякуючы свайму захапленню — рукадзеллю — яна бярэ ўдзел у конкурсах народнай творчасці.

Валерый — ініцыятар усялякіх сямейных святаў, турпаездак, а Алена ўсяляк падтрымлівае мужа.

ІХ АБ'ЯДНАЎ ФУТБОЛ...

Вельмі часта ў жыцці здараецца, што людзі знаходзяць адно аднаго, не прыкладаючы асаблівых намаганняў, як у песні: «Любовь нечаянно нагрянет, когда ее совсем не ждешь...». У адносінах Міхаіла і Вольгі Літвінавых менавіта так і адбылося. Міліцыянер Наваполацкага аддзела аховы ехаў на спаборніцтвы па футболе ў Віцебск, а вартаўнік Кастрычніцкага (г. Віцебска) аддзела аховы аказалася заўзятай футбольнай балельшчыцай каманды свайго падраздзялення.

Маладыя людзі з першага позірку спадабаліся адно аднаму, сталі кантактаваць і сустракацца па выхадных. Аказалася, што ў іх шмат агульнага: Вольга таксама была ўраджэнкай Наваполацка, а ў Віцебск трапіла па размеркаванні пасля тэхнікума. Іх інтарэсы і погляды на жыццё сышліся, і праз паўтара года яны зразумелі, што не могуць жыць на адлегласці.

Вось ужо 10 гадоў Міхаіл і Вольга з гордасцю называюць сябе сям'ёй. Гэты статус пацвярджаюць не толькі цёплымі і пяшчотнымі ўзаемаадносінамі, але і сваім галоўным «багаццем» — двума сынамі. Старэйшы Кірыл, як і бацька, мэтанакіраваны і рашучы, наведвае секцыю каратэ і рыхтуецца паступаць у Суворaўскае ваеннае вучылішча, Арцемій маладзейшы за брата на два гады, але стараецца ні ў чым не саступаць.

Сям'ю Літвінавых па праве можна назваць міліцэйскай, таму што муж і жонка працуюць у Наваполацкім аддзеле аховы. Міхаіл — памочнік камандзіра ўзвода роты міліцыі, а Вольга — кіраўнік групы рэжымна-сакрэтнай дзейнасці. Пра прапаршчыка Літвінава гавораць як пра сумленнага, справядлівага і надзейнага таварыша, а таксама мудрага настаўніка для маладых супрацоўнікаў. Ён актыўна ўдзельнічае ў спартыўных мерапрыемствах аддзела, гуляе за зборную каманду Віцебскага абласнога ўпраўлення па міні-футболе. Вольга — чалавек, які валодае невычэрпнай станоўчай энергіяй, якая зараджае ўвесь калектыў. Разам яны часта выступаюць арганізатарамі правядзення розных мерапрыемстваў, розных экскурсійных паездак з удзелам калектыву падраздзялення і членаў іх сем'яў.

Свой вольны час сям'я Літвінавых стараецца правесці з максімальнай карысцю і інтарэсам, ды і заняткі знаходзяць вельмі розныя. Але ўсім чацвярым футбол — бліжэй за ўсё. Летам займаюцца турызмам, прагулкамі на конях, а зімой — катаннем на каньках.

Самае важнае для Літвінавых — быць заўсёды і ўсюды разам!

На пытанне, «што для вас значыць сям'я?», адказваюць па-рознаму.

Міхаіл: «Сям'я — надзейны тыл, дзе мне заўсёды рады, дзе мяне любяць і чакаюць, дзе заўсёды зразумеюць і падтрымаюць у цяжкую хвіліну».

Вольга: «Сям'я — гэта сэнс жыцця, самае дарагое і бясцэннае, што ёсць у мяне».

ПА ПРЫКЛАДЗЕ БАЦЬКОЎ

У Гомельскім абласным упраўленні для ўдзелу ў акцыі «Сям'я! Служым разам!» калектыў і кіраўніцтва аднадушна выбралі сям'ю капітана міліцыі Ігара Шыльца. Так склалася, што Юрый з'яўляецца харашыстам ва ўсім: паспяхова закончыў Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум, затым Акадэмію МУС, а ў родным Цэнтральным аддзеле аховы старанны і ініцыятыўны міліцыянер вельмі хутка стаў камандзірам узвода. Гэта неверагоднае імкненне і мэтанакіраванасць з'яўляюцца для капітана Шыльца свайго роду «візітнай карткай». Нездарма менавіта яму даверылі ўзначаліць пярвічную арганізацыю Грамадскага аб'яднання «БРСМ». І не прагадалі: праз пару гадоў пярвічная арганізацыя Цэнтральнага (г. Гомеля) аддзела аховы на фестывалі «Мы лепшыя ў БРСМ!» перамагла сярод мноства пярвічак воінскіх часцей, структурных падраздзяленняў МУС і МНС.

У асабістым жыцці Юрыя таксама ўсё гладка: ён — любячы муж і бацька шасцігадовага малога. Жонка Вольга працуе вядучым бухгалтарам Гомельскага вагонарамонтнага завода. У вольны час разам з мужам займаецца спортам, з'яўляецца кандыдатам у майстры спорту па настольным тэнісе, займае прызавыя месцы, выступаючы на спаборніцтвах за сваю арганізацыю. Мужа лічыць лепшым сябрам і дарадчыкам, таму ўсё стараецца рабіць разам з ім. Як з карысцю правесці выхадныя, доўга думаць не прыходзіцца — кожны стараецца знайсці занятак па інтарэсах, ды і сын Уладзіслаў не дае сумаваць бацькам. Рухомыя гульні, лепка з пластыліну, маляванне, спевы і яшчэ многае іншае малы гатовы падзяліць з татам і мамай. У мінулым годзе сям'я Шыльц удзельнічала ў раённым і гарадскім конкурсах маладых сем'яў «Наша дружная сям'я», дзе заняла прызавыя месцы.

На пытанне, хто для вас з'яўляецца прыкладам для пераймання ў сямейным жыцці, Юрый, не задумваючыся адказвае: «Мае бацькі! Менавіта дзякуючы маім маме і тату я сфарміраваўся як асоба, вызначыўся з выбарам прафесіі і выбудаваў цёплыя і добрыя ўзаемаадносіны з уласнай сям'ёй». Дарэчы, яго мама, Таццяна Іграўна, працуе дзяжурнай пульта цэнтралізаванага назірання Чыгуначнага (г. Гомеля) аддзела аховы. А бацька, Ігар Рыгоравіч, маёр міліцыі ў запасе, цяпер працуе ахоўнікам у гэтым жа аддзеле.

Удзячным, любячым і шчырым людзям для шчасця патрэбна зусім няшмат. А шчасце першакласніка Уладзіка Шыльца — калі мама і тата побач!

Матэрыялы падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Аляксандр ГЕРАСІМАЎ, Алена ЯРМАЛІНСКАЯ, Аксана САЛЯНЮК, Вольга КІПЧАНКА, Наталля ЛЕРНАТОВІЧ, Мікалай ЛОЙША, Андрэй МАСЦЕРАЎ, Аляксандр АКСЁНАЎ .

Поўны сіл і энергіі

Свой 85-гадовы юбілей адзін з найстарэйшых ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і службы аховы Фёдар Малахавіч Супрановіч з задавальненнем пагадзіўся сустрэць у калектыве Дэпартамента аховы.

Калі гітлераўцы прыйшлі на тэрыторыю Беларусі, Фёдару Супрановічу не было яшчэ і 16 гадоў. Тым не менш, з першых жа дзён ён актыўна ўключыўся ў барацьбу з ворагам. Камандаванне партызанскіх атрадаў даручала яму самыя адказныя заданні, звязаныя з разведвальнай і дыверсійнай дзейнасцю. Двойчы паранены і кантужаны, Фёдар Супрановіч быў эвакуяваны. Пасля лячэння ў шпіталі малады чалавек, які ўжо дасягнуў прызыўнога ўзросту, апынуўся ў радах Чырвонай Арміі. Вайна Фёдара Малахавіча не скончылася нават пасля яго ўдзелу ў баявых дзеяннях на Далёкім Усходзе, таму што пасля вяртання ў Беларусь ён быў прыняты на службу ў органы дзяржбяспекі і браў удзел у ліквідацыі шматлікіх бандаў. Пазней Супрановіч стаў супрацоўнікам Міністэрства ўнутраных спраў, прыняўшы пасаду намесніка начальніка ўпраўлення пазаведамаснай аховы. Як адзначыў на сустрэчы з юбілярам намеснік начальніка дэпартамента палкоўнік міліцыі Аляксандр Старавойтаў, які ўзначальвае ўпраўленне сродкаў і сістэм аховы, «з Фёдара Малахавіча, па сутнасці, і пачыналася стаўленне нашага сённяшняга ўпраўлення; нам не сорамна глядзець Вам у вочы і ёсць чым ганарыцца».

Нават пасля выхаду на заслужаны адпачынак Фёдар Малахавіч, як кажа ён сам, адпачываць катэгарычна адмаўляецца. Ён па-ранейшаму поўны сіл і энергіі і знаходзіцца ў выдатнай фізічнай форме. Супрановіч не толькі з'яўляецца ўдзельнікам многіх грамадскіх і службовых мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў падраздзяленнях аховы, але і замацаваны за чатырма сталічнымі школамі. Сустракацца з дзецьмі яму асабліва прыемна, паколькі яны — самыя ўдзячныя слухачы і пастаянна «засыпаюць» ветэрана пытаннямі, звязанымі з гістарыяй ваеннага ліхалецця, стаўлення службы аховы. А маладым супрацоўнікам, якія ўступілі ў рады ахоўнікаў, заўсёды пачэсна атрымліваць табельную зброю або пагоны з рук заслужанага і легендарнага чалавека.

На сённяшнім мерапрыемстве Фёдару Супрановічу, акрамя Падзякі начальніка Дэпартамента аховы і букета кветак, была ўручана таксама Грамата міністра ўнутраных спраў — за неацэнны ўклад у выхаванне падрастаючага пакалення. Асабовы склад дэпартамента ад усёй душы віншуе Фёдара Малахавіча з яго юбілеем і жадае здароўя, доўгіх гадоў жыцця, любові дзяцей і ўнукаў яго вялікай і дружнай сям'і!

БЕЛАРУСЬ — ІТАЛІЯ — ДЗЕЦІ

ЧАСТКА І. Гісторыя любові

ДЗЕ і калі пачынаецца бяда? Дзе мы робім промах, які выклікае лавіну праблем, што хавае пад сабою ўсё добрае ў нашым жыцці? У нашым і ў жыцці блізкіх нам людзей. Невінаватых. Чужыя бачаць толькі вынік. Ці здольны нешта ўбачыць вінаваты? Ды і ці магчыма вызначыць чыю-небудзь долю віны ў трагедыі? У тым ліку тых, хто стаяў у баку...

А вынік на вачах: разбураныя сем'і, асірацелыя дзеці. Хворыя. Без шанцаў на шчасце. Бацькі згубілі добрае, што мелі. Дзеці могуць так і не спазнаць у сваім жыцці нічога добрага.

Але самае складанае пытанне тут адрасавана не бацькам. А кожнаму з нас. Не важна, ведаем мы асабіста некага з такіх дзяцей ці толькі бачылі сацыяльную рэкламу па тэлебачанні.

Важна — як мы на гэтае пытанне адказваем. Самы просты, бяспечны і зручны варыянт: у іх — сваё жыццё, у нас — сваё. Да таго ж, дзяржава дастаткова клапоціцца пра гэтых дзяцей (дарэчы, выдаткоўваючы на іх частку заробленых намі грошай).

Аднак ёсць людзі, якія думаюць і робяць інакш. Яны лічаць, што з імі нічога не станецца, калі яны запросяць такіх дзяцей у свой дом і паставяцца да іх з любоўю. Каб менш заставалася на зямлі людзей, якіх ніхто ніколі не любіў. Гэтак цяжэй. Бо такі выбар адразу цягне за сабой абавязацельствы, клопат, сумненні, перажыванні, расчараванні, у тым ліку ў сабе самім. А галоўнае, што гэта — назаўсёды. І не факт жа яшчэ, што шанцы на шчасце ў дзіцяці павялічацца.

Каця Сланеўская, выпускніца Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната для дзяцей-сірот, трапіла ў праект у жніўні 2009 года, ужо пасля таго, як «Дом Пінокіа» рашэннем Докшыцкага райвыканкама быў закрыты. Пражывае ў прыватным доме, які купілі італьянцы. Працуе на ферме ў вёсцы Бабцы.

ГІСТОРЫЯ СУСТРЭЧЫ

Пятнаццаць гадоў таму некалькі дзясяткаў сем'яў аднаго з каталіцкіх прыходаў у Рыме запрасілі да сябе дзяцей, якія прыехалі ў Італію на аздараўленне з беларускага пасёлка Бягомль. Гэта былі малодшыя вучні дапаможнай школы-інтэрната для дзяцей-сірот. У гэтую ўстанову звычайна трапляюць дзеці з дыягназам «разумовае адставанне», якія засталіся без апекі бацькоў, — з усёй Віцебскай вобласці. Сярод прыхаджан, якія прытулілі беларускіх школьнікаў, былі і члены добраахвотніцкай асацыяцыі «Кавала бьянка» (Il Cavallo Bianco).

Гэтая асацыяцыя аб'ядноўвае маладых людзей з псіхічнымі асаблівасцямі і без з мэтай іх культурнай, сацыяльнай і працоўнай інтэграцыі ў грамадстве. Падобныя суполкі ў Італіі іграюць важную ролю ў аказанні дапамогі людзям з псіхічнымі захворваннямі і іх сем'ям. Трыццаць два гады таму італьянскі парламент прыняў знакаміты закон №180, які прывёў да закрыцця псіхіятрычных клінік у краіне і здолеў перамяніць адносіны грамадства да людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Менавіта «Кавала бьянка», якая на момант першага візіту бягомльскіх сірот мела ўжо 8-гадовы вопыт работы з «асаблівымі» маладымі людзьмі, прапанавала беларускай групе падрыхтаваць сумеснае тэатральнае прадстаўленне — каб праз акцёрскую гру дапамагчы дзецям хутчэй разняволіцца і бліжэй з імі пазнаёміцца. Тады бягомльскія выхаванцы інсцэніравалі казку, добра знаёмую ў абедзвюх краінах, — гісторыю пра незвычайнага хлопчыка Пінокіа.

Спектакль атрымаўся выдатны. Нашы дзеці не проста ўразілі італьянцаў. Самі італьянцы кажуць: яны ўвайшлі ў нашы сэрцы. Напэўна, так. Дакладна тое, што нашы дзеці назаўсёды ўвайшлі ў жыццё гэтых людзей.

З таго часу выхаванцы бягомльскай школы-інтэрната сталі прыязджаць у Рым па некалькі разоў на год. З 2000 года добраахвотніцкая асацыяцыя «Кавала бьянка» дапамогу Бягомльскай школе-інтэрнату ўключыла ў пералік сваіх найбольш значных праектаў: асобная рубрыка «Дзеці Бягомля» з'явілася на сайце арганізацыі (www.ilcavallobianco.it), быў аб'яўлены збор сродкаў для аказання гуманітарнай дапамогі, асацыяцыя фінансавала рэканструкцыю часткі будынка інтэрната, спартыўны і тэатральны фестывалі ў Бягомлі, падаравала інтэрнату камп'ютары з праграмным забеспячэннем і прынтары...

Нашы дзеці рэгулярна станавіліся галоўнымі ўдзельнікамі паспяховых тэатральных праектаў у Рыме, яны выступалі ў тэатрах Вале і Арноне, а таксама ў шматлікіх хэпінінгах (адмысловыя пастаноўкі на вуліцах горада). «Пінокіа», дарэчы, ставілі неаднаразова, так што спектакль стаў своеасаблівай візітнай карткай беларускіх дзяцей.

За дзесяць наступных гадоў 26 выхаванцаў Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната былі ўсыноўленыя італьянцамі (для параўнання: за ўсю гісторыю інтэрната як сіроцкай установы не было ніводнага выпадку ўсынаўлення беларускімі грамадзянамі). А ў 2004 годзе ў Бягомлі стартаваў унікальны беларуска-італьянскі праект па пасляінтэрнатнай адаптацыі маладых людзей, які атрымаў такую невыпадковую назву — «Пінокіа». І вось тут пачынаецца асобная гісторыя, вартая ўвагі ўжо беларускага грамадства.

ГІСТОРЫЯ АДКАЗНАСЦІ

Ідэя стварэння нейкай прамежкавай прыступкі для выпускнікоў школы-інтэрната ўзнікла ў італьянцаў, як толькі першыя, цяпер ужо зусім не чужыя ім, дзеці сталі выходзіць у дарослае жыццё. Для маладых людзей з Бягомля, якія знаходзяцца пад апекай дзяржавы, існуе два шляхі: пажыццёвае знаходжанне ў доме інвалідаў (для найбольш цяжкіх) і навучанне ў спецыяльных групах ПТВ з атрыманнем абмежаванага набору спецыяльнасцяў.

Спачатку італьянцаў шакіравала перспектыва «псіхушкі». Італія была першай сярод еўрапейскіх краін, хто падпісаў Хельсінскую дэкларацыю 2001 года, якая прадугледжвае закрыццё псіхіятрычных клінік. У гэтай краіне вопыт інтэграцыі псіхічных інвалідаў, у тым ліку даволі цяжкіх, у грамадстве назапашваецца з 1978 года і лічыцца адным з самых паспяховых у свеце. Натуральна, што італьянцы захацелі прапанаваць Беларусі і Бягомлю ў прыватнасці свае ўжо апрабаваныя напрацоўкі. Тым больш што размова ішла пра канкрэтных дзяцей, якіх яны, італьянцы, добра ведалі і любілі.

Але даволі хутка «італьянскія бацькі» нашых дзяцей (дзеці, нават калі вырастаюць, іх так і называюць) зразумелі, што не меншая дапамога патрэбна і тым, хто заканчвае вучылішча. Пра гэта сведчыць і інфармацыя ў СМІ, згодна з якой толькі 5 адсоткаў падлеткаў з ліку сацыяльных сірот інтэгруецца ў сучаснае грамадства, а да традыцыі выпускнікоў сіроцкіх устаноў штогод трапляе на лаву падсудных, становяцца маргіналамі.

Ды і ўласнае расследаванне Бягомльскай школы-інтэрната пацвярджала: 80 адсоткаў выпускнікоў на працягу 4 гадоў пасля заканчэння школы страчвае гарантыі, якія ім дае дзяржава (працу і жыллё), і аказваюцца ў бядотным становішчы. У выпадку з маладымі людзьмі, псіхіка якіх мае асаблівасці, якія адрозніваюцца і знешне, і па сваіх здольнасцях, і па ўспрыняцці навакольнага свету, праблема інтэграцыі ў грамадства стаіць яшчэ больш востра. Італьянцы і самі ўбачылі, што «іхнія» дзеці аказаліся не проста сам-насам са складанымі жыццёвымі абставінамі, якія яны не маглі самастойна выправіць, але яны былі не гатовы распараджацца сваімі грашыма, працаваць, абслугоўваць саміх сябе, наладжваць сацыяльныя стасункі.

Асабліва ўражаныя былі італьянцы, калі знайшлі аднаго са сваіх падапечных у хаціне з... земляной падлогай. Такім было жытло маладога чалавека, і нікога не цікавіла, як такое атрымалася. Нікога, акрамя італьянцаў.

Старшыня асацыяцыі «Кавала бьянка» Гая Карлеці разам з мужам Джавані ў 2003 годзе напісалі праект «Пінокіа — дом мастацтва і рамёстваў для падлеткаў з парушэннем псіхікі», які не адразу ўдалося рэалізаваць. Праект меў на ўвазе стварэнне прамежкавай структуры кшталту сямейнага дома, дзе маладым людзям, якія яшчэ не саспелі для самастойнага жыцця, аказвалася б комплексная дапамога: медыцынская, педагагічная, псіхалагічная і сацыяльная, а таксама — матэрыяльная. Важная роля ў рэабілітацыі дзяцей з парушэннямі псіхікі адводзілася арт-тэрапіі, у якой «Кавала бьянка» мела свае ўласныя распрацоўкі і дасягнула значных поспехаў.

Дарэчы, самі Гая і Джавані ў 90-х гадах усынавілі двух хлопчыкаў-блізнят з Бягомля, якім зараз ужо па 26 гадоў. Акрамя таго, у іх рымскай кватэры разам з імі, дваімі ўсыноўленымі і траімі біялагічнымі дзецьмі, вось ужо пяць гадоў жыве яшчэ адна былая выхаванка школы-інтэрната са сваёй маленькай дачкой.

ГІСТОРЫЯ ЎВАСАБЛЕННЯ

У пошуках фінансавання праекта «Пінокіа» ў 2003 годзе асацыяцыяй была зроблена спроба выйграць грант па лініі праграм TACIS Еўрапейскага саюза, аднак гэта не ўдалося. Тады «Кавала бьянка» стала шукаць спонсараў у Італіі. Справа ў тым, што ў самой добраахвотніцкай асацыяцыі, якая не займаецца камерцыйнай дзейнасцю і толькі аб'ядноўвае маладых людзей з псіхафізічнымі асаблівасцямі і без такіх, сродкаў няма. Усе свае праекты і задумы асацыяцыя ажыццяўляе з дапамогай ахвяравальнікаў.

Шукаць грошы для праекта «Пінокіа» асацыяцыі дапамагала вядомая італьянская актрыса Марыя Грацыя Кучынота, якая лічыцца адной з самых прыгожых жанчын планеты. Нарэшце спонсар быў знойдзены, ім стаў дабрачынны амерыканскі Фонд Pfizer у Рыме, заснаваны адной з найбуйнейшых фармацэўтычных кампаній у свеце.

У ліпені 2004 года быў падпісаны пратакол пагаднення паміж Докшыцкім райвыканкамам, Бягомльскім пасялковым выканкамам, Бягомльскай дапаможнай школай-інтэрнатам, добраахвотніцкай асацыяцыяй «Кавала бьянка», муніцыпалітэтам Рыма, прыходам Св.Станіслава і дырэкцыяй аднаго з аддзелаў адукацыі ў Рыме. Італьянскі бок абавязваўся фінансаваць праект «Пінокіа», распрацоўваць у яго рамках планы мерапрыемстваў і тэрміны іх рэалізацыі, а таксама працаваць ў адпаведнасці з беларускімі законамі. Беларускі бок, у сваю чаргу, абавязваўся садзейнічаць работе італьянскай групы, кантраляваць выкарыстанне рэсурсаў і дакладваць пра вынікі мерапрыемстваў. Копіі падпісанага пратакола былі пакінутыя ў тым ліку ў італьянскім пасольстве ў Беларусі і ў беларускім пасольстве ў Рыме.

У тым жа месяцы Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці ўзгадніў гуманітарны праект Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната і добраахвотніцкай асацыяцыі «Кавала бьянка» (Рым) «Пінокіа — дом мастацтва і рамёстваў для падлеткаў з псіхічнымі адхіленнямі». У «Беларусбанку» быў адкрыты разліковы рахунак для фінансавання праекта. Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь таксама вывучыла пратакол і прызнала яго правамоцным.

Нарэшце, у Бягомлі на грошы Фонда Pfizer быў куплены вялікі драўляны дом для пражывання там маладых людзей — выпускнікоў школы-інтэрната і ўдзельнікаў праекта. У доме быў праведзены рамонт і рэканструкцыя (зроблены санвузел і паравое ацяпленне), закуплены мэбля і ўсё неабходнае для пражывання.

У кастрычніку Докшыцкі райвыканкам выдаў загад, згодна з якім «Дом Пінокіа» ўвайшоў у структуру Бягомльскай школы-інтэрната, знаходзіўся на яе балансе, абслугоўваўся і кантраляваўся яе персаналам. Сам дом і ўсё, што ў ім знаходзіцца, з'яўлялася маёмасцю школы-інтэрната. Заробак персаналу «Дома Пінокіа» выплачваўся з дабрачыннага рахунку праз бухгалтэрыю школы-інтэрната.

Пазней, у студзені 2006 года, Міністэрства адукацыі за подпісам намесніка міністра Казіміра Фарыно ўзгадніла «без заўваг» праект стварэння аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі пры Бягомльскай дапаможнай школе-інтэрнаце. «Лічым, што стварэнне гэтага структурнага падраздзялення адпавядае задачам патранатнага суправаджэння выпускнікоў з інтэлектуальнай недастатковасцю», — сказана ў лісце міністэрства. У статут школы-інтэрната былі ўнесеныя неабходныя дапаўненні, якія тычыліся стварэння структуры, у якой пражывалі і атрымлівалі сацыяльныя, адукацыйныя і медыцынскія паслугі маладыя людзі, якія ўжо скончылі школу.

30 кастрычніка 2004 года ў Бягомлі адбылося афіцыйнае адкрыццё «Дома Пінокіа», пра што ў вялікім рэпартажы на першай паласе паведаміла раённая газета «Родныя вытокі». З беларускага боку ў адкрыцці ўнікальнага праекта ўзялі ўдзел старшыня райвыканкама, начальнік аддзела адукацыі і галоўны спецыяліст ідэалагічнага аддзела, старшыня раённага Савета дэпутатаў, старшыня пасялковага савета і кіраўніцтва школы-інтэрната.

У снежні афіцыйная прэзентацыя праекта адбылася ў Італіі, у адным з залаў Капітолія — рэзідэнцыі муніцыпалітэта горада Рыма. У прэзентацыі браў удзел беларускі пасол у Італіі. Праз пяць месяцаў «Дом Пінокіа» наведаў італьянскі пасол у Беларусі. Пералічваю ўсё гэта, каб ні ў каго не ўзнікла сумненняў ва ўзроўні арганізацыі праекта або захаванні ўсіх неабходных працэдур, як унутрыбеларускіх, так і міжнародных.

Першымі жыхарамі «Дома Пінокіа» сталі маладыя людзі, якія не столькі былі добра знаёмыя італьянцам, колькі апынуліся сапраўды ў складаным сітуацыі. Каця пасля заканчэння ПТВ жыла ў бараку, які не ацяпляўся, яна пакутавала ад холаду і не ведала, як дабіцца лепшых для сябе ўмоў пражывання. Дзяніс пасля вучобы вярнуўся ў замацаванае за ім жыллё, у якім пражывалі ягоныя сваякі. Сваякі яго і выжылі, хлопец апынуўся на сметніку, ён сам звярнуўся ў інтэрнат па дапамогу. Трох юнакоў забралі з дома інвалідаў у Багушэўску...

«Дом Пінокіа» праіснаваў тры з паловай гады. Ён быў закрыты рашэннем райвыканкама летам 2008 года раптоўна і без выразных тлумачэнняў прычын. Для васьмярых маладых людзей, якія на той момант пражывалі ў ім, італьянцы вымушаныя былі тэрмінова купіць іншы дом — невялікі і непрыстасаваны для пражывання ў ім такой колькасці хлопцаў і дзяўчат разам. Пазней італьянцы купілі для нашых дзяцей, няхай і сталых ужо, яшчэ два дамы, якія афармілі ў іх прыватную ўласнасць.

Усяго за гэты час праз праект «Пінокіа» прайшло 15 маладых людзей. І нягледзячы на тое, што ўсімі бакамі праект прызнаецца эфектыўным і патрэбным, сёння яго будучыня неакрэсленая.

P.S. *У ноч на суботу, 27 лістапада, адбылося няшчасце — згарэў адзін з дамоў, у якім пражывалі ўдзельнікі праекта «Пінокіа». Як паведамілі «Звяздзе» ў Докшыцкім раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях, прычына пажару высвятляецца, але вядома, што загарэўся ацяпляльны кацёл. У доме пражывалі чатыры чалавекі, на момант узнікнення пажару ўсе спалі, разбудзіў маладых людзей сабака, які тым самым і выратаваў іх жыцці. Усе рэчы і ўнутраная частка дома згарэлі.*

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
(Працяг будзе.)

АНЁЛ

«Анёл мой, пойдзем разам са мной, ты — наперадзе, а я — за табой» — менавіта так прагаворвае кожны з нас, пакідаючы прастору роднай хаты. Анёлам (з грэч. — вестнік, пасланец, ганец) называлі пасланніка Нябёсаў, які прызначаны ахоўваць людзей ці асобнага чалавека. Яго лічаць пасрэднікам паміж Богам і чалавекам. У народнай культуры анёл уяўляўся маладым, прыгожым юнаком са светлымі доўгімі валасамі, які лётае над зямлёй на белых крылах. Часцей за ўсё ў народных уяўленнях анёл — нябачная істота, якая лунае над чалавекам.

● Паводле народных павер'яў, зоркі — гэта акенцы, праз якія глядзяць на свет белыя анёлы. Колькі людзей на свеце, столькі і анёлаў. У кожнай жывой душы ёсць свой анёл-ахоўнік. Народзіцца чалавек — і новага анёла дасылае Бог берагчы яго ад грахоў, ад ашуканства нячыстай сілы. Зробіць анёл новае акенца, сядзе каля яго і назірае — не адводзіць вачэй ад даверанага яму сына зямлі. А сам кожную справу зямную ў кнігу нябесную запісвае. А людзям падаецца, што гэта ўсё зоры мігцяць! Памёр чалавек — зачыняецца акенца, падае яго зорка з нябёсаў на зямлю.

● У народным асяродку найбольш распаўсюджаным было меркаванне аб тым, што душу ў нованароджанага ўкладае Гасподзь яшчэ ў час унутрывантробнага развіцця, а значыць, ужо на працягу ўсёй цяжарнасці дзіця ахоўвае яго анёл. Не маглі людзі не заўважыць і не адзначыць той момант, калі дзіця пачынала рухацца ў жывоце матулі. З гэтага моманту плод лічыўся адухоўленым, а значыць канчаткова набываў ад Творцы душу, а разам з ёй і анёла-ахоўніка.

● Існавала і такое ўяўленне, што анёл да чалавека прылятае ў дзень яго нараджэння, з яго першым самастойным подыхам, вядзе яго па жыцці і ў момант смерці стаіць пры галаве, каб потым забраць яго душу да Бога на нябёсы.

● Паўсюдна сярод усходніх славян існавала перакананне, што грудное дзіця — бязгрэшны чалавек, а таму — анёл Божы. У беларусаў дзіця, якое не магло яшчэ самастойна рухацца, называлі «анёлак».

● Лічылася, што дзіця «размаўляе» з анёламі да таго часу, пакуль у яго не зарасце радзімец. Пасля гэтага дзіця ўжо не памятае, што яму распавялі анёлы, і пачынае размаўляць з людзьмі.

● Пра чалавека, які трапляў у складаныя жыццёвыя становішчы і выходзіў з іх з гонарам, заставаўся жывым, казалі, што ў яго моцны анёл-ахоўнік.

● Па народных уяўленнях, у кожнага чалавека ёсць свой анёл і свой злы дух. Яны пастаянна спрачаюцца паміж сабой, адзін дапамагае, другі — шкодзіць: анёл ахоўвае ад ліха, а нячысцік схіляе да граху.

● Добры дух, добры анёл знаходзіцца над правым плячом чалавека. Злы дух — над левым плячом. Таму ў абрадах, якія выконвалі ачышчальную функцыю, усе дзеянні неабходна было выконваць на левы бок і праз левае плячо: тройчы плюнуць, каб не сурочылі; выліць гарэлку, якую прапануюць выпіць маладым, калі яны вярталіся ў дом бацькоў пасля вянчання; каб не было сварак у сям'і, праз левае плячо трэба было тройчы перакінуць крыху солі і г.д.

● Нашы продкі лічылі, што ў час сну чалавека «ахоўваюць» анёлы-ахоўнікі: яны гуляюць па хаце і пужаюць нячыстую сілу. Таму ўвечары ў хаце неабходна было абавязкова падмесці падлогу, каб «анёлам было чыста гуляць».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Падатковая выйшла на дарогі

Супрацоўнікі падатковай інспекцыі па Пастаўскім раёне сумесна з праваахоўнымі органамі правялі аператыўныя кантрольныя мерапрыемствы на дарогах рэгіёна. «Улоў» парушальнікаў быў багаты.

Напрыклад, папаўся грамадзянін нашай краіны, які вёз дызельнага паліва ў тры разы больш, чым дазваляецца (па-за бакам можна перавозіць не больш за 100 літраў). Аўтамабільнае паліва коштам больш за 900 тысяч рублёў канфіскавалі. Аналагічнае парушэнне дапусціў і грамадзянін Літвы, які перавозіў дызельнае паліва — 230 літраў на суму амаль што 600 тысяч рублёў.

А пры аглядзе аўто «Нісан», якім кіраваў жыхар Пастаўскага раёна, у салоне знайшлі ажно паўтысячы пачак цыгарэт коштам больш за паўмільёна рублёў. Пачкі былі маркіраваныя акцызнымі маркамі Беларусі, але ж дакументы, якія маглі б пацвердзіць легальнасць набыцця тытунёвых вырабаў, адсутнічалі. Цыгарэты таксама канфіскавалі.

Тым, хто папаўся, пагражаюць немалыя штрафы: да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй тавару — за тытунь і да 100 велічынь — за паліва.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дарагі паэт **Алесь КОРНЕЎ** з Баранавічаў, з 75-годдзем Вас! Да сваіх 14 зборнікаў лірыкі давайце свае новыя творчыя здабыткі! Шчасця, здароўя, моцы і сілаў, толькі светлых і чыстых дзён!
Міхась Маліноўскі.

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 37 (658)
аддзел рэкламы
287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270015 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ А/м «Сітраен-Берлінга» 2001 г.в., 1,4 бензін, сігналізацыя. Мінск. Тэл. 8 029 254 60 14.

❒ А/м «Фальксваген-пасат» В-3, 1,8 монаўпрыск, 1990 г.в., бензін-газ, 2400 у.а., у добрым стане. Тэл. 8 02236 51098.

❒ Дом драўляны, г/п, прысядзібны ўчастак 0,25 га ў в. Рэчань, Любанскі р-н, Мінская вобл. Тэл. 8 01794 46 010.

❒ Дом у Бягомлі, г/п, вада, паравое ацяпленне, лазня, 6 сотак, на ўскрайку сасновага лесу. Тэл. 8 033 317 39 26.

❒ Аўташыны б/к «Матадор» 175/70 R13, зімовыя, 4 штукі. Тэл. 8 029 873 47 07, Мінск.

❒ Трусы пароды бельгійскі велікан (Фландр), каліфарнійская. Тэл. 8 029 357 64 51.

❒ Газ. пліта «Гефест», новая, 50х57 см, з грылем, 790 тыс. руб. Тэл.: 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ Калёсы на гумавым ходзе, упраж, сена. Тэл. 8 01771 44 356.

❒ Электрарухавік 3 кВт, 1500 аб/хвіліну. Тэл. 8 01591 34380.

❒ Каляска інвалідная з электрапрывадам. Тэл.: 8 01777 45923, 8 029 950 81 36.

❒ Новы пчолапавільён. Тэл. 8 029 66 99 845.

КУПЛЮ

❒ Трактар МТЗ-82, з дакументамі, можна з пагрузчыкам ці экскаватарам. Тэл. 8 044 473 68 90.

❒ Фундаментныя блокі і пліты перакрыцця новыя ці б/к. Тэл. 8 029 357 64 51.

❒ Гідрапрывад да трактара Т-40 у зборы. Тэл. 8 01591 34 380.

❒ 2 балы латарэі «Пяцёрачка». Тэл. 8 01772 40 228.

РОЗНАЕ

❒ Брыгада выканае ўсе будаўнічыя, аддзелачныя работы хутка і якасна. Тэл.: 8 029 984 63 69. УНП 590747743.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО НТК «АЛЕСЯ»

№ лота	Наименование объекта/ Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Изолированное помещение (кафетерий ресторана «Хрустальный»)** (инв. № 350/D-168139) общей площадью 52,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 87а. Условия продажи: под объект розничной торговли по продаже непродовольственных товаров, оказание услуг, офис	138 664 000	7 000 000
2	**Приемный пункт стеклотары** (инв. № 350/C-77031) общей площадью 183 кв.м. Адрес объекта продажи: г. Гомель, ул. Свердлова, 3 «а». Цель использования – любой вид деятельности, кроме торговли продовольственными товарами и организации общественного питания.	139 015 000	7 000 000
3	**Капитальное строение, состоящее из здания магазина** (инв. № 350/C-63054) – площадь строения 52,4 кв.м. Площадь земельного участка 0,0061 га. Адрес объекта продажи: г. Гомель, ул. Комисарова, 22-24. Цель использования – любой вид деятельности.	99 300 000	7 000 000
4	**Объект, состоящий из здания магазина, 3-х сараев и оборудования** (инв. № 310/C-6103) – площадь строения 88,6 кв.м. Площадь земельного участка – 0,0550 га. Адрес объекта продажи: г. Гомель, 2-ой пер. Полевой, 20. Цель использования – торговля продовольственными товарами.	121 762 000	7 000 000

Продавец имущества: ОАО НТК «Алеся». Шаг торгов – 5 %. Цены указаны с НДС. Вознаграждение – 5 % от цены продажи лота.
Срок заключения договора купли-продажи – 10 календарных дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона. Более подробная информация об условиях участия в аукционе, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 133 от 10.07.2010 г. и № 203 от 16.10.10 г.

Срок подачи заявления	**До 17.00 7 декабря 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**8 декабря 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел.: 8 (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс), www.bti.by

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць эл. чайнік, кухонную ЭЛ-машыну, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 студзеня 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 22 студзеня 2011 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 сакавіка 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 31 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 11.11.10 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 13.11.10 па 31.03.11.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1794 ад 03.11.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на I кв. або I-е паўг. 2011 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»
на 2011 год па месяцах

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды (прозвішча, ініцыялы) _____
(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды (прозвішча, ініцыялы) _____
(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5817. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ЗВЯЗДА 30 лістапада 2010 г.

ААТ «Цеплапрыбор» (горад Бяроза)

«РЭАНІМАВАЦЬ НЕЛЬГА»...

Увельмі заўважным месцы ў горадзе Бяроза, па сутнасці ў цэнтры горада, размясцілася прадпрыемства «Цеплапрыбор». Але яшчэ не так даўно не вельмі заўважнай была яго дзейнасць...

Чатыры гады таму ўвогуле ставілася пытанне наконт мэтазгоднасці яго далейшага існавання. Новаму, толькі што прызначанаму сюды дырэктару Уладзіміру Гогану так і сказалі: «Рэанімаваць нельга», на што ён у адказ папрасіў два гады тэрміну. «Ну як можна было вось так ставіць перада мной такое пытанне? Толькі што прызначылі дырэктарам — і раптам, літаральна праз 10 дзён, аб'яўляй прадпрыемства, а па сутнасці, — самога ж сябе, банкрутам», — абураецца ён і цяпер.

— А рэанімавалі ж, — працягваў Уладзімір Гоган. — І, увогуле, няздрэнна цяпер выглядаем. Нават на фоне самых паспяховых прадпрыемстваў, што размешчаны ў Бярозе, ды і ў іншых гарадах вобласці. І гэта датычыцца не толькі прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці, да якой мы адносімся...

Уладзімір Антонавіч Гоган пасля заканчэння ранейшага Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі (цяпер — БАТУ) два гады працаваў у адной з гаспадарак Бярозаўскага раёна галоўным інжынерам, пасля гэтага — галоўным інжынерам райсельгастэхнікі, яе кіраўніком, начальнікам раённай дзяржтэхінспекцыі. Узначаліў бярозаўскае прадпрыемства «Цеплапрыбор» у сакавіку 2006 года.

Каб лепш уявіць тое, што ўяўляе сабой бярозаўскі «Цеплапрыбор» сёння, прыгадаем больш вядомае ў рэспубліцы прадпрыемства «Белкамунмаш» і знакамітыя мінскія тралейбусы, што сыходзяць з яго канвеера. А справа ў тым, што гэтыя тралейбусы ў немалой ступені з'яўляюцца і бярозаўскімі. У прыватнасці, іх каркасы, «касцяк», на якім і мацуюцца ўся абліцоўка, усе вузлы і элементы, агрэгаты, пераважна — на 80 працэнтаў — менавіта бярозаўскія. Мы пабывалі ў цэху, у якім, па сутнасці, і нараджаецца беларускі тралейбус. На трох спецыяльных стапелях сталі ўжо амаль гатовыя да адпраўкі каркасы будучага тралейбуса, а каля іх яшчэ завіхаліся рабочыя: зіхацелі агні электразваркі (у каркасы ўварваліся апошнія «шкілетныя» элементы), вырываліся снапы іскраў з-пад шліфавальных машынак (зачышчаліся зварныя швы).

— Каб зварыць той жа каркас тралейбуса, трэба зрабіць адзін кіламетр такіх швоў, злучыць паміж сабой ва ўсёй канструкцыі кузава каля 600 розных элементаў, — расказалі нам на заводзе. А яшчэ тут падкрэслівалі: пры ўсім гэтым дакладнасць зборкі каркаса павінна быць «ад і да» або з адхіленнямі не болей за 1 міліметр (калі болей — гэта ўжо брак). Чаму такая дакладнасць? А як потым навешваць на каркас усё астатняе начынне? Дакладна выкананы каркас — дакладнай будзе ўся далейшая зборка тралейбуса непасрэдна на самім «Белкамунмашы», і гэта добра зразумела. Як прызналіся на «Белкамунмашы» аднаму са спецыялістаў бярозаўскага прадпрыемства, менавіта з бярозаўскімі камплектамі каркасаў і самімі каркасамі працаваць намнога лягчэй, чым са сваімі ўласнымі.

* * *

Галоўнай задачай новага кіраўніка, калі ён прыйшоў на «Цеплапрыбор», было знайсці новую, прычым пастаянна запатрабаваную, прадукцыю, новыя заказы. А становішча прадпрыемства на той час было проста катастрафічным. Напэўна, пра многае будуць сведчыць такія факты: сярэднямесячная заработная плата складала па заводзе 345 тысяч рублёў, а ў дырэктарскім кабінеце прама на дырэктарскі стол шчодра капала са столі. Так званыя атмасферныя ападкі. Палівала праз столь (гэта значыць — праз дзіравы дах) і ў іншых кабінетах, у вытворчых памяшканнях... Прадпрыемства было закрэдытаванае; прадукцыя, якая выпускалася, слаба разыходзілася; вытворчая дзейнасць была крайне нерытмічнай.

Што зрабіў новы кіраўнік у першую чаргу, калі прыйшоў сюды? Зразумела, спачатку не да таго было, каб рамантаваць дзіравы дах ды тынкаваць чорную столь — на першым часе сталі шукаць новыя (а галоўнае — пастаянныя), заказы, шукаць новых партнёраў. У выніку і выйшлі бярозаўцы на «Белкамунмаш». І, атрымаўшы ад яго адну, «голую», дакументацыю (пра адпаведную аснастку і абсталяванне трэба было паклапаціцца самім), ужо першы свой канструкцыйны выраб (а спачатку гэта была аснова, або ніжняя частка каркаса тралейбуса; потым былі бакавіны, «дах» і, нарэшце, — поўнасцю сам каркас) выканалі на выдатна. Як падкрэсліваюць на «Цеплапрыборы», за ўвесь час супрацоўніцтва з «Белкамунмашам» тут вырабілі для яго больш за тысячу поўных камплектаў каркасаў, а непасрэдна самі каркасаў — каля 250. А гэта значыць, больш за 1250 мінскіх тралейбусаў бегаюць цяпер па вуліцах сталіцы і іншых гарадоў дзякуючы і намаганням працаўнікоў бярозаўскага прадпрыемства.

І надзейна бегаюць. Спецыялісты бярозаўскага прадпрыемства падкрэсліваюць: трываласць усёй канструкцыі каркаса — гэта галоўная гарантыя будучай бяспекі пасажыраў. Тут па ўсім тэхналагічным ланцужку вырабу каркасаў наладзілі строгі кантроль як з боку АТК, так і з боку майстроў, тэхнолагаў. Ужо на самым пачатку, калі прыступілі да вырабу каркасаў, замянілі звычайную электразварку, з выкарыстаннем у ёй традыцыйных электродаў, на паўаўтаматычную, значна больш якасную. Каля 50 працэнтаў усіх цяперашніх аб'ёмаў прадпрыемства сталі складаць менавіта заказы «Белкамунмаша». Пры гэтым, акрамя каркасаў цяперашняга серыйнага тралейбуса, асвоілі ў Бярозе і перспектыўныя распрацоўкі «Белкамунмаша» і гатовыя распачаць выпуск адпаведных канструкцый у любы час.

Праўда, сёлета «Белкамунмаш» у першым паўгоддзі яўна падвёў бярозаўцаў, таму што істотна прытармазіў свой зборачны канвеер. Тым не менш, у Бярозе страчаныя аб'ёмы кампенсавалі за кошт іншых відаў прадукцыі і ўрэшце набылі тую ж станоўчую дынаміку, якой прадпрыемства вызначаецца на працягу апошніх гадоў.

■ За апошнія 4 гады вытворчасць прадукцыі на бярозаўскім «Цеплапрыборы» ўзрасла больш чым у 3 разы;

на 300 працэнтаў павысілася заработная плата;

больш за 60 працэнтаў у аб'ёмах прадпрыемства склалі новыя віды прадукцыі.

■ Чатыры гады таму гадавы аб'ём вытворчасці складаў на «Цеплапрыборы» каля 6 мільярдаў рублёў, цяпер такі аб'ём тут выконваюць практычна за квартал.

■ Пры ранейшых месячных аб'ёмах прадукцыі на суму каля 350 мільёнаў рублёў на прадпрыемстве плацілі 30—32 мільёны за электраэнергію (каля 10 працэнтаў ва ўсім кошце), цяпер прадукцыі выпускаецца больш чым на паўтара мільярда — плата за электраэнергію складае 55—60 мільёнаў (каля 3 працэнтаў).

■ Некалькі гадоў таму на прадпрыемстве працавалі каля 240 чалавек — цяпер працуюць больш за 300.

Дырэктар прадпрыемства «Цеплапрыбор» Уладзімір ГОГАН.

Вытворчы момант.

На ўчастку зборкі каркасаў тралейбусаў: галоўны інжынер Мікалай БЯЛЕЦКІ і старшы майстар Аляксандр АНТОНЧЫК.

— Добра, калі прыходзіш на працу і дакладна ведаеш, што ў цябе ёсць гэтая праца, ведаеш, што канкрэтна трэба табе рабіць, — казаў падчас гутаркі дырэктар «Цеплапрыбора». — А ў нас цяпер, па сутнасці, заўсёды ёсць што рабіць, мы цяпер маем на сваім прадпрыемстве вельмі неблагі асартыментны набор.

На бярозаўскім прадпрыемстве, акрамя кузаваў тралейбусаў, выпускаюцца таксама ацяпляльна-вадагрэйныя катлы, прызначаныя для цеплазабеспячэння адносна невялікіх памяшканняў (да 800 квадратных метраў), бытавыя масленыя электрарадыятары («За імі практычна заўсёды чарга», — зазначалі на прадпрыемстве), вентылятары розных тыпаў, кормазмешвальнікі-раздатчыкі, камплектуючыя для вырабу так званых норый, якія прымяняюцца на збожжасушыльных комплексах, і іншыя віды прадукцыі. Нямала заказаў выконваюць на прадпрыемстве па артыкуле «Нестандартызаванае абсталяванне» — гэта ў асноўным заказы арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пры гэтым працаўнікі прадпрыемства асабліва ганарацца сваім абсталяваннем, выкананым для 7 стадыёнаў вобласці. Варта асобна спыніцца на дзіцячых пляцоўках, асвоеных тут апошнім часам. Яны ўяўляюць сабой зварныя канструкцыі, накрытыя полікарбанатным дахам, з элементамі горкі, з арэлямі, лесвіцай, кольцамі і г.д. Аналагічную дзіцячую пляцоўку заводскія спецыялісты «падгледзелі» ў іншым месцы, і ўжо стаяць такія пляцоўкі ў самой Бярозе, у Белаазёрску.

Але попыт на іх, у адрозненне ад попыту на тыя ж электрарадыятары, зусім не напружаны. Відавочна, далёка не ўсе адпаведныя службы гэтак жа заклапочаныя арганізацыяй вольнага часу дзяцей на дваравых тэрыторыях, як заклапочаны гэтым начальнік тэхнічнага аддзела прадпрыемства Валерый Пунько, які і прапанаваў адпаведную ідэю.

* * *

— Вы ведаеце, колькі пылу выходзіць са збожжа падчас яго ачысткі і сушкі? З 250—300 тон збожжа 7—8 тон пылу. Хто гэты пыл збірае, дзе ён асядае?

З такімі словамі прадстаўлялі на «Цеплапрыборы» яшчэ адзін нядаўна асвоены тут выраб, які пры гэтым павінен стаць вельмі перспектыўным, або абсталяванне для ачысткі паветра, якое ўключае ў сябе так званы пылаасаднік цэнтрабежны, цыклон (у ім пыл, раслінныя рэшткі асаджваюцца), 27-кубовы бункер для збору пылу і смецця, паветраправоды. Гэты спецыяльны агрэгат, магутнасцю 75 кілават (дарэчы, гэта — магутнасць ранейшага трактара «Беларус»), працуе ў адзіным комплексе з вентылятарам. Зразумела, ён і прызначаны для таго, каб улоўліваць увесь пыл, што ўтвараецца падчас збожжаачысткі. Агрэгат можа прапускаць праз сябе да 125 тысяч кубаметраў забруджанага паветра за гадзіну з ціскам 1800 паскаляў, ступень ачысткі паветра — на 95—98 працэнтаў. Такіх «пыласосаў» нідзе ў Беларусі ды і ўвогуле ў краінах СНД, не выпускалі. Выпадкова «падгледзеў» яго дырэктар у адной з гаспадарак рэспублікі, якая купіла яго за мяжой.

Пакуль што тры пылаасаднікі выраблі на прадпрыемстве, якія цяпер праходзяць абкатку непасрэдна ў гаспадарках краіны.

На прадпрыемстве падкрэсліваюць: патрабаванні Міністэрства сельскай гаспадаркі па зніжэнні запыленасці ў збожжасушыльных комплексах з кожным годам становяцца больш жорсткімі, і ў бліжэйшы час, калі іх не абсталююць устройствамі для ўлоўлівання пылу, такія комплексы будуць забароненыя да эксплуатацыі. «Нашы пылапаглынальнікі значна павышаюць супрацьпажарную бяспеку; гэта таксама зусім іншыя ўмовы працы, экалогія. Пры гэтым пэўныя іх мадыфікацыі можна паспяхова прымяняць не толькі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, але і на прадпрыемствах дрэваапрацоўкі, на камбінатах будаўнічых матэрыялаў, на цэментных заводах і ў іншых галінах вытворчасці».

* * *

На час наведвання намі бярозаўскага прадпрыемства на ім праводзілася «планавае мерапрыемства». Менавіта так назваў высадку на ім немалога дэсанту спецыялістаў з іншых прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у сістэму абласной мясцовай прамысловасці, намеснік кіраўніка абласнога ўпраўлення мясцовай прамысловасці Уладзімір Дымар. Дакладней — гэта быў выязны дзень якасці. Аднак, напэўна, невыпадкова месцам правядзення гэтага дня выбралі менавіта бярозаўскі «Цеплапрыбор»?

— Вядома ж, не, — адказаў на гэта пытанне Уладзімір Дымар. — Прадпрыемства выпускае даволі складаную прадукцыю, аднак за апошнія гады не мела ніводнай сур'ёзнай рэкламацыі. Словам, яму ў сябе ёсць што паказаць, ёсць тут чаму павучыцца...

Безумоўна. Ужо гаварылася, які сур'ёзны кантроль праходзяць тут падчас зваркі каркасы тралейбусаў, дададзім: зварныя швы праходзяць таксама выпрабаванні на разрыў. Адпаведную скіравanасць прадпрыемства добра адлюстроўвае наступны слоган, прыняты тут на ўзбраенне: «Стаўка на развіццё і якасць». Для прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці пакуль што ў навіну атэстацыя вытворчасці на адпаведнасць дзеючай на іх сістэмы якасці міжнародным стандартам ICO 9001 — на бярозаўскім «Цеплапрыборы» экзамен на гэтую адпаведнасць павінны трымаць у бягучым месяцы. І можна меркаваць, гэты экзамен будзе здадзены паспяхова. Не так даўно тут створаны новы аддзел — стандартызацыі, сертыфікацыі і метралогіі, дзейнасць якога надала большую сістэмнасць ва ўсёй рабоце па пытаннях якасці. На прадпрыемстве дзейнічае спецыяльная камісія, якая сочыць за культурай вытворчасці...

— Увогуле, з навядзення належнага парадку і трэба пачынаць. Мы паціху выкараняем ранейшую, не зусім прыемную спадчыну, што дасталася цяперашняму калектыву, і ўжо цяпер многія вытворчыя памяшканні, кабінеты не пазнаць. Увогуле, калі навокал чыстата, парадак — і людзі зусім паіншаму адносяцца да сваіх працоўных абавязкаў, — казаў дырэктар.

— Ну вось як было раней: дзе курыць — там і акурак пад ногі кінуў, цяпер жа — ні ў якім разе...

— А калі ўсё-такі кінуў?

— Значыць, каля 50 тысяч рублёў з заработнай платы — далоў. За гэтыя грошы цэлы месяц можна курыць, і неблагія цыгарэты.

— А вось на вуліцах нашых гарадоў, як правіла, дзе курыць, там і кідаюць...

— А хто пакараў?..

Адносна слабым звяном ва ўсіх пытаннях, звязаных з якасцю і культурай вытворчасці, кіраўнік прадпрыемства называе пагрузку-разгрузку вырабаў, якія нярэдка выконваюцца крайне неакуратна, увогуле неахайна. Прынамсі — гэта ў іншых, што часам даводзіцца бачыць бярозаўскаму кіраўніку («А мы ж на тых вырабах з дакладнасцю да міліметра ўсё падганяем»), бо на самім «Цеплапрыборы» працэсы пагрузкі-разгрузкі нават кантралююцца спецыялістамі службы маркетынгу.

* * *

Сярод партнёраў бярозаўскага прадпрыемства, заказчыкаў яго прадукцыі — «Амкадор-Можа», «Лідасельмаш», «Брэстсельмаш», Казіміраўскі эксперыментальны завод (на Магілёўшчыне) і іншыя прадпрыемствы, якія выпускаюць збожжасушыльныя комплексы і выкарыстоўваюць пры гэтым бярозаўскія вентылятары. Аднак сутнасць тут не ў гэтым. У свой час практычна ўсе гэтыя прадпрыемствы купілі вентылятары за мяжой. Так было да прыходу на «Цеплапрыбор» цяперашняга кіраўніка, які ўжо адразу паставіў задачу — выціснуць з гэтага сегмента рынку канкурэнтаў. І ў рэшце рэшт выціснулі (добрая навука для тых, хто шукае для сваіх прадпрыемстваў заказы, магчымасць зарабіць). А пры ўсім гэтым, як расказалі на «Цеплапрыборы», калі «распраўляліся» з канкурэнтамі, «пакаралі» і саміх сябе. Так, шэраг маскоўскіх фірмаў купляў на «Цеплапрыборы» камплектуючыя для сваіх вентылятараў, далучаў да гэтых камплектуючых свае электрарухавікі, а потым адпраўляў ужо поўнасцю гатовыя вентылятары ў Беларусь, у прыватнасці на «Амкадор-Можа». Зразумела, калі на «Амкадоры» адмовіліся ад вентылятараў з адзнакай «Зроблена ў Расіі», але з «беларускім начынненм», расійскія вытворцы адмовіліся ад бярозаўскіх камплектуючых. Вось такім чынам на бярозаўскім прадпрыемстве свой экспарт страцілі.

* * *

Галоўны інжынер бярозаўскага прадпрыемства «Цеплапрыбор» Мікалай Бялецкі назваў найбольш важкія тэхнічныя набыткі, якія з'явіліся тут за апошнія гады. Гэта — установўка плазменнай рэзкі металу («яна вельмі дапамагае быць на плыву»), металагібачны агрэгат, ленточнапільныя станкі, вальцавы чатырохвалковы станок, установўка для балансіроўкі колаў вентылятараў («дакладнасць у шмат разоў вышэйшая, чым на балансіроўцы колаў аўтамабіляў»). «Калі на прадпрыемстве не забываюць пра яго належнае тэхнічнае аснашэнне — яно жыве, развіваецца», — падкрэсліваў галоўны інжынер.

Безумоўна. Прычым у перспектыве тут і набыццё больш дакладнай і больш прадукцыйнай установўкі па лазернай рэзцы металу, спецыяльнага штамповачнага комплексу, з выкарыстаннем якога ў калектыву з'явіцца новыя магчымасці па пашырэнні свайго асартыменту і павышэнні якасці прадукцыі. Застаецца пацвердзіць гэтую безумоўную выснову словамі аднаго са спецыялістаў «Белкамунмаша»: «Не выключана, што ўжо хутка мы будзем заказваць у Бярозе зваранны пафарбаваны каркас з вонкавай абшыўкай».

Відавочна, з неблагім прыцэлам плануюць у Бярозе далейшае перааснашчэнне.

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Адзін з новых цікавых вырабаў прадпрыемства — дзіцячая пляцоўка. Такія пляцоўкі ўжо стаяць у горадзе Бяроза, Белаазёрску. І іх наяўнасць была б вельмі пажаданай на многіх іншых дваравых тэрыторыях, у дзіцячых садках.

УНП 200023205.

Прыгажосць

PRET-A-PORTER I FASION DESIGN — «МОДНЫ СІЛУЭТ» У СТАЛІЦЫ

Упершыню ў Мінску 27 лістапада прайшоў рэспубліканскі конкурс мадэльераў і дызайнераў «Модны сілуэт», удзельнікамі якога сталі прыёры рэгіянальных адборачных тураў — а гэта дваццаць адна калекцыя ў дзвюх намінацыях — Pret-a-porter i Fasion design. Тэму калекцыі адзення ўдзельнікі вызначалі самастойна. Лепшай у намінацыі Pret-a-porter стала калекцыя брэсцкага дызайнера Кацярыны Міхноўскай «Маленькае кантры», а калекцыя «Дотык» Таццяны Еўланавай з Віцебска перамагла ў намінацыі Fasion design.

Паводле слоў старшыні журы конкурсу «Модны сілуэт», мадэльера, дырэктара атэлье «Андарак» Веры Пашкоўскай, правядзенне конкурсу планавалася адзін раз у два гады, але «моду нельга дыктаваць праз год», таму хутка мадэльеры і дызайнеры зноў пачнуць рыхтавацца да наступнага конкурсу і да новага моднага сезона.

Арганізатарамі правядзення конкурсу сталі Міністэрства гандлю РБ, ДА «Белбыт», Рэспубліканскі камітэт беларускага прафсаюза работнікаў мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавых прадпрыемстваў, а таксама ўпраўленні бытавога абслугоўвання насельніцтва абласцей і Мінска.

Марына БЕГУНКОВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насустрач Чарнобылю

Местное самоуправление · Свая справа · Жыр-андоля · Чырвоная змена · Купі лепшае! Тавары Паслугі Цэны · Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	12 400 рублёў на месяц 74 400 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	11 600 рублёў на месяц 69 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	19 900 рублёў на месяц 119 400 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	18 000 рублёў на месяц 108 000 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	9 700—11 180 рублёў на месяц 58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8 940—10 430 рублёў на месяц 53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13 134—14 080 рублёў на месяц 78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12 230—13 170 рублёў на месяц 73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе

* Залежыць ад рэгіёна

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.03	15.53	7.50
Віцебск —	7.59	15.36	7.37
Магілёў —	7.53	15.43	7.50
Гомель —	7.42	15.48	8.06
Гродна —	8.17	16.09	7.52
Брэст —	8.10	16.17	8.07

Месяц

Апошняя квадра 28 лістапада. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Лазара, Міхаіла, Нікана, Рыгора, Сяргея.*

К. *Канстанцыі, Маўры, Юстыны, Андрэя, Канстанціна, Людаслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра